К. У. СКУРАТ

ДАЎНІЯ БЕЛАРУСКІЯ МЕРЫ

АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСКАЙ ССР
ІНСТЫТУТ МОВАЗНАЎСТВА ІМЯ ЯКУБА КОЛАСА

К. У. СКУРАТ

ДАЎНІЯ БЕЛАРУСКІЯ МЕРЫ

(лексічны аналіз)

Выдавецтва «Навука і тэхніка»
Мінск 1974

4 Бел
С 46

Рэдактары:
доктар філалагічных навук праф. М. А. Жыдовіч,
доктар філалагічных навук праф. А. І. Жураўскі

Рэцэнзенты:
кандыдат філалагічных навук В. А. Бекіш,
кандыдат філалагічных навук І. І. Крамко

Скурат К. У.

С46 Даўнія беларускія меры (лексічны аналіз). Мн., «Навука і тэхніка», 1974.
192 с. (АН БССР. Ін-т мовазнаўства імя Якуба Коласа)

У кнізе на вялікім фактычным матэрыяле з помнікаў старабеларускага пісьменства даследуецца прадметна-тэматычная група лексікі — словы са значэннем адзінак вымярэння даўжыні і плошчы, сыпкіх і вадкіх рэчываў, вагі. Аналізуюцца таксама найменні адзінак колькасці і ліку, якія служылі для вызначэння колькасці тавару (рэчыва). — Літ. у падрадк. заўвагах.

4 Бел

С $\frac{0711\text{-}030}{М316\text{-}74}$ 61-74

© Выдавецтва «Навука і тэхніка», 1974.

УСТУП

Назвы адзінак меры, вагі і колькасці складаюць даволі значную групу лексікі старабеларускай мовы, і вывучэнне іх мае вялікую навуковую і практычную цікавасць. Гэта цікавасць вызначаецца своеасаблівым месцам мер у гісторыі народа, у сацыяльна-эканамічным развіцці грамадства. Развіццё метрычных адзінак цесна звязана з гісторыяй развіцця прадукцыйных сіл і матэрыяльнай культуры на працягу многіх стагоддзяў і пачалося ў глыбокай старажытнасці, бо ўжо ў той час у чалавека ўзнікла патрэба рабіць вымярэнні, няхай сабе і прымітыўныя. Першымі меркамі чалавека былі часткі яго цела або адлегласць паміж імі: локаць, ступня, пядзя, крок, сажань. Адпаведныя назвы атрымалі і метрычныя адзінкі. Рост прадукцыйных сіл патрабаваў удасканалення як саміх мер, так і спосабаў вымярэння. Гэта ўдасканаленне асабліва ажывілася ў перыяд таварнага абмену і гандлёвых зносін паміж дзяржавамі. Эканамічная сувязь паміж народамі і дзяржавамі абумоўлівала ўзаемны абмен метрычнымі адзінкамі, напластаванне розных сістэм.

Вывучэннем метрычных аспектаў старажытных мер і вагі займаецца спецыяльная

дысцыпліна — гістарычная метралогія. Беларуская гістарычная метралогія пакуль што распрацавана слаба. Пэўныя здабыткі яна набыла ў дакастрычніцкі час, калі ў працах па гісторыі Вялікага княства Літоўскага з'явіліся асобныя раздзелы пра сістэму мер і вагі гэтай дзяржавы [1]. Аўтары гэтых прац асноўную ўвагу звярталі на сістэму мер і вагі, зацверджаную пастановай сейма 1766 г. Некаторыя старыя меры і іх колькасныя эквіваленты можна знайсці ў слоўніках І. Насовіча, М. Гарбачэўскага, а таксама ў працах Ф. Петрушэўскага, М. Любаўскага, М. Доўнар-Запольскага, савецкіх даследчыкаў Дз. Пахілевіча, А. Грыцкевіча і інш. Аднак беларуская гістарычная метралогія патрабуе далейшай, больш поўнай навуковай распрацоўкі, бо без ведання мер і вагі нельга рашыць некаторых пытанняў гісторыі, у прыватнасці гандлю і гандлёвых зносін. Асаблівай увагі патрабуюць меры XV—XVII стст., бо ў гэты перыяд яны былі найбольш разнастайныя як у назвах, так і колькаснымі эквівалентамі.

У працэсе даследавання назваў даўніх беларускіх метрычных адзінак былі выкарыстаны працы з гістарычнай метралогіі суседніх славянскіх народаў. Так, даўнія рускія меры аналізавалі Н. Бяляеў, Б. Балсуноўскі, П. Буткоў, І. Каўфман, Дз. Празароўскі,

[1] O Litewskich i Polskich prawach, o ich duchu, źródlach, związku i rzechach zawartych w pierwszem Statucie dla Litwy 1529 Roku wydanem przez Tadeusza Czackiego, t. 1. W Warszawie, 1800 roku; Древняя метрология. У кн.: С. Гольдштейн. Польско-литовские древности. СПб., 1913.

Б. Рыбакоў, Я. Дзепман, украінскія — А. Лабко, І. Ерафееў, Я. Ісаевіч, К. Саханевіч, у лінгвістычным плане — В. Віннік, польскія — Ф. Штам, А. Гілевіч, К. Саханевіч, чэшскія — А. Седлачак. Назіранні гэтых даследчыкаў дапамагаюць зразумець утварэнне і развіццё семантыкі старабеларускіх метрычных адзінак, бо ў суседніх славянскіх народаў было параўнальна многа аднолькавых мер, а некаторыя з іх утварыліся ў агульнаславянскі перыяд.

Асобныя беларускія меры аналізаваліся ўжо ў лінгвістычным плане. З. Даўнене ў артыкуле «Назвы адзінак вымярэння ў старабеларускай мове»[2], тэзісах даклада «З гісторыі лексікі, якая абазначала адзінкі вымярэння ў гандлі»[3] аналізуе ўтварэнне і семантычнае развіццё слоў, якія ўжываліся як адзінкі вымярэння і вагі ў гандлёвай практыцы. У гэтых працах аднак не разглядаецца ўся сістэма адзінак, што, натуральна, не дазваляе аўтару зрабіць вывад пра агульны характар утварэння і семантычнага развіцця гэтай групы лексікі. Сістэму мер і вагі старабеларускай мовы аналізавалі ў асобных артыкулах А. Юрэвіч і А. Яновіч[4], аднак па-за іх увагай засталася

---

[2] Уч. записки высших учебных заведений ЛитССР, т. 11. Языкознание, 1965, стар. 49—75.

[3] Программа и тезисы межреспубликанской конференции по изучению лексики старобелорусских письменных памятников XV—XVII вв. Вильнюс, 1964, стар. 15—16.

[4] Е. К. Юревич, Е. И. Янович. Из истории метрологической лексики.— Вопросы этнографии Белоруссии. Минск, 1964, стар. 68—79; А. К. Юрэвіч, А. І. Яновіч. Старажытныя беларускія меры.— Беларускае і славянскае мовазнаўства. Мінск, 1972, стар. 286—303.

значная група метрычнай лексікі — адзінкі колькасці і лічэння. Таму словы з метрычным значэннем патрабуюць поўнага і сістэмнага аналізу.

Метрычная лексіка з'яўляецца адной з найбольш старажытных. Сістэма мер фарміравалася на працягу многіх стагоддзяў, таму метрычныя адзінкі маюць у сваім складзе лексіку, што ўзнікла і ўвайшла ў актыўны ўжытак у розныя гістарычныя перыяды. Гэта дае магчымасць прасачыць спосабы яе ўтварэння і змены семантыкі, выявіць агульную заканамернасць і адметнасць яе ўтварэння. У XV—XVII стст. на Беларусі побач з агульнадзяржаўнымі існавалі і мясцовыя меры і сістэмы мер, што звязана з асаблівасцю сацыяльна-эканамічнага жыцця (феадальнае землекарыстанне, самастойнасць гарадоў і інш.). Мясцовыя меры і сістэмы мер узаемадзейнічалі паміж сабой і з тымі мерамі, якія ўжываліся як агульнадзяржаўныя. Даследуючы такое ўзаемадзеянне, можна ў некаторай ступені ўстанавіць узаемадзеянне літаратурнай і дыялектнай мовы старажытнай пары, пранікненне народных мер у дзяржаўную метрычную сістэму.

Лексіка з метрычным значэннем даволі шырока прадстаўлена ў помніках.

Крыніцамі лексічнага матэрыялу для аналізу назваў адзінак вымярэння, вагі і колькасці паслужылі апублікаваныя помнікі старабеларускага пісьменства і ў невялікім аб'ёме— рукапісныя крыніцы з фондаў Дзяржаўнага музея Беларускай ССР. Абсалютная большасць помнікаў у стылістычных адносінах

можа быць аднесена да канцылярска-дзелавых дакументаў, якія «ў параўнанні з помнікамі іншых жанраў... намнога паўней адлюстравалі рысы жывой гаворкі сваёй эпохі»[5].

Кампазіцыя кнігі адпавядае традыцыйнаму падзелу мер на адзінкі вымярэння даўжыні і плошчы, сыпкіх і вадкіх рэчываў, адзінкі вагі, колькасці і лічэння. Кожнай групе метрычных адзінак прысвечаны асобны раздзел, а ў раздзеле «Словы са значэннем адзінак колькасці» дадаткова вылучаюцца невялікія групы слоў у залежнасці ад іх ужывання як метрычных адзінак таго ці іншага рэчыва. Унутры раздзелаў лексіка размяркоўваецца паводле першапачатковага значэння (для адзінства тэрміналогіі ў асобных выпадках першапачатковым значэннем лічыцца тое, якое папярэднічала метрычнаму), а таксама на падставе прычын утварэння таго ці іншага слова.

---

[5] Л. М. Шакун. Помнікі дзелавой пісьменнасці як крыніцы гісторыі беларускай літаратурнай мовы.— Лексікалогія і граматыка. Мінск, 1959, стар. 200.

НАЗВЫ АДЗІНАК ВЫМЯРЭННЯ ДАЎЖЫНІ І ПЛОШЧЫ

СЛОВЫ СА ЗНАЧЭННЕМ АДЗІНАК ВЫМЯРЭННЯ ДАЎЖЫНІ І ПЛОШЧЫ АНТРАПАМЕТРЫЧНАГА ПАХОДЖАННЯ

Меры антрапаметрычнага паходжання даследчыкі лічаць аднымі з найбольш старажытных, бо, як ужо адзначалася, першымі меркамі чалавека былі часткі яго цела або адлегласць паміж імі. Паколькі часткі цела чалавека мелі пэўную даўжыню, то і за мерамі, якія адпавядалі гэтым часткам, замацаваліся адпаведныя назвы. У старабеларускай мове ўжывалася даволі значная група такіх мер.

Локоть — адна з найбольш часта ўжывальных мер даўжыні тканіны, зямлі, некаторых прадметаў: ...пастьвити на 30 *лакотъ* обаполъ дорогы (АЗР, I, 19, 1347); ...сукна попу чорного, доброго *локоть* десять давать маютъ (АВАК, XI, 7, 1433); Тамъ же нашли есмо... скрыню меншую зеленую, удолжки было *локтя* (АС, IV, 225, 1569).

Гэта мера ўжывалася як апасродкаваны сродак (вызначэнне колькасці аднаго тавару або рэчыва праз колькасць другога, з якім нярэдка прыходзіцца сустракацца ў помніках) вызначэння колькасці нітак: пражи съ кросна-

ми узяли *локоть* тридцать, у клубкахъ пражи было *локоть* тридцать (АС, I, 181, 1590).

Слова *локоть* у старабеларускай мове ўжывалася таксама з агульным, радавым значэннем 'сістэма адзінак вымярэння даўжыні' ў адносінах да відавога 'адзінка вымярэння': Такежъ и въ вѣсы Витебскіи а ни въ *локоть* нам не вступоватися, а коли который Витблянинъ въ вѣсѣхъ поступилъ або въ *локти,* ино Витбляномъ самимъ казнити по своему праву (ВС, 35, 1508); ...варуемъ, што иж врад кгродскии тамошнии... в *локти* ваги ятки меры местские вступоватсе не будет... (СДГА, 63, 1598). Утварэнне такога значэння звязана з тым, што *локоть* быў асноўнай адзінкай у сістэме мер Вялікага княства Літоўскага. Даўжыня гэтай адзінкі, паводле пастановы сейма 1766 г., — 0,6496 м [1].

Семантычныя змены слова *локоть* даволі выразныя і празрыстыя і не складаюць цяжкасці ў іх вызначэнні. Гэта слова з першапачатковым значэннем 'месца злучэння плечавой і локцевай касцей' адносіцца да праславянскіх (**olkъt*). У далейшым яно набыло значэнне 'даўжыня рукі ад пальцаў да локцевай касці', а потым 'адзінка вымярэння', бо гэта частка рукі была адной з першых мерак. З першапачатковым значэннем гэта слова ўжываецца ў рускай, украінскай, балгарскай, сербахарвацкай, славенскай, чэшскай, славацкай, польскай і лужыцкай мовах, а з метрычным — у рускай, украінскай, сербскай, чэшскай, польскай

[1] С. Гольдштейн. Польско-литовские древности, стар. 13.

(Фасм., II, 514). Характэрна, што словы, якія абазначалі локцевую косць, мелі метрычнае значэнне ў неславянскіх мовах — нямецкай, аўстрыйскай, англійскай, лацінскай, ісландскай, партугальскай і інш.[2]

Слова *локаць* ужывалася ў беларускай мове ва ўсе гістарычныя перыяды са значэннем меры і не страціла яго ў наш час. Праўда, назіранні паказваюць, што з такім значэннем яно выходзіць з актыўнага ўжывання, хоць актыўнасць ужывання з першапачатковым значэннем не зніжаецца: Лабановіч пераступіў высокі, амаль на *локаць*, парог і спыніўся каля дзвярэй (Колас, IX, 603); Яна была ў сярэдневяковай жаночай вопратцы: сукня, на якую пайшло пяцьдзесят *локцяў* залацістага аршанскага атласу... (Караткевіч, «Маладосць», 1964, № 10, 54); *Локцямі* раней палатно мералі, бо мэтры не было (Морач, МКДЭ МПІ). Яно трапляецца ў загадках і прыказках, запісаных І. Насовічам: Семья душъ триста и богата, да всего два *локци* хата — Улей пчел; Самъ съ кокоць, борода зъ *локоць*—Насмешка над малорослым стариком (ОРЯС, 202).

У старабеларускай мове ўжываўся прыметнік *локцевы* — 'на локаць даўжынёй', які ўтварыўся ад назоўніка *локоть* з метрычным значэннем, і назоўнік *полоктщына* — 'плата за гандаль у горадзе': «Сарветки две *локцевыхъ* (ГЮМ, I, 46, 1679); Отъ ряду соленого *полокотщыны*... дошло намъ... грошей... золотыхъ четырнадцать (ГЮМ, I, 12, 1679).

---

[2] Ф. Петрушевский. Общая метрология, ч. 1—2. СПб, 1849.

Аршинъ — адзінка вымярэння тканіны: А Янчинский пограбилъ, къ своей рѳце взялъ: ...тринадцать *арѣшинъ* китайки двѳличное... (РИБ, XX, 742, сярод актаў 1511 г.); ѳалюндишу бурнатьного чотыри *оршины*, китайки... чотыри *оршины* (АВАК, XXXIX, 52, 1578).

Ужыванне слова *аршинъ* з метрычным значэннем яшчэ раз пацвярджае думку, што ў розных мовах словы са значэннем 'месца злучэння плечавой і локцевай касцей' маглі набываць метрычнае значэнне. Гэта слова ў цюркіх мовах мела значэнне 'локаць (частка цела чалавека)' і 'адзінка вымярэння'. З апошнім яно, відаць, і было запазычана ў агульнаўсходнеславянскі перыяд. Як мера яно ўжывалася таксама ў рускай, украінскай, балгарскай і сербскай мовах. Як паказваюць назіранні, у старабеларускі перыяд слова *аршинъ* не было шырока распаўсюджана. Значна шырэй яно стала ўжывацца пасля далучэння Беларусі да Расіі, бо ў Расіі гэта была адна з асноўных адзінак даўжыні. Пасля гэтага яно таксама пашырыла семантыку і ў сучаснай беларускай мове ўжываецца з такімі значэннямі:

адзінка вымярэння: Вы багаты чалавек..., а перад людзьмі прыніжаецеся, кожнаму гатовы ў ногі кланяцца, і толькі за тое, што ён купіць *аршын* паркалю... (Галавач, I, 97); А капа — шэсцьдзесят снапоў, а кожны сноп ля перавясла — *аршын* кругам (Караткевіч, 1, 105);

прылада вымярэння: Гандляры спрытна матлялі на медны *аршын* вішнёвыя і белыя сукны (Караткевіч, 1, 252). Як паказваюць назіранні, слова *аршын* з такімі значэннямі выхо-

дзіць з актыўнага ўжывання. Аднак даволі часта яно ўжываецца ў складзе некаторых фразем і словазлучэнняў, якія маюць рознае значэнне. Фразема «мераць на свой *аршын*» (БРС, 99) мае значэнне 'раўняць па сабе', а «нібы *аршын* праглынуў» — 'стаяць прама, навыцяжку'; «*аршын* з шапкаю» — 'зусім нізкі' (Юрч., 1969, 128); «*аршынам* носа не дастанеш» — 'вельмі ганарлівы': У старшыні *аршынам носа не дастанеш* з-за тых свінарнікаў і кароўнікаў (У. Паўлаў, «Маладосць», 1971, № 9, 88). Словазлучэнне «даць тры *аршыны* зямлі» ўжываецца са значэннем 'знішчыць, загубіць': Без зямлі ўвесь век цягаўся горш якой скаціны, вось нарэшце дачакаўся — *далі тры аршыны* (Купала, 89); «бачыць скрозь зямлю на чатыры *аршыны*» — 'разумець усё чыста': Іду я на праверку да сваёй супругі, яна ў мяне *скрозь зямлю на чатыры аршыны бачыць*... (Паслядовіч, II, 282).

У мінулым стагоддзі слова *аршын* ужывалася ў складзе такіх словазлучэнняў: «вышовъ подъ *аршинъ*» — 'вырас такі, каб браць у рэкруты'; «*аршину* не сняли» — 'не памералі'; «*аршины* ня вышли» — 'малы, занізкі, каб ісці ў рэкруты': А въ вдовушки одинъ сынъ и той вышовъ *подъ аршинъ. И аршину ни сняли,* у солдаты аддали (Шэйн, I, 1, 464); Будим-жа раду браць, кого ў рэкруты отдать: у кого сыноў шэсть, тому ўси пошли заўчесть, у кого сыноў пять, там ни водного не ўзять, у кого сыны чатыры, там *ня вышли аршыны* (Зап., 661).

Ва ўкраінскай мове XVIII—XIX стст., як і ў беларускай, ужываліся словазлучэнні «стати

під аршин» — 'быць аддадзеным у салдаты'; «дійти до аршина» — 'стаць прыдатным да службы ў войску'[3]. Утварэнне такіх словазлучэнняў звязана з тым, што *аршын* у той час быў асноўнай адзінкай вымярэння, прычым калі ў старабеларускай мове ён ужываўся параўнальна рэдка, то пасля далучэння Беларусі да Расіі гэта адзінка вымярэння стала ўжывацца часцей, бо яна была асноўнай у сістэме мер Расіі.

Пра даўжыню *аршина* ў старабеларускі перыяд сведчыць такі прыклад: а сесь *аршинъ* великих перстов или цалей сто (АС, VI, 312, 1502). Цаля была прыблізна 2,7 *см,* у такім выпадку *аршинъ* — 2,7 *м.*

Сажень — адзінка вымярэння даўжыні: занявши вширки на локоть, а вдлужъ можетъ быть на двѣсти *сажней,* тамъ же дей плотомъ новымъ загородити казалъ (АС, V, 21, 1622); Отъ вежы воротное до тое вежы, где каплица, 20 *сажонъ*... (ДМАМЮ, 91, 1549); Дому того будованья: напервей свѣтлица трехъ *сажонъ,* соломою накрыта... (АВАК, XIV, 280, 1584).

Гэта слова са значэннем адзінкі вымярэння ўжывалася ў іншых славянскіх мовах — рускай, украінскай, стараславянскай, славацкай, чэшскай, балгарскай, славенскай, польскай, верхне- і ніжнелужыцкай (Праабр., II, 224). Самае ранняе яго ўжыванне ў помніках агульнаўсходнеславянскага пісьменства выявіў І. Сразнеўскі ў дакуменце, датаваным 1068 годам (Сразн., III, 908). Яно ўтварылася

[3] В. Винник. Назви одиниць виміру і ваги в українській мові. Київ, 1966, стар. 22.

ад дзеяслова *сягаць* і першапачаткова мела значэнне 'адлегласць паміж канцамі пальцаў разведзеных у бакі рук' (Праабр., II, 224), а потым набыло трывала замацаванае метрычнае значэнне. У сістэме мер Вялікага княства Літоўскага, зацверджанай пастановай сейма 1766 г., *сажень* складаўся з трох локцяў — 194,82 см, калі лічыць у локці 64,94 см (Гарб., 325).

У мінулым стагоддзі на Віцебшчыне, як пісаў А. Семянтоўскі, ужываліся тры сажні: казённы, або косы; махавы, або ручны; купецкі, або дзевяціфутавы [4].

У сучаснай беларускай мове слова *сажань* са значэннем адзінкі вымярэння ўжываецца ў творах старэйшых пісьменнікаў або ў творах на гістарычныя тэмы: Жар нестрывалы: трудна ўстаяць за тры *сажні* ад агню (Колас, IV, 227); Перад стопкаю невялікі кавалак двара, незанятага градамі, ды ў *сажань* шырынёй паска, як бы дарога ад стопкі ў вуліцу (Галавач, III, 46); Новую лазню Даніла Когут вывеў *сажняў* за сто ад берага, куды вышэй за ўласную хату (Караткевіч, 1, 7). У Я. Коласа яно ўжываецца са значэннем адзінкі вымярэння дроў (укладка на кубічны сажань): Узяў дзядзька Марцін грошы, пайшоў у лясніцтва і купіў асігнату на *сажань* дроў... Адзін бок *сажню* прыпёр да хвоі (Колас, V, 214). У літаратурнай мове яно выяўлена са значэннем 'прылада мераць поле (каза)': І трэба бачыць, з якой важнасцю мерае-перакідае *сажань*,

---

[4] А. Сементовский. О мерах и весах, употребляемых в Витебской губернии. Витебск, 1874, стар. 12.

спецыяльна зроблены, накшталт шырока расчыненага цыркуля, Пятро Бацюк (Колас, V, 239). П. Галавач называе гэту прыладу *сажонкай:* Паўз канаплянік і пайшлі камітэтчыкі з *сажонкаю,* якую зрабіў нехта ўжо на панскім двары... (Галавач, III, 163).

Слова *сажань* 'мера' ўваходзіць у склад фраземы «бачыць на тры *сажні* пад зямлёй»— 'добра ўсё разумець, быць кемлівым': Вы не глядзіце, што яна (цётка Палуся.—*К. С.*) трошкі падслепаватая ды кіслагубая, але *бачыць яна на тры сажні пад зямлёй* і чуе праз тры мураваныя сцяны (Крапіва, II, 44).

У сучаснай беларускай мове ўжываецца таксама прыметнік *сажнёвы* (*сажэнны*) — 'велічынёй (таўшчынёй) з сажань': ... у гэты час цераз *паўтарасажнёвую* сцяну агароджы, на турэмны двор, саскакваюць адна за адной бязгучныя і рухавыя постаці... (Самуйлёнак, I, 46); *Сажэннага* росту лёкай скочыў з запятак і з ляскам адкінуў падножку (Караткевіч, 1, 82).

Перстъ і *цаля.* Гэтыя словы абазначалі адну адзінку даўжыні і ў помніках старабеларускага пісьменства ўжываліся рэдка. Выяўлены толькі адзін прыклад з дакумента, у якім яны ўжываюцца як сінонімы: а сесь аршинъ великихъ *перстовъ* или *цалей* сто, си есть лактей четыри въ собѣ обрѣтаетъ... (АС, VI, 312, 1502).

Слова *перстъ* са значэннем 'палец рукі' з'яўляецца агульнаславянскім (Праабр., II, 46). Як і іншыя адзінкі вымярэння антрапаметрычнага паходжання, гэта слова набыло метрычнае значэнне таму, што палец рукі

(перст) ужываўся пры вымярэнні невялікай даўжыні (*перстъ* прыблізна 2,7 см). Магчыма, гэта была не адна, а, самае малое, дзве метрычныя адзінкі, пра што сведчыць ужыванне ў цытаваным прыкладзе складанай назвы (*великихъ перстовъ*). Але пацверджання гэтай думкі ў помніках старабеларускага пісьменства не выяўлена.

Цаля таксама адносіцца да адзінак даўжыні антрапаметрычнага паходжання. Сярэдневерхненямецкае слова *Zol* 'фаланга пальца' ў XVI ст. ужывалася са значэннем 'адзінка вымярэння на палец шырыні'[5] і, на думку Я. Карскага, праз польскае пасрэдніцтва было запазычана старабеларускай мовай[6]. Відаць, запазычана яно было з метрычным значэннем, бо з іншымі значэннямі ў старабеларускай мове не выяўлена. Пазней гэта адзінка ўвайшла ў склад сістэмы мер Вялікага княства Літоўскага (24 цалі ў адзін локаць[7]).

Слова *перст* у сучаснай беларускай мове ў актыўным ужыванні не выяўлена. *Цаля* ўжываецца са значэннем адзінкі даўжыні: Ну, ўсе выгоды каля бока, тае зямлі якраз валока, — Міхал распісваў з жарам далей.— А чорны грунт — дванаццаць *цалей* (Колас, VI, 27); Такім чынам, бачыў я кожны дзюйм, кожную *цалю* таго берага, ля якога мы праплывалі (Караткевіч, «Маладосць», 1969, № 12, 91). Яно ўжываецца ў словазлучэннях

---

[5] В. Винник. Назви одиниць виміру і ваги, стар. 15.

[6] Е. Карский. Белорусы. Введение к изучению языка и народной словесности. Вильна, 1904, стар. 157.

[7] С. Гольдштейн. Польско-литовские древности, стар. 137.

«свайго не ўпусціць ні на *цалю*» — 'не ўпусціць сваёй карысці', «не саступіць і *цалі*» — 'не ўступіць нічога нікому': Той самы Богут, што без жалю гатоў зарваць чужы кусок і высмактаць з цябе ўвесь сок, *свайго ж не ўпусціць ні на цалю* (Колас, VIII, 20); Я *не саступлю і цалі*. Мяне не на тое нарадзілі (Караткевіч, 2, 83).

У сучаснай беларускай мове ўжываецца таксама прыметнік *цалёвы* 'даўжынёй на цалю' і ўтвораны ад яго назоўнік *цалёўка* 'дошка на цалю таўшчынёй': ...каля коміна стаяла матчына прасніца, скрыначка з рашпілем, абцугамі і *цалёвымі* ржавымі цвікамі (В. Адамчык, «Маладосць», 1969, № 3, 23); Агата пайшла ў мыцельнік, за перагародку з *цалёвак*, нібы мыць міскі (Чорны. Анталогія беларускага апавядання, I, 224).

У старабеларускай мове з метрычным значэннем магло ўжывацца слова *палецъ*, пра што сведчыць такі прыклад: И теперъ суть границы и копцы цѣлы и не тыле на пядь, але на *полпальца* земли вашое милости никому не поступилъ и пильне того стерегу (АС, I, 44, каля 1536 г.). Тут словазлучэнне «не тыле на пядь, але на полпальца» мае значэнне 'нікольк, ні кавалка', а слова *полпальца* ўваходзіць у гэта словазлучэнне са значэннем меры. Таму магчыма, што адзінка, якая называлася *палецъ*, ужывалася ў старажытнасці таксама, як і цяпер: сала на тры *пальцы*, на пяць *пальцаў*.

Пядь — адзінка вымярэння даўжыні: Крестъ... былъ 8-должки *пяди* (РИБ, XX, 874, 1516); В той вежы дело железное полдевяты *пяди*... (ДМАМЮ, 91, 1549).

Гэта слова са значэннем 'адлегласць паміж вялікім і ўказальным пальцам' ёсць і ў іншых славянскіх мовах — стараславянскай, украінскай, славацкай, балгарскай, македонскай, славенскай, чэшскай, польскай, верхне- і ніжнелужыцкай (Праабр., II, 165). Словы з аналагічным значэннем ужываліся як меры ў англійскай і бірманскай мовах[8]. На думку А. Праабражэнскага, слова *пядь* — вытворнае ад дзеяслова *пять* (бел. *напінаць*) (Праабр., II, 165). Тое, што з метрычным значэннем яго выявіў І. Сразнеўскі ў «Ізборніку Святаслава», сведчыць, што мерай яно было ў агульнаўсходнеславянскі перыяд. Ужыванне ў помніках старабеларускага пісьменства паказвае, што гэта была шырока ўжывальная бытавая мера, якая не ўваходзіла ў склад дзяржаўнай сістэмы мер. Пра шырокае ўжыванне гэтага слова сведчыць і тое, што яно выяўлена ў складзе словазлучэнняў «земли пяди нѣтъ» — 'зусім няма зямлі' і «не поступил на пядь» — 'не аддаў ніколькі': И теперь суть границы и копцы цѣлы и не тыле *пядь*, але на полпальца земли вашое милости не поступил и пильне того стерегу (АС, I, 44, каля 1536 г.).

У старабеларускай мове ўжываўся ўтвораны ад назоўніка *пядь* 'мера' прыметнік *пядный*, які ўваходзіў у колькасна-іменныя спалучэнні *пятипядный, четырѣпядный* — 'на пяць (чатыры) пядзі велічынёй': Зъ Малиньской земли идеть два лукнѣ *пятипядныхъ*, а третее *четырѣпядное*. У Моколевичахъ съ Та-

[8] Ф. Петрушевский. Общая метрология, стар. 257.

расовъской земли 2 *четырѣпядныхъ* лукна (Нас. АУ, 537, 1415).

У сучаснай беларускай мове — літаратурнай і дыялектнай — слова *пядзя* ўжываецца са значэннем меры: Сала на хібу вельмо тоўстае, на цэлую *пядзю* (Хідра); Я мужык-беларус — пан сахі і касы; цёмен сам, белы вус, *пядзі* дзве валасы (Купала, 17). Яно ўваходзіць у некаторыя словазлучэнні, значэнне якіх выяўляецца ў тэксце: Ды гэта і перад Варонічам узвысіла б яго *на цэлую пядзю* — 'вельмі' (Грамовіч, 21); У пана Зыгмуся *ні адна пядзя* зямлі не запуставала — 'ні аднаго лапіка' (Колас, V, 278); *Кожная пядзя* тае зямлі, як расінка травіцы, патрэбна мужыку — 'самы малы кавалак' (Мурашка, 401). Гэта слова ўваходзіць у склад фраземы «сем пядзяў у лбе», якая мае значэнне 'вельмі разумны': Людзі там выключныя. Па-першае, галава: Зыгмунт Серакоўскі... Сем гадоў ссылкі, *сем пядзяў у лбе,* сем дабрачыннасцяў (Караткевіч, 2, 130).

Стопа — адзінка вымярэння даўжыні: другого теды дня приехали къ одной рецѣ, на которих берегах полно было тростины велми толстои, яко сосны на шест десят *стопъ* высоки (Алекс., 82); Были там дерева высокии на сто *стопъ,* а были подобны бобковому и оливному дереву (Алекс., 106).

Гэта слова выяўлена толькі ў «Александрыі», але ўскосныя факты сведчаць, што ў старабеларускай мове яно павінна было ўжывацца часцей, чым гэта засведчана ў помніках. Пацверджаннем такой думкі можа быць тое, што *стопа* — гэта адзінка дзяржаўнай сістэмы

мер Вялікага княства Літоўскага, яе даўжыня — 12 цаляў (прыблізна 32,5 см)[9].

Слова *стопа* ёсць у многіх славянскіх мовах. Ва ўкраінскай яно ўжываецца з двума значэннямі — 'ступня, след нагі' і 'адзінка даўжыні (фут)' (Грынч., IV, 210), у рускай — 'ступня', 'мера ў вершаскладанні' 'груд, складзены парадкам'; 'след' у выразе «по стопам»', у славенскай — 'след' і 'фут', у чэшскай — 'ступня' і 'след', польскай — 'ступня', 'падэшва (гары)' і 'фут' (Праабр., II, 342). У старабеларускай мове яно мела таксама значэнне 'ступня': До *стоп* у ног витого королевского маестату упадаемъ (Нас., АУ, 460 адв., 1648).

Гэта слова набыло метрычнае значэнне, відаць, таму, што *стопа* (ступня нагі) ужывалася пры вымярэнні даўжыні. У далейшым за ім замацавалася пастаяннае метрычнае значэнне, якое прыблізна адпавядала англійскаму футу.

У сучаснай беларускай дыялектнай мове *стапой* называецца ступня нагі. Слова гэта можа ўжывацца са значэннем меры: Доску добра *стапой* мераць. Станеш на канец і йдзеш па досцы *стапа* да *стапы* (Морач, МКДЭ МПІ).

Крокъ — адзінка вымярэння даўжыні: Стадіонъ, стадій, стаи, гоны: ρκе *кроковъ*... (Бяр., 121); Поприще: миля, ...в той замыкаетсѧ [1000] *кроковъ:* або осмъ стадій... (Бяр., 88). У помніках дзелавога пісьменства яно не выяўлена, аднак даволі часта ўжыва-

[9] С. Гольдштейн. Польско-литовские древности, стар. 137.

ецца ў помніках іншых жанраў (гл. картатэку «Слоўніка старабеларускай мовы», складзеную супрацоўнікамі сектара гісторыі мовы Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа АН БССР).

В. Віннік, прымаючы пад увагу тое, што на ўсходзе Украіны слова *крок* ужывалася рэдка, лічыць, што яно прыйшло ва ўкраінскую мову з польскай, хоць паходзіць яно з агульнаславянскай мовы (*корк* 'нага')[10]. Ужыванне яго ў старабеларускай мове не дае падставы зрабіць такі вывад. Разам з тым пакуль што недастаткова фактаў, каб даказаць, што старабеларуская мова захавала яго з агульнаславянскай эпохі.

У сучаснай беларускай мове слова *крок* атрымала шырокае распаўсюджанне і ўжываецца з метрычным значэннем: Я прайшоў *крокаў* сто (Колас, V, 20).

ПРЫЛАДЫ ВЫМЯРЭННЯ — АДЗІНКІ ДАЎЖЫНІ І ПЛОШЧЫ

Лыко — адзінка вымярэння даўжыні: а напротивъ того огорода взяли отменою у Яска Томковича полянку простого поля у одно *лыко* (АВАК, XXI, 165, 1556); а напротивъ того огорода батько нашъ далъ отцу ихъ и дѣтемъ его отмену въ поли в тоежъ *лыко* (АВАК, XVII, 11, 1539). Гэта слова ўжывалася са значэннем 'прылада вымярэння': ихъ привилья *лыкомъ* есмо вымерали (АВАК, XVII, 307, 1541). Пра тое, што на Беларусі

[10] В. Винник. Назви одиниць виміру і ваги, стар. 30.

лыка ўжывалася як мерка, пісаў Дз. Пахілевіч. На яго думку, прычына ўжывання тая, што вяроўкі з іншага матэрыялу для вымярэння непрыгодныя: пяньковая ссыхаецца і тым самым парушае меру, а пры вымярэнні сырой зямлі робіцца мокрай і падаўжаецца. Дрэнна карыстацца і медным ланцугом, бо ён цяжкі, часта закручваецца, колцы заскокваюць, у лесе такія ланцугі часта ірвуцца. Ён лічыць, што даўжыня лыка — адзінкі вымярэння — была такая самая, як і шнура [11].

Як ужо адзначалася, словы са значэннем адзінак вымярэння даўжыні набывалі значэнне 'мерная прылада' (*аршын, сажань*). Са словам *лыко,* а таксама з іншымі назвамі метрычных адзінак, якія першапачаткова мелі значэнне 'мерка', адбылася адваротная з'ява: яны набылі значэнне 'адзінка вымярэння'. Што ж да слова *лыко,* то па паходжанню яно агульнаславянскае, але з метрычным значэннем выяўлена толькі ў старабеларускай мове.

У старабеларускай мове ўжывалася слова-злучэнне «поделити въ лыко» — 'раздзяліць зямельныя ўчасткі, памераўшы іх лыкам': Тогды маютъ *въ лыко* и лихое и доброе *поделити* наполы (Гарб., 262).

Шнуръ — адзінка вымярэння даўжыні і плошчы: отъ гумна пани Кгрековое ажъ до млына *шнуровъ* деветьнадцать (АВАК, VI, 178, 1599); Помера: должини *шнуровъ* 47, пречина прут[ов] 8, чинит мор[гов] 12

---

[11] Д. Похилевич. Землеустройство и поземельный кадастр в Белоруссии, Литве и Украине.— Материалы по истории земледелия СССР, сб. 1. М., 1952, стар. 357.

(ДМАМЮ, 255, 1566); Помѣра двуполь вдолжъ до шестдесятъ семь *шнуровъ*, попрекъ по пять прутовъ... (АВАК, XIV, 192, 1578).

Гэта слова было запазычана старабеларускай мовай, як лічыць Я. Карскі, праз польскую мову з нямецкай, дзе *sznur* — 'вяроўка'[12]. Як адзінка вымярэння, яно ўжывалася ва ўкраінскай і польскай мовах. Магчыма, такое значэнне яно набыло на глебе трох моў. Прычына ўтварэння метрычнага значэння гэтага слова такая самая, як і слова *лыко*: *шнур* ужываўся як мерная прылада. З апошнім значэннем гэта слова выяўлена ў старабеларускай мове: А дъля разознанья подъданыхъ войтъ маеть мети *шнуръ*, одънакое меры справленый и досветчоный... (Устава, 9).

Шнуръ 'адзінка вымярэння' ўваходзіў у склад дзяржаўнай сістэмы мер і меў велічыню: як адзінка даўжыні — 75 локцяў, прыблізна 49 метраў[13], як адзінка плошчы — 100 квадратных прутоў, або ў адным маргу тры шнуры[14].

У старабеларускай мове слова *шнуръ* ужывалася са значэннямі 'зямельны ўчастак' і 'сенажаць': ...с тых прычын десет *шнуров* зуполных по одинадцати моркгов давное померы волочное кгрунту пана Быховцового взявшы, межы кгрунтами его королевское

---

[12] Е. Карский. Белорусы. Введение..., стар. 158.

[13] Я. Ісаевич. Деякі питання української метрології XVI—XVIII ст.— «Навукова-інформаційний бюлетень Архівного управління УРСР, № 2 (46). Київ, 1961, стар. 10—12.

[14] С. Гольдштейн. Польско-литовские древности, стар. 139.

милости лежачыхъ, подали и привернули... (АВАК, XXX, 146, 1595); *Шнуры* пашенные за нихъ передою пусто залегли, ...а иншые *шнуры* сами ихъ милости собѣ вильчимъ правом позаберали... (АС, IV, 194, 1644). Такое значэнне захавалася і ў сучаснай мове: ...перад вачыма шырылася, расплывалася ў шэрані змрокам і пачынала гойдацца рабаціннем *шнуроў* зямля (Галавач, I, 255); Акрамя назваў урочышчаў, яшчэ засталіся ў нас назвы *шнуроў*. Няма і пядзі неахрышчанай зямлі (М. Танк, «Полымя», 1967, № 3, 142). Значэнне адзінкі вымярэння страцілася.

Прутъ — адзінка вымярэння даўжыні і плошчы: Рѣзъ деветьдесятъ шесть въ должъ шнуровъ пятьдесятъ пять, а поперекъ *прутовъ* шесть (АВАК, XIV, 155, 1566); на двадцать девятомъ местцу лесу, зарослей *прутовъ* двадцать и полъчетверта (АВАК, XXIV, 159, 1554); ..уволоки подданых господарскихъ волокъ две, морговъ двадцать девять, *прутовъ* шесть и полъ и три части *прута* одного (АС, I, 136, 1562).

Першапачатковае значэнне слова *прут*, якое А. Брукнер адносіць да праславянскіх [15], 'тонкая палка, лазіна'. Слова з аналагічным значэннем мела метрычнае значэнне ў шведскай мове [16]. Метрычнае значэнне гэта слова набыло, найбольш верагодна, таму, што прут,

[15] А. Праабражэнскі называе такія мовы, у якіх ужываецца гэта слова: украінская, стараруская, стараславянская, славацкая, балгарская, славенская, чэшская, польская, лужыцкая, палабская (Праабр., II, 139).

[16] Ф. Петрушевский. Общая метрология, стар. 76.

палку пэўнай даўжыні, ужывалі як мерную прыладу.

Метрычнае значэнне слова *прут* мела ва ўкраінскай і польскай мовах, магчыма, яно яго набыло адначасова на глебе трох моў.

У сістэме мер Вялікага княства Літоўскага *прутъ* як адзінка вымярэння даўжыні быў 7,5 локця (4,87 м), як адзінка плошчы — 237,3 кв. м [17].

Асабліва часта на пруты мералася зямельная плошча ў гарадах, дзе пляцы былі невялікія. Плата за гэтыя пляцы называлася *прутовъщына, попрутщына, прутовое:* теды вси згодне а едностайне уфалили *прутовъщыну* зъ жылого прута по зол[отых] два... (ГЮМ, I, 15, 1679); Тое место Берестейское... вызволено ест от даваня до скарбу е.к.м. *прутового* и циншу з волок 60... (ГБДМ, 347, 1566); На две сесыи, где и *попрутщыну* ухвалили, купили свечъ десятки два (ГЮМ, X, 67, 1695).

Топорище — адзінка вымярэння даўжыні: такежъ жаловали намъ, штожъ здавна мощывали каждый ч[о]л[о]в[е]къ передъ своимъ дворомъ пяти *топорищъ* (РИБ, XXVII, 594, 1495); ...нижли я на тотъ часъ з дому своего не мог вывести... тесниц меншых сорок девет, кождая по два сажни и по два *топорища*... (АВАК, XXXIX, 293, 1578—1579).

Абодва прыклады сведчаць, што значэнне адзінкі вымярэння не было аказіянальным для гэтага слова. Як мера даўжыні яно ўжывалася ў рускай мове («бытовая мера» —

---

[17] С. Гольдштейн. Польско-литовские древности, стар. 139.

Кочын, 364). Утварэнне такога значэння звязана з тым, што ручка сякеры была першай меркай у цяслярскай справе, г. зн. была прыладай вымярэння.

У сучаснай беларускай мове слова *тапарышча* мае нетэрміналагічнае (аказіянальнае) метрычнае значэнне: Адмераўшы чатыры *тапарышчы* па камлі, Андрэй з нейкай злосцю стаў адсякаць кавалкі дуба (Колас, IV, 154).

АДЗІНКІ ВЫМЯРЭННЯ ДАЎЖЫНІ (АДЛЕГЛАСЦІ), УТВАРЭННЕ ЯКІХ ЗВЯЗАНА З ФІЗІЧНАЙ МАГЧЫМАСЦЮ ЧАЛАВЕКА ПЕРААДОЛЕЦЬ АДЛЕГЛАСЦЬ

Стрѣленье (*стрѣльбище*): Тое всее розницы промежку коруны и великого князства в тых мѣстцахъ индѣ на полмили, а инде на милю, ...а индѣ на *стрѣленье* зъ лука (АС, I, 54, 1540); ...отъ краю могло быть съ четверо *стрѣленья*... (АВАК, VI, 143, 1586); Мы на его челомбитье то вчинили и тыи мѣстца удольжъ *стрѣльбища* берегом Буга, а въширки отъ берега до горы ему дали до воли Нашое... (Бярш., 127, 1525); ...шодши зо тры *стрельбища з луку*... (АВАК, XXVI, 169, 1585). Як бачым з прыкладаў, гэта адзінка абазначалася словазлучэннем *стрѣленье (стрѣльбище) з лука*. Словазлучэнне паказвае, што за адзінку даўжыні была прынята адлегласць, якую пралятае выпушчаная з лука страла. Такое значэнне ў рускай мове мела слова *стрелище* (Кочын, 348). Відаць, такая мера даўжыні

ўзнікла ў агульнаўсходнеславянскі перыяд, бо яна была, апрача Беларусі і Расіі, і на Украіне. Яе даўжыня 60—80 м.

У наш час такая мера не ўжываецца. Самае позняе яе ўжыванне зафіксаваў У. Дабравольскі: «*Стрѣлище* — расстояние, на кое долетает выстрел, т. е. расстояние шагов в сто. Прашоў я два *стрѣлища*» (Дабр., 884).

Стая — адзінка вымярэння даўжыні: ...а за копцом троха далей, на двои *стаи* ку орѣхову идучи, в двохъ соснахъ... знаки старые граничные... (АВАК, VI, 143, 1586); отъѣхавши там далей съ четвери *стаи,* оказали грани иншіе цѣлые (АВАК, VI, 144). Гэта слова ёсць у «Лексіконе» П. Бярынды: стадіонъ, стадій, *стаи,* гоны: р҃ке кроковъ, с҃н ст҃пеній... (Бяр., 121); Поприще, мил҃, ...в той замыкается [1000] кроковъ, або осмъ стадій, *стаіовъ,* гоновъ, зри стадіон... (Бяр., 88). П. Бярында ставіць у адзін рад словы *стадіонъ, стадій, стаи.* З гэтага можна зрабіць вывад, што *стая* — гэта трансфармаванае грэчаскае слова σταδιον 'стадый, стадыён', якое ўжывалася са значэннем адзінкі вымярэння ў грэчаскай мове. Першапачатковае яго значэнне — 'адлегласць, якую мог прайсці чалавек за час, пакуль дыск сонца выйдзе з-за гарызонту' (прыблізна за 2 мін.). *Стадый* быў запазычаны многімі народамі і ў сістэме мер розных дзяржаў быў неаднолькавы — ад 174,5 да 240,4 м (БСЭ, т. 40, 412). П. Бярында прыраўноўваў *стадіонъ, стадій, стаю* да 125 *ступеній* (стоп) — прыблізна 80 м.

Паколькі слова *стая* з іншымі, апрача метрычнага, значэннямі не выяўлена ў старабела-

рускай мове, можна лічыць, што з такім значэннем яно было запазычана.

У «Александрыі» як мера ўжываецца слова *стаяне,* якое не выяўлена ў помніках дзелавога пісьменства: а был той замок збудован з той великои тростины, которой теж реки было на чотыри *стаяня* ... (Алекс., 83). Магчыма, што *стая* і *стаяне* абазначалі адну і тую ж адзінку вымярэння. Так, А. Брукнер піша: «Staje i stajadło, stajanie i (to) staje «stadium» o mierze długosci, staisko: u innych słowian «chata» i «stajanie», prasłowiańskie; od stać» (Брукнер, 512). Як бачым, ён ставіць побач словы *стая* (staja) і *стаяне* (stajanie), тлумачачы іх словам *стадыюм* (stadium).

АДЗІНКІ ВЫМЯРЭННЯ ДАЎЖЫНІ І ПЛОШЧЫ, УТВАРЭННЕ ЯКІХ ЗВЯЗАНА З АСАБЛІВАСЦЮ АПРАЦОЎКІ І ПАДЗЕЛУ ЗЯМЛІ

Верста — адна з асноўных адзінак вымярэння даўжыні (адлегласці): Того лѣсу нашого, почонъ одъ Войтовы, а одъ Евглевича границы у верхъ подлѣ рѣки Лососны на чотыры *версты,* а поперекъ одъ тоежъ рѣки Лососны на двѣ *версты* ему есми дали (АЛМ, II, 127, 1503); Отъ того островка просто повелъ насъ болотомъ до третего островка якобы на *версту* великую, а межы тыхъ острововъ... оказалъ намъ два копцы (АС, I, 60, 1540).

Спосаб утварэння і развіццё семантыкі слова *верста* падрабязна прааналізаваў А. Патабня. Ён лічыў, што гэта слова ўтварылася ад дзеяслова *вертѣ-ти* (*верт-та, верста*) і пер-

шапачаткова мела значэнне 'паварот плуга', а затым 'баразна', ад якога і ўтварылася значэнне меры. Яно таксама мела значэнне 'рад прадметаў па прамой лініі — цаглін у сцяне, камянёў на дарозе' і 'пара, раўня'[18]. З апошнім, як сведчыць І. Насовіч, яно ўжывалася ў старабеларускай мове: Таковыхъ пленныхъ въ замѣнъ, которые бы имъ въ *версту* были, отъ тебе похочу (Нас. АУ, 29).

Слова *верста* ўжываецца ў многіх славянскіх мовах, а аднакарэнныя ёсць і ў іншых індаеўрапейскіх мовах. Гэта дае падставу лічыць, што корань у ім індаеўрапейскі. Паколькі з метрычным значэннем яно ўжываецца толькі ва ўсходнеславянскіх мовах, то можна сцвярджаць, што такое значэнне слова *верста* набыло ў агульнаўсходнеславянскі перыяд.

Як адзінка даўжыні *верста* была неаднолькавая, пра што сведчаць удакладненні яе даўжыні ў некаторых дакументах: вымерили есмо чотыры *версты по осми сотъ сажонъ безъ дву сажонъ*... споръ мели противку насъ, меnуючи, якобы мело быти в каждой *версте по тысячи сажонъ* (АВАК, XVII, 306); вымерили есми две *версте по осми сотъ сажонъ безъ дву сажонъ в каждой версте* (АВАК, XVII, 308); ижъ дей ухвала земская зносить *версту тысячи сажонъ* (АВАК, XVII, 349). Гэтыя прыклады даюць падставы лічыць, што ўжываліся дзве адзінкі з розным колькасным эквівалентам — *верста* і *верста великая*. Першая была 798 сажняў, другая — 1000.

---

[18] А. Потебня. Из записок по русской грамматике. М., 1958, стар. 13—15.

Верста ўваходзіла ў сістэму мер Вялікага княства Літоўскага і мела даўжыню прыблізна 1554,6 м.

У сучаснай беларускай мове выяўлена два значэнні гэтага слова — 'адзінка вымярэння' і 'кладка дроў': Апошнія паведамленні можна слухаць за *вярсту,* нават за дзве ад райвыканкомаўскай плошчы... (І. Навуменка, «Полымя», 1966, № 7, 9); Яна (Грасыльда.—*К. С.*)... згіналася на дрывотні і прымала з-пад ног... бярозавае палена, якое скацілася з *«вярсты»* (І. Пташнікаў, 99). Яно ўжываецца таксама са значэннем 'верставы слуп': У каляінах колы калыхалі, спыняўся конь ля кожнае *вярсты* (С. Грахоўскі, «Полымя», 1969, № 1, 9), а таксама ўваходзіць у склад некаторых выслоўяў, якія маюць рознае значэнне: *Сем вёрст да нябёс і ўсё лесам* — гавораць пра што-небудзь вельмі далёкае і маладаступнае (Лукі, МКДЭ МПІ); *сем вёрст кісялю сёрбаць* — 'ісці далёка за нязначнай справай': Але сад саўгасны, вадасховішча забруджана больш, як Свіслач, а да горада *сем вёрст кісялю сёрбаць* («Маладосць», 1969, № 3, 120); *за кавалак пеку сем вёрст квэкай* — 'ісці далёка за непатрэбшчынай': Чорт ведае што! Навука! Едзеш немаведама куды, мучышся. *За кавалак пеку сем вёрст квэкай.* Сваёй мудрасці няма, ці што? (Караткевіч, 2, 106).

У сучаснай беларускай мове ўжываюцца вытворныя ад назоўніка *вярста* — прыметнікі *верставы* (слуп) і *-вёрстны* ў колькасна-іменных спалучэннях: Грыміць на карэннях цялежка, мігцяцца стракатыя *верставыя* слупы, мігцяць, пахіліўшыся, абросшыя мохам

хваёвыя крыжы наабапал дарогі (Колас, IV, 15); Па балотах дзед палазіў за *стовёрсты* пераход (К. Кірэенка, «Полымя», 1969, № 1, 70).

Гоны — адзінка вымярэння даўжыні і плошчы: ...Сынове отцу на кождый годъ жита а на яриво земли четвери *гоны*... (АВАК, XVIII, 13, 1539); ...въ приседленю волока одъ рѣки Муховца... тягнется на *гоновъ* четыредесяти, а сіи *гоны* въ собе маютъ аршиновъ тридцать, а сесь аршинъ великихъ перстовъ или цалей сто... (АС, VI, 312, 1502).

Першае ўжыванне слова *гоны* ў пісьмовых помніках выявіў І. Сразнеўскі ва ўстаўной смаленскай грамаце 1150 г.: А у Дорогобужи три *гоны* короткіи, а почестья гривни, а пять лисиць (Сразн., I, 550). Яно ўжывалася і ў іншых славянскіх мовах — украінскай, рускай, польскай, сербахарвацкай. Утварылася яно ад дзеяслова *гнати* і першапачаткова мела значэнне 'адлегласць ад аднаго павароту рабочай жывёлы (коней ці валоў) да другога ў час арання'. Утварэнне такога слова ад дзеяслова *гнати* стала магчымым таму, што ён меў значэнне 'араць баразну', якое захаваў і ў сучаснай беларускай мове. У сувязі з тым што ў час арання звычайна праганяецца баразна пэўнай даўжыні (даўжыня гэта абумоўліваецца часцей за ўсё даўжынёй участка), слова *гоны* набыло значэнне адзінкі даўжыні спачатку поля, а потым любой адлегласці. Як сведчаць помнікі, даўжыня *гонаў* у XVI ст. была каля 80 м.

У сучаснай беларускай мове слова *гоні* (у дыялектах — таксама і *гона*) не страціла зна-

чэння меры. Праўда, калі ў дыялектнай мове вызначаецца больш-менш канкрэтнае метрычнае значэнне, то ў літаратурнай — гэта мера няпэўнай даўжыні: Сто шагоў — тая самая *гона*. Зямлю мералі *гонамі* (Рэдкавічы, МКДЭ МПІ); Моўчкі праехалі яны колькі *гоняў* (І. Навуменка, «Полымя», 1966, № 12, 8). К. Крапіва ўжывае памяншальную форму *ганкі* і *паўганкі:* У мяне дык жыта яшчэ не пасеена. Там, на Доўгіх, *ганок* са двое пад бульбаю было, дык учора толькі выбралі (Крапіва, II, 165); І бачыць Рыгор — *паўганок* канюшыны яго стаптана — адны капыты ды падсохлыя конскія яблыкі (Крапіва, II, 30).

Слова *гоні* ў сучаснай беларускай мове ўжываецца са значэннем 'зямельны ўчастак, поле'; Белая Русь мая, чыстая ты мая. Родная ты мая. Белыя *гоні* бульбы. Белыя косы дзяўчат. Воблакаў белых над Бугам вечны парад (У. Скарынкін, «Полымя», 1967, № 1, 65). М. Клышка ў «Матэрыялах для слоўніка сінонімаў» ставіць у адзін сінанімічны рад словы *поле, ніва, гоні, палетак, лан* («Полымя», 1967, № 3, 231). З такім значэннем слова *гоні* ўжываецца пераважна ў паэтычнай мове.

Загонъ — адзінка вымярэння плошчы: капусты насажоно *загоновъ* двадцать, пастернаку *загоновъ* петнадцать (АВАК, III, 28, 1577); си есть одна волока, которая починается отъ жерла реки, ... вздолжъ на четверть мили... въ поперекъ на *загоновъ* чотырыдесяти пяти (АС, VI, 309, 1596).

Як і слова *гонъ, загонъ* утварылася ад дзеяслова *гнати* са значэннем 'араць баразну'.

Розніца ва ўтварэнні абумоўлена розніцай у апрацоўцы зямлі: утварэнне слова *гонъ* звязана з неабходнасцю араць баразну пэўнай даўжыні, а *загонъ* — пэўнай шырыні, якая залежыць ад спосабу арання—у склад ці ў разору.

Загонъ быў пераважна адзінкай вымярэння зямлі пад агароднінай і ў метрычнай функцыі ўжываўся як сінонім *грады*, пра што сведчаць помнікі старабеларускага пісьменства: ...а сей *загонъ* или *града* маетъ мѣти въ собѣ по закроевъ седми (АС, VI, 309, 1596). Л. Малчанава піша, што на нізкіх вільготных глебах практыкавалася араннe вузкімі, падобнымі да агародных град загонамі [19]. Такім чынам, пацвярджаецца сінанімічнасць слоў *загонъ* і *града* ў метрычнай функцыі.

Плошчу *загона* ўстанавіць не ўдалося, шырыня яго магла быць, паводле нашых вылічэнняў, 2,5 м. На Украіне ўчасткі на 5, 10 і больш дзесяцін, якія належалі аднаму гаспадару, называліся загонамі [20].

У старабеларускай мове гэта слова ўжывалася таксама са значэннем 'зямельны ўчастак': кгвалтовне тые сеножати на *загонъ* пооралъ и подралъ (АВАК, XXVI, 99, 1585).

У сучаснай беларускай мове *загонъ* — 'адзінка плошчы' і 'зямельны ўчастак': На гумнішчы два *загоны* бульбы зрабіў (Бабровічы); Асталося прайсці некалькі *загонаў*, засеяных аўсом (Колас, IV, 225). Р. Мурашка

[19] Л. Малчанава. Спосабы апрацоўкі зямлі і сельскагаспадарчая тэхніка. — «Весці АН БССР». Серыя грамадскіх навук, 1969, № 4, стар. 87.

[20] А. Ханенко. Исторический очерк межевых учреждений в Малороссии. Чернигов, 1870, стар. 68.

ўжывае гэта слова са значэннем адзінкі вымярэння даўжыні: *Загоны* з чатыры асталося ўжо да павароткі ў Заямнае, калі насустрач яму з-за ўзгорачка вытыцнуліся чатыры чалавекі (Мурашка, 441).

Волока — адна з асноўных адзінак вымярэння плошчы: въ имѣнью моимъ Смолевицкимъ *волоки* двѣ грунту пашного... (АС, I, 6, 1507); лѣсу на дрова годного *волок е* (5), моркговъ ке (25) подлыхъ (РКЭ, 72, 1563).

Такая мера ўжывалася ў Польшчы і на Украіне.

Слова *волока* ўтварылася ад дзеяслова *волочити*, які сярод іншых значэнняў меў 'баранаваць' і вызначаўся вялікай словаўтваральнай здольнасцю. Першапачатковае значэнне вытворнага было, відаць, 'зямельны ўчастак, забаранаваны за пэўны час'.

Волока як мера плошчы мела 30 маргоў (21,4 га) і ўваходзіла ў сістэму мер Вялікага княства Літоўскага. Праўда, у яе мералі і на 33 маргі, і нават на 40. Дз. Пахілевіч бачыць прычыну такога вымярэння ў тым, што пры падзеле зямлі на валокі (валочнай памеры) давалі надбаўку за тую зямлю, якая не выкарыстоўвалася на ворыве — вуліцы, прагоны і інш., а таксама як кампенсацыю за дрэнную зямлю [21].

У сувязі са стракатасцю землекарыстання і складанасцю падатковага абкладання Сігізмунд Аўгуст па прыкладу сваёй маці каралевы Боны пачаў праводзіць упарадкаванне зем-

[21] Д. Похилевич. Землеустройство и поземельный кадастр..., стар. 359, 362.

лекарыстання: усю зямлю пачалі дзяліць на валокі — зямельныя ўчасткі пэўных памераў, і на гэтыя ўчасткі пасяляліся і перасяляліся сяляне. Слова *валока* набыло агульнае значэнне 'зямельны ўчастак'. З-за неабходнасці падатковага абкладання адрозніваліся ўчасткі — валокі *оселые, пустые, цыншовые, осадные, тяглые, копные* і інш. Шырокае правядзенне валочнай памеры выклікала ўтварэнне многіх вытворных ад слова *волока*. Прыметнік *волочный* меў значэнне 'той, што адносіцца да валокі': державца Красницкій и Квасовскій... становячи померу *волочную* на кгрунтахъ замку нашого Городенского, не мало земль... заняли (АС, I, 135—136, 1562). Дзеяслоў *поволочити* ўжываўся са значэннем 'падзяліць зямлю на валокі', а мернік, які размяраў гэту зямлю, называўся *волочникъ:* Року 1592, о мясопустахъ, его милость князь Богданъ Соломерицкий... Чайки откупилъ и уволоки *поволочивъ* (БЛ, 10); съ того грунту три части черезъ *волочника* помѣрою отмѣривши и отдѣливши, паней Станиславовой Соколовской подалъ (АВАК, XIV, 340, 1586). Падатак, які плацілі за карыстанне зямлёй, называўся *уволочное*: Кгды ездили грабить за *уволочное* розных людей, которые не плачивали, стратили золот[ой] а асм[аков] еї (ГЮМ, I, 70, 1679).

У сучаснай беларускай мове слова *валока* ўжываецца са значэннем 'старая адзінка вымярэння плошчы': Хай ад пана зямлю адабралі, а то ў мяне якіх тры *валокі*, ды і то палавіну забралі (Галавач, I, 66); Падумаць толькі, калісьці лук'янаўскі Бакаляр прапіў цэлую *валоку* зямлі (М. Танк, «Полымя»,

1967, № 3, 127). Яно мае таксама значэнне 'зямельны ўчастак, поле': ...згубіў я сваю дзесяціну загонамі паміж кулацкіх *валок* (Галавач, I, 79); Бывай жа, лецейка, бывай, бывайце, родныя *валокі* (Колас, IX, 35).

З асаблівасцю падзелу зямлі звязана ўтварэнне дзвюх адзінак вымярэння плошчы *следъ* і *рѣза*.

Следъ. Гэта адзінка выяўлена ў дакументах XV—XVII стст.: а передъ тымъ тая земля одна была, ани не поделена на пять *следовъ:* подъ тымъ Ондрейкомъ три *следы,* и под Онципоромъ два *следы* (РИБ, XXVII, 56, 1475); ...мы дали ему земли пустовъскіе у Волковыйскомъ повете — Кремяницького десятъка чотыры *следы* (РИБ, XXVII, 858, 1503). У помніках гэта слова выяўлена і са значэннем 'зямельны ўчастак': Митку Ильвовичу... чотыры *следы* пустыхъ (РИБ, XXVII, 25, 1471) [22].

Слова *следъ* набыло значэнне меры, відаць, таму, што перад гэтым яно мела значэнне 'знак', з якім ужываецца ў сучаснай мове. Як сведчыць М. Доўнар-Запольскі, на адной службе, якая мела пэўную колькасць зямлі і абкладалася пэўным падаткам, магло быць некалькі чалавек або сем'яў [23]. Пры падзеле зямлі для аднаасобнага карыстання і выканання павін-

---

[22] З такім значэннем слова *следъ* аналізуе І. Шадурскі ў артыкуле «Назвы землеўладанняў у старажытнай беларускай мове» (Беларуская мова. Мінск, 1965, стар. 93).

[23] М. Довнар-Запольский. Государственное хозяйство Великого княжества Литовского при Ягеллонах. Киев, 1901, стар. 213.

насці службу (плошчу зямлі) размячалі на асобныя ўчасткі: сахою рабіўся знак — след сахі. Пры падзеле сенажаці рабіўся іншы знак — пратоптвалася сцежка. Зямельны ўчастак аднаго землекарыстальніка, пазначаны следам, стаў называцца *следъ*. Паколькі зямельныя ўчасткі былі больш-менш пэўнай велічыні, за гэтым словам замацаваўся пэўны колькасны эквівалент. Яно стала абазначаць меру плошчы.

Рѣза. Гэта слова асабліва часта ўжываецца як мера ў час правядзення «Уставы на валокі». Гэта не выпадкова. Пры падзеле зямлі на валокі адну валоку зямлі звычайна выдзялялі ў трох палях, відаць, таму, што ў той час шырока ўжывалася трохпольная сістэма севазвароту. Адзін з трох участкаў называўся *рѣза*.

Слова *рѣза* ўтварылася ад дзеяслова *рѣзати*, які меў, апрача асноўнага, яшчэ і значэнне 'аддзяляць', у даным выпадку зямлю. У адну *рѣзу* мералі па 11 маргоў (калі валока складалася з 33 маргоў): въ томъ селѣ волокъ осѣлыхъ грунту среднего шесть и *рѣзы* двѣ (АВАК, XIV, 79, 1563); ...в кожъдомь полю по пети *резъ*, с которыхъ одна маеть в собе меть моркъговъ одинънадцать (Доўн.-Зап., 1905, 78, 1564). Гэта слова ўжывалася са значэннем 'зямельны ўчастак': Жита нажато въ копахъ копъ 548, а нежатого жита на *рѣзахъ* двадцати (АС, IV, 231, 1596). З такім значэннем яно выяўлена (у форме *рэз*) у фальклорных запісах А. Сержпутоўскага: Зірнеш і дзівішся, чаму гэта багатага чорт не бярэ, чаму гэта ў яго і гаўяда цэла, чаму гэта град дойдзе да

яго *рэза* да й закруціць назад ці заверне ўбок (Сержп., 1956, 236). Са значэннем 'паласа, ніва' яго зарэгістраваў М. Каспяровіч (269).

ПРЫЛАДЫ ПРАЦЫ — АДЗІНКІ ВЫМЯРЭННЯ

Соха — адзінка вымярэння плошчы: Ивашку Судимонътовичу десеть чоловековъ а дворецъ на Бердовъци, а поведал на три *сохи* земли... (РИБ, XXVII, 8—9, да 1467 г.); Остапку земля пустая, безъ наследка, Бридинова, тол[ь]ко дей на *соху* (РИБ, XXVII, 31, 1475).

У старажытнасці *саха* як прылада апрацоўкі зямлі была падатковай адзінкай. Так, М. Гарбачэўскі пісаў, што *посошное* — адзін са старажытных падаткаў, які сяляне плацілі ад колькасці сох у гаспадарцы (Гарб., 270). Са значэннем 'абкладная і кадастравая адзінка' зарэгістраваў слова *соха* Г. Кочын (336). Такі падатак узнік, відаць, таму, што колькасць зямлі, якая належала гаспадарцы, залежала ад колькасці прылад працы, у даным выпадку сох, а колькасць прылад працы — ад колькасці рабочай жывёлы, г. зн. ад магчымасці гаспадаркі апрацаваць пэўную колькасць зямлі (параўн. *соха* — адзінка колькасці рабочай жывёлы). Вызначэнне колькасці зямлі па наяўнасці рабочай жывёлы паказвае, што гаспадарка магла карыстацца той колькасцю зямлі, якую магла апрацаваць. Так слова *соха* набыло метрычнае значэнне.

Ёсць і другое меркаванне адносна ўтварэння такога значэння. *Соха* магла абазначаць

такую плошчу зямлі, якую можна апрацаваць адной сахой за рабочы дзень.

Колькасныя эквіваленты, якія ўдалося выявіць, не даюць магчымасці аднастайна тлумачыць спосаб утварэння метрычнага значэння. Так, У. Даль паказаў, што *соха* мела ад 600 до 1800 дзесяцін (Даль, IV, 283). Такая плошча зямлі пацвярджае першую думку. Аднак А. Ханенка лічыць, што ў дзесяціне было 2,5 *сахі*, г. зн. адна *саха* раўняецца 0,4 дзесяціны, што прыблізна адпавядае плошчы, якую можна ўзараць за дзень [24].

Характэрна, што ў дакуменце, напісаным на тэрыторыі Украіны, са значэннем меры плошчы ўжываецца слова *плугъ:* Билъ намъ чолом писаръ нашъ наместникъ володимерский и скерстомонский пан Ѳед. Янушковичъ и прохалъ в нас земли пашное Красноселское на одинъ *плугъ* и сеножати нашое... (АЛРГ, 105, 1503). Гэта слова з такім самым значэннем ужываецца ў наш час на Беларусі: Зямлі засталося араць на два *плугі,* ні так ужо і многа (Бабровічы).

Закрой — магчыма, адзінка даўжыні (шырыні): ...а сей загонъ или града маетъ мѣти въ собѣ по *закроевъ* седми (АС, VI, 309, 1502).

Метрычнае значэнне мела гэта слова і ў рускай мове, яно абазначала адлегласць, на якой прадмет хаваецца на моры за гарызонт (Бурнашоў, I, 221). Мала верагодна, што беларуская і руская мера аднолькавага паходжання, бо ў цытаваным прыкладзе ўпамі-

[24] А. Ханенко. Исторический очерк межевых учреждений..., стар. 12.

паецца *загонъ* — параўнальна нешырокая паласа зямлі. У старабеларускай мове слова *закрой* мела яшчэ значэнне 'дрэва ў сасе, ці лапатка, па якой зямля, паднятая нарогам, кладзецца ўбок' (Гарб., 392). Улічваючы гэта значэнне, можна дапусціць, што *закроем* магла называцца баразна, яе шырыня. Нашы вылічэнні шырыні *закроя* паказалі 35 сантыметраў, што прыблізна адпавядае шырыні баразны.

ЗАПАЗЫЧАНЫЯ АДЗІНКІ ВЫМЯРЭННЯ ДАЎЖЫНІ І ПЛОШЧЫ

У помніках старабеларускага пісьменства выяўлена нешматлікая група слоў — мер даўжыні і плошчы, у якіх метрычнае значэнне ўтварылася іншым шляхам, чым у старабеларускіх мерах. Гэтыя словы з метрычным значэннем былі запазычаны з іншых моў.

Моргъ (*моркгъ*) — адзінка вымярэння плошчы: Огородники при дворехъ нашыхъ мають быти, даючы кождому по търи *моркги* земли (РИБ, XX, 552, 1557); вымѣрилъ... волоку одну супольную и *моркговъ* чотырнадцать (АС, V, 69, 1641).

Гэта слова запазычана, магчыма, праз польскае пасрэдніцтва з метрычным значэннем з нямецкай мовы, дзе *Morgen* — 'раніца', а таксама 'зямельны ўчастак, апрацаваны за раніцу', відаць, ад усходу сонца да снядання. Такая мера ўжывалася на Украіне. Яна ўваходзіла ў дзяржаўную сістэму мер Вялікага княства Літоўскага і была роўнай 0,71 га.

У старабеларускай мове слова *моргъ* ужывалася са значэннем 'зямельны ўчастак', пры-

чым такое значэнне выяўлена ў помніку, датаваным 1386 годам, што сведчыць пра яго ранняе запазычанне: Се язъ великий князь Дмитрей Олгирдович помолися есми Богу и святой Богородицы... Гнидк..., и озера и *морги*... (АЗР, I, 22). Зямельныя ўчасткі адрозніваліся месцазнаходжаннем, спосабам іх выкарыстання і вымярэння, таму ў помніках трапляецца *моргъ польный, сѣножатный, лѣсной, гуменный* і інш.

У старабеларускай мове ўжывалася група вытворных ад слова *моргъ*, утварэнне якіх звязана з падзелам зямлі — *моркгованый, моркговань, моркговати, выморкгованый, выморкговань, выморкговати, зморкговати, зморкговань, поморкгованый, моркговщина*, а таксама *моркговое* — 'плата за карыстанне зямлёй' [25].

У сучаснай беларускай мове слова *морг* ўжываецца ў творах старэйшых пісьменнікаў або як гістарызм: Двор Няслаўскіх быў не надта вялікі, але і не малы. Меў ён *маргоў* пад трыста раллі ды з пяцьдзесят сенажаці (Мурашка, 213); Прымы ў яго нясытыя: *морг* поля і хата на курынай ножцы (Брыль, I, 22). Факты сучаснай мовы сведчаць, што яно выходзіць з актыўнага ўжывання.

Ланъ — адзінка вымярэння плошчы: ...ино мы з ласки нашое на его чоломбитье то вчинили, придали есмо ему к тому войтовству тры *ланы*, а корчму, вольную (АЛРГ, 176, 1521); тамъ же пашни дворной *лановъ* два... (АВАК, XIV, 187, 1576).

---

[25] А. М. Булыка. Даўнія запазычанні беларускай мовы. Мінск, 1972, стар. 207—208.

Гэта слова са значэннем адзінкі вымярэння ўжывалася ва ўкраінскай, рускай, польскай, чэшскай мовах. Як мяркуе В. Махэк, старачэшскай мовай яно было запазычана ў X ст. з нямецкай разам з сістэмай землекарыстання. Магчыма, што з нямецкай яно прыйшло ў старабеларускую праз польскае пасрэдніцтва.

У залежнасці ад таго, якой плошчай зямлі карысталіся розныя ўладальнікі, ужываліся розныя ланы: франконскі (большы—50 маргоў, меншы — 40 маргоў); нямецкі — 43 маргі; польскі кмецкі (большы — 21 морг, меншы — 6 маргоў); рэвізскі — 30 маргоў; хелмінскі (кракаўскі) — 90 маргоў [26].

У сучаснай беларускай мове слова *лан* са значэннем адзінкі вымярэння не выяўлена. Яно мае толькі значэнне 'ўчастак зямлі, палетак': У даўнія часы панавалі над краем два свінапасы, і, падзяліўшы на двое ўсе *ланы*, адзін пасвіў свінні, а другі бараны (Багушэвіч, 126). М. Клышка ў адзін сінанімічны рад ставіць словы *поле, ніва, палетак, лан* [27].

Миля — адзінка вымярэння даўжыні (адлегласці): Даемъ теж доброволенство всим мѣщаном брати дерево на будоване домов их и теж на кухню дрова в борех и в лѣсех и въ гаехъ наших около мѣста за три *мили* въ офановѣ или громшевью (СДГА, 5, 1501); А што ся дотычеть Грезское волости, которая волость на другую сторону подъ Случескъ отъ Троковъ больши сорока *миль*, тамъ тежъ есми посылалъ служебниковъ своихъ (АС, I, 41, 1536).

[26] С. Гольдштейн. Польско-литовские древности, стар. 138.

[27] «Полымя», 1967, № 3, стар. 231.

На думку Я. Карскага, слова *миля* прыйшло ў старабеларускую мову з верхненямецкай праз польскае пасрэдніцтва [28]. Паходзіць жа яно з лацінскай мовы, дзе словазлучэнне *mille passus* мае значэнне 'тысяча крокаў'. Відаць, слова *миля* было запазычана з метрычным значэннем, бо з іншымі ў старабеларускай мове не выяўлена.

Самае ранняе ўжыванне гэтага слова ва ўсходнеславянскіх пісьмовых помніках адносіцца да X ст. (Сразн., II, 141), г. зн. яно было запазычана ў агульнаўсходнеславянскі перыяд. *Миля* ўваходзіла ў сістэму мер Вялікага княства Літоўскага і складалася з пяці вёрст: А так мы на повесть водлугъ сведомья ихъ тую *милю* отъ озера Зміева до мосту Замъкового шнуромъ мерали, ино знашлося въ той *мили* пять верстъ, а въ кажной версте вымерили есмо по осми сотъ сажонь без дву сажонъ (АВАК, XVII, 349, 1541).

У старабеларускай мове ўжывалася слова *помильное* са значэннем 'плата фурманам': А если бы подводник своимъ возомъ двемя конми повез, тогды от воза и от коней двух на милю по три грошы мает быти плачоно: а еслибы подводник на томъ же кони и назад гонца понеслъ, ино быти ему *помилное* и назадъ по тому-ж (БА, III, 74, 1595).

Миля са значэннем адзінкі вымярэння даволі часта трапляецца ў фальклорных запісах мінулага стагоддзя: Отдай мене бацька подалечей отъ себя — семъ *миль* боромъ исьци а осьмую моремъ плысьци (Шэйн, I, 1, 247);

[28] Е. Карский. Белорусы. Введение..., стар. 155.

Сцюдзёная роса пала, пусци мене домовъ, пани; — мое домы далёкіе, переходы великіе, а семь *миль* горою ици, а восьмая долиною... (Зап., 25). Гэта слова ўваходзіць у склад некаторых прыказак: «Старцу *міля* не круг»; «За адным абедам сем *міль* едам» (апошняя запісана ў в. Хідра Пухавіцкага р-на).

У старажытнасці ўжываўся яшчэ адзін спосаб вызначэння плошчы — па колькасці высеянага збожжа (ворная зямля, лес, кустоўе) і накошанага сена (сенажаць).

Для таго каб засеяць пэўную плошчу зямлі, трэба мець пэўную колькасць збожжа. Ведаючы гэту колькасць, можна прыблізна вызначыць плошчу зямлі. Звычайна плошча вызначалася колькасцю збожжа, якое змяшчала бочка, сявальня, сявалка: ...поля его на десеть *бочокъ* (РИБ, XXVII, 738, 1499); Тежъ купилъ землицу пашную у Васка Мордасовича на тридцать *бочокъ*... (Бярш., 65, 1503); ...продали есми ниву свою отчизную... сѣтца на *солянку* всего и съ кустовемъ (АС, VIII, 125, 1523); А семая нива... к себреному лѣсу, на *сѣвальню* (АВАК, XIV, 351, 1589).

Як сведчыць М. Доўнар-Запольскі, адной бочкай збожжа засявалі морг зямлі [29].

Плошча сенажаці вызначалася праз колькасць накошанага сена (на воз, на стырту, на стог): А въ Пекарова поля... сеножати лѣсничого на три *стырте*. При Кирсне болотѣ сѣножать на семъ *стоговъ* (РКЭ, 37, 1559); сеножатей на *возовъ* сто (ДМ БССР, 20336, 1624).

[29] М. Довнар-Запольский. Государственное хозяйство..., стар. 215.

НАЗВЫ АДЗІНАК ВЫМЯРЭННЯ СЫПКІХ І ВАДКІХ РЭЧЫВАЎ

СЛОВЫ З ПЕРШАПАЧАТКОВЫМ ЗНАЧЭННЕМ 'ПАСУДЗІНА', 'ЁМІСТАСЦЬ'

Назвы адзінак вымярэння, якія мелі першапачатковае значэнне 'пасудзіна', 'ёмістасць', складаюць самую вялікую групу сярод мер сыпкіх і вадкіх рэчываў. Практычна бадай-што кожная гаспадарчая пасудзіна беларускага селяніна магла служыць меркай і адпаведна адзінкай вымярэння. Аднак ступень тэрміналагізацыі назваў пасудзін, якія сталі адзінкамі вымярэння, неаднолькавая. Вызначэнне ступені тэрміналагізацыі—справа даволі складаная ў сувязі з недастатковай колькасцю матэрыялаў у помніках, таму гэтыя адзінкі нельга разглядаць у парадку, які залежаў бы ад ступені тэрміналагізацыі таго ці іншага слова як адзінкі вымярэння. З-за гэтага ў раздзеле прыняты алфавітны парадак аналізу лексем, і толькі ў асобных выпадках указваецца, ці ўваходзіла тая ці іншая адзінка ў сістэму мер Вялікага княства Літоўскага або ў сістэмы мер асобных гарадоў гэтай дзяржавы.

Антелокгъ — адзінка вымярэння вадкасці (ужывалася рэдка, выяўлена толькі ў адным дакуменце): Крыштофъ Заливский... съ Подгорья мѣлъ вина полкуфковъ 12 и *антелокги* 2... (АС, III, 291, 1583).

На думку А. Брукнера, слова *антал* (*antał* — бочачка віна), якое ўжывалася ў польскай мове, утварылася ад *анталэк,* запазычанага з венгерскай мовы (Брукнер, 6). *Антал* 'бочачка віна, у якую месцілася 60 бутэлек' ужывалася ў рускай і ўкраінскай мовах (Грынч., I, 8; Даль, I, 17). Магчыма, што слова *антелокгъ* прыйшло ў старабеларускую мову непасрэдна з венгерскай, пра што сведчыць яго фанетычнае аблічча і той факт, што віно на Беларусь прывозілася з Венгрыі. На думку М. Гарбачэўскага, у *антал* месцілася чвэрць бочкі (Гарб., 22).

Барил[*а*] — адзінка вымярэння вадкасці: отъ *барилы* мальвазеи, мушкателю и вина волоского по 16 грошей (АЗР, III, 194, 1576); Еско Шилимовичъ... мѣлъ товаръ зъ Люблина вина *барилъ* 4 (АС, III, 304, 1583).

М. Гарбачэўскі адносіць *барил*[*а*] да польскіх мер. Між тым гэта слова з метрычным значэннем ужывалася не толькі ў старабеларускай, але і ў рускай і ўкраінскай мовах. Я. Карскі лічыць, што яно было запазычана з сярэднелацінскай мовы праз французскую [1]. У старабеларускай мове ўжывалася таксама памяншальная форма *барилка,* але са значэннем 'пасудзіна': Начинье домовое: кади на вариво годныхъ семъ, *барилокъ* три, *барилка* по грошей два, а бочка по грошей три (АВАК, XIV, 508, 1594).

Велічыня *барилы* — 20 гарцаў (ГЮМ, VIII, 50).

---

[1] Е. Карский. Белорусы. Введение..., стар. 151.

У сучаснай беларускай мове памяншальная форма *барылка* (*барыльца*) мае значэнне 'невялікая бочачка'. Л. Малчанава піша, што ў некаторых мясцовасцях Беларусі так называюць пасудзіну, падобную на біклагу[2]. *Барыла* са значэннем 'пасудзіна' зрэдку ўжываецца ў літаратурнай мове: ...чуў Міканор, бацька толькі чакае, каб ён сышоў куды-небудзь, каб разліць з *барыла*, што ў склепе, па пляшках (Мележ, 226).

Белецъ — адзінка вымярэння вадкасці: дал был горелки до Смоленска, *белцов* петнадцат арендарских по пети гршей (АВАК, XXXIX, 392, 1579); ...нашол дей есми у Истомы Шыреіавича горелки *белецъ*, которую менилъ быть на свою потребу, а не на шинкъ (ГЮМ, XXXII, 32, 1578).

Са значэннем адзінкі вымярэння гэта слова ўжывалася ў польскай мове (Карл., I, 112). Паходжанне яго не зусім зразумелае. Магчыма, што гэта трансфармаванае *кубелец* (*къбелецъ* — памяншальная форма слова *къбелъ* 'кубел').

У сучаснай беларускай мове слова *белец* мае значэнне 'вялікае карыта, з якога пояць жывёлу', 'бочка, у якой заліваюць лугам бялізну' (Горск Бярозаўскага р-на Брэсцкай вобл., паведаміла Л. Ф. Шаталава), а таксама 'адзінка вымярэння': У яе некалі тры *бельцы* масла стаяла (Бягомль). У апошнім выпадку значэнне меры аказіянальнае, асноўнае — 'невялікая бочачка'.

---

[2] Л. Молчанова. Материальная культура белорусов. Минск, 1968, стар. 221.

Берестень—адзінка вымярэння мёду (ужывалася рэдка): Два *бересни* меду (ДМАМЮ, 137, 1563). Гэта слова выяўлена ў помніках і са значэннем 'пасудзіна': ...и на тот часъ ему молвилемъ, абы тот *берестен* масла пробил и огледел... (АВАК, XXXIX, 368, 1579).

У слоўніку У. Даля слова *берестень* змешчана ў артыкуле *береста*. У. Даль лічыць, што так называлася пасудзіна з бяросты, а ў некаторых мясцінах — гаршчок, аплецены бяростай (Даль, I, 83). Ва ўкраінскай мове *берестянка*—'каробка з бярозавай кары' (Грынч., I, 52). У слоўніках У. Дабравольскага і М. Каспяровіча *берестень (берасьцень)* — 'гаршчок, аплецены бяростай' (Дабр., 26; Касп., 38). Такім чынам, першапачатковае значэнне гэтага слова — 'пасудзіна з бяросты або аплеценая бяростай', ад якога ўтварылася значэнне меры.

Бочка — адна з асноўных, самых ужывальных мер сыпкіх рэчываў, вадкасці, адзінкавых прадметаў накшталт селядцоў, масы рэчыва (часцей — мяса): Мещанину Ковенскому Захари 10 *бочокъ* ръжы в городничого Ковенъского (РИБ, XXVII, 228, 1486); Въ другомъ свирнѣ... овса *бочок* 6... (АС, I, 146, 1571); пива *бочокъ* чотыри... ечменного *бочка* 1, ...ярічного пива двѣ *бочки*... (АС, IV, 239, 1571); Панасъ Сергуновичъ... мѣлъ съ Торуня селедцовъ *бочокъ* 8 (АС, III, 289, 1583); ...взіал по весне *бочку* міаса стіаги пол третіа (ГЮМ, XXII, 288).

Гэта слова ўжывалася таксама з агульным значэннем 'мера сыпкіх рэчываў': ...мають быти *бочъки* въ местехъ торговые... (Устава,

18, 1557). Такое значэнне яно набыло таму, што *бочка* была адна з асноўных адзінак вымярэння сыпкіх і вадкіх рэчываў у сістэме мер Вялікага княства Літоўскага. Ужывалася яно і з першапачатковым значэннем 'пасудзіна': ...и к тому (пороху. — *К. С.*) *бочка* девятаянадцать на пядь неполна, — вага чинить каменей 97 (ДМАМЮ, 123, 1560).

Шырока ўжывалася са значэннем адзінкі вымярэння вытворнае *полубочокъ:* Ино вжо... и пятнадцать *полубочковъ* взялъ, поведаеть, отъ пана Станислава Петровича, старосты городенского шесть сот *полубочковъ* безъ десяти (АЛРГ, 146, 1511); десеть *полубочковъ* пива... (ВС, 342, 1699). Гэта адзінка адрознівалася ад іншых, утвораных пры дапамозе скарочанай формы лічэбніка *половина (пол-),* тым, што абазначала меру ў два разы большую, чым бочка: Отъ сего часу маеть быти мѣра *полубочокъ* Виленский такъ великъ, *который бы въ себѣ несъ двѣ бочки,* въ которыхъ бы было въ обѣюхъ осьмъ корцовъ ровныхъ (Нас. АУ, 332, 1547).

Велічыня бочкі як адзінкі вымярэння ў розных мясцінах Беларусі была неаднолькавая, пра што сведчыць ужыванне гэтага слова з азначэннямі, якія паказваюць прыналежнасць меры да той ці іншай мясцовасці: «*бочка меры Виленское, Минское, Лукомъское, Крокиновское, бочка посвальская*» і інш. Неаднолькавая была бочка і для рознага характару вымярэння, і гэта таксама выклікала неабходнасць ужываць складаную назву — *бочка мерная, ратушная, торговая, местъская, дворная.*

Статутам Вялікага княства Літоўскага *бочка* была зацверджана як асноўная дзяржаўная адзінка вымярэння, якая складалася з 4 карцоў. Паводле пастановы сейма 1766 г. яна павінна была месціць 144 гарцы малыя, або 72 вялікія (406, 54 літра) [3].

Слова *бочка* — агульнаславянскае, аднак адносна яго паходжання няма адзінай думкі. Так, А. Праабражэнскі прыводзіць думку Міклашыча і Уленбека пра запазычанне яго з нямецкай мовы, аднак сам ён падтрымлівае М. Фасмера, які лічыў, што гэта слова запазычана з сярэднегрэчаскай мовы, а апошняй — з лацінскай (Праабр., I, 40). Н. Гараеў і М. Шанскі лічаць, што гэта слова ўтварылася на глебе славянскай мовы і генетычна звязана са словам *бок*.

Мераю *бочка* была ў Польшчы і на Украіне.

Значэнне адзінкі вымярэння слова *бочка* мае і ў сучаснай беларускай літаратурнай мове, але не з'яўляецца метрычным тэрмінам: Адзін — падараваў клінок, другі — сталёвага каня, а трэці — *бочак* сто віна, з калосся залаты вянок (М. Танк, «Полымя», 1967, № 2, 119); Гаспадарлівы Ашман прыехаў тады ў пушчу на кані... і, узваліўшы на воз цэлую *бочку* дзёгцю, задаволены вярнуўся дахаты (Паслядовіч, I, 159).

З *бочкаю* як адзінкай вымярэння звязана ўтварэнне яшчэ дзвюх мер — *краковка* (*бочка краковка*) і *солянка* (*бочка солянка*): По-

---

[3] С. Гольдштейн. Польско-литовские древности стар. 140.

дле того свирна клѣтка, въ ней гречыхи *краковекъ* шесть (АС, IV, 292, 1593); ...якель або пшона фасъ ни (18), въ нихъ *бочокъ краковекъ* ог (73) (АВАК, XIV, 651, 1601); Тежъ пречоныи братья Радивилове поступили тому пану Кгаштолту некакіе роли войтовскіе ку сѣнью тридцати *бочокъ солянокъ* (АС, I, 29, 1536); Жита засѣяно *солянокъ* пятьдесятъ шесть (АВАК, XIV, 78, 1563).

Утварэнне такіх адзінак звязана з тым, што ў розных мясцовасцях ужываліся адзінкі рознай велічыні. Як ужо адзначалася, у тых выпадках, калі трэба было дакладна ўказаць велічыню меры, слова *бочка* ўжывалася з азначэннямі, якія паказвалі прыналежнасць яе да той ці іншай мясцовасці ці, дакладней, мясцовай сістэмы мер, або асаблівасць бочкі паводле яе прызначэння. З азначэннем ужывалася *бочка* як адзінка вымярэння, якая належала да польскай (кракаўскай) сістэмы мер, а таксама *бочка,* у якой прывозілі соль. Гэтыя адзінкі вымярэння абазначаліся складанымі назвамі (*бочка краковка, бочка солянка*). У далейшым другі кампанент складанай назвы стаў абазначаць асноўнае значэнне і замацаваўся ў мове.

Пра велічыню *бочки краковки* ў XVII ст. у помніках старабеларускага пісьменства канкрэтных указанняў не выяўлена. Што ж да велічыні *солянки,* то ёсць розныя меркаванні. М. Гарбачэўскі піша, што *solanka* — 1/6 бочкі, «мера, якой у старажытнасці мералі соль і бульбу» (Гарб., 336). Ва ўказальніку да т. XIV АВАК *солянка* — 1/4 бочкі, а да т. XVII — 1/6 бочкі. Нарэшце, у зборніку да-

кументаў «Беларусь у эпоху феадалізму» ў першым томе яна прыраўноўваецца да 1/8 бочкі, а ў другім — 1/6. Дз. Пахілевіч лічыць, што «бочка уставная (малая или *солянка*) = 4 корцам краковским = 2 шанкам = 102 литрам» [4].

Назву *солянка* мела і другая адзінка вымярэння, значна меншая за бочку-салянку: тымъ бобровникомъ нашымъ здавна... хаживало с кожъдого дыму... по чаши круп, а по двою куровъ, а по *солянъце* соли, а по кошу маку... (БА, II, 143, 1533). Улічваючы тое, што на Беларусі соль не здабывалася, а прывозілася, а таксама велічыню іншых падаткаў, названых у дакуменце, нельга сказаць, што падатак соллю давалі салянкамі-бочкамі. Хутчэй за ўсё за адзінкі вымярэння была прынята колькасць солі, якая месцілася ў невялікай пасудзіне, у якой зберагалася соль. Такім чынам, у старабеларускай мове слова *солянка* абазначала дзве адзінкі вымярэння — адну большай, а другую меншай велічыні з рознай ступенню тэрміналагізацыі.

У сучаснай беларускай мове ў дыялектах гэта слова ўжываецца са значэннем 'невялікая пасудзіна на соль': *Салянка* дзераўяна, туды й цяпер соль сыплем (Морач, МКДЭ МПІ). М. Каспяровіч зарэгістраваў яго са значэннем 'мера сыпкіх рэчываў на 4 чацверыкі' (першае метрычнае значэнне старабеларускай мовы) (Касп., 275).

Ведро — адзінка вымярэння мёду: дають 9 *вѣдеръ* меду (АЗР, I, 37, 1415); ... дани идеть

---

[4] Д. Похилевич. Крестьяне Белоруссии и Литвы в XVI—XVIII вв. Львов, 1957, прилож. II.

сорок грошей, а полюдья две *ведре* меду а две куници... (РИБ, XXVII, 171, каля 1497 г.); меду дей прѣсного в кадце и в коробце полтретя *ведра* (Груш., 133, 1562)

А. Брукнер лічыць гэта слова праславянскім (Брукнер, 610). В. Віннік, спасылаючыся на К. Машыньскага, піша, што *ведро*, якое было таксама адзінкай вымярэння ва ўкраінскай мове, адносіцца да самых старых народных мер, якія атрымалі сваю назву ад назвы пасудзіны [5].

У старабеларускай мове са значэннем меры ўжывалася памяншальная форма *ведерко*: ...две *ведерки* меду пресного дають (РИБ, XXVII, 25, 1471). Зарэгістраваўшы гэту форму, І. Насовіч растлумачыў яе значэнне як 'пітная мера, паўвядра': *Ведерокъ* не маютъ помѣривати (Нас. АУ, 27).

Ведро запісана ў якасці асноўнай адзінкі вымярэння мёду ў «Даравальнай грамаце валкавыйскім мяшчанам на Магдэбургскае права»: ...далъ и даровалъ пречоному мѣсту... помѣрное медовое, што зоветься *ведро,* чимъ медъ мѣрять (АЗР, II, 11, 1507). Гэта мера была асноўнай у сістэме мер Вялікага княства Літоўскага, яе велічыня паводле пастановы сейма 1766 г. — 4 гарцы (прыблізна 11,2924 літра [6]).

У сучаснай беларускай мове слова *вядро* значэнне меры не страціла, але не мае тэрмі-

---

[5] В. Винник. Назви одиниць виміру і ваги..., стар. 105.

[6] С. Гольдштейн. Польско-литовские древности, стар. 141.

налагічнага характару: А калі яны садзіліся за стол ды ставілі цэлае *вядро* мёду, яны запускалі туды цэлыя скібы хлеба і бралі адтуль столькі мёду, колькі мог змясціць на сабе хлеб (Колас, V,104); За дзень па ягадзе на *вядро* нацыркала, дзе ты сёлята боляй возміш? (Бабровічы).

З вытворных ад гэтага слова ўжываецца прыметнік *вядзерны* 'ёмістасцю з вядро': Яшчэ з раніцы ў суботу цётка Фядора ставіць у печ *вядзерныя* чыгуны лугу (А. Васілевіч, «Полымя», 1967, № 3, 25). І. Насовіч зарэгістраваў слова *ведзёрникъ* са значэннем 'пасудзіна памерам з вядро': каженъ дзень варишъ семъѣ *ведзёрникъ* горщокъ варива (Нас, СБН, 48).

Гарнецъ (*кгарнецъ*) — адна з асноўных адзінак вымярэння сыпкіх і вадкіх рэчываў у сістэме мер Вялікага княства Літоўскага: ...купивши колько *гарцовъ* меду (АВАК, XX, 218, 1610); пива казали дать *кгарцов пять* (ГЮМ, I, 18, 1679).

Гэта слова са значэннем меры ўжывалася ў польскай і ўкраінскай мовах, а таксама ў рускай з часоў Пятра I (Грынч., I, 274; Брукнер, 135—136; Фасм., I, 394). І. Сразнеўскі выявіў яго ў помніках агульнаўсходнеславянскага пісьменства са значэннем 'пасудзіна' (Сразн., I, 216). На думку А. Брукнера, яно генетычна звязана са словам *garna* 'печ' (Брукнер, 135—136) і першапачаткова абазначала гліняную пасудзіну, абпаленую ў горне, печы. Значэнне 'пасудзіна' яно мела і ў старабеларускай мове: За направене и набиване *гарцовъ* трехъ, *полкгарцовокъ* двюх и кварты одной... (ГЮМ, X, 21, 1695). У гэтым прыкла-

дзе ўжываецца слова *полкгарцовка* 'пасудзіна на паўгарца', якое ўтварылася ад слова *полгарца,* што таксама мела значэнне меры.

У старабеларускіх пісьмовых помніках у пачатку слова *гарнецъ* звычайна пісалі дзве літары — *кг,* што сведчыць пра выбухны характар пачатковага гука *г.* Выбухны характар *г* паказвае, што слова запазычана з польскай мовы.

У старабеларускай мове ўжывалася яшчэ адно вытворнае ад слова *гарнецъ*—прыметнік *гарцовый* (*кгарцовый*)—'велічынёй (аб'ёмам) з гарнец': средняя коневъ цынова одна, *кгарцовыхъ* коновокъ цыновыхъ двѣ, коновка у полкгарца одна, *кгарцовыхъ* фляшекъ цыновыхъ две (АВАК, XIV, 957, 1590).

У сучаснай беларускай мове пераважна ў творах старэйшых пісьменнікаў *гарнец* ужываецца з наступнымі значэннямі:

адзінка вымярэння: Але на гэта трэба не менш *гарца* гарэлкі (Колас, IV, 143);

пасудзіна: І ў мяшок, пасля палкіх Надзіных слоў, сыпалі бабы вясковыя *гарцамі* жыта, ячмень, бульбу (Галавач, I, 174);

плата за памол у млыне і настаўніку за навучанне (апошняе значэнне выяўлена ў Я. Коласа): І толькі калі Міхал адсыпаў Паківачу належныя *гарцы,* а дзеці адышлі ад воза, млынар ціха спытаў у Кагута: — Бачыў?.. (Карткевіч, 1, 124); Пад вечар таго самага дня стараста сабраў *гарцы* і прывёз Лабановічу (Колас, IX, 95). Як паказваюць назіранні, гэта слова выходзіць з актыўнага ўжывання.

Ад слова *гарнец* 'плата за памол' утварыўся прыметнік *гарцавы* (збор) 'збожжа, сабра-

нае як плата за памол': ...Максім, паколькі якраз цяпер прыйшла прамкамбінатаўская трохтонка, адправіўся з *гарцавым* зборам на станцыю (Брыль, II, 84). Гэты прыметнік, а таксама *паўгарцовы* ўжываюцца са значэннем 'велічынёй (аб'ёмам) з гарнец': Наставіў кішэню, і ён мне насыпаў... *гарцавую* «жменьку» наганных патрончыкаў (Брыль, I, 155); Яны добра ведалі гэты *паўгарцовы* срэбны коўш, на якім было выразана тры сэрцы з надпісам Corda fidelium (сэрца прыяцеля) (Бядуля, III, 100).

Горщокъ (*горшокъ*) — адзінка вымярэння мёду і масла: меду прѣсного такъ рочного *горщокъ* великій, въ которомъ *горщку* есть ведерь двѣ (АС, IV, 239, 1571); за масла *горшковъ* два копу грошей (АВАК, II, 291, 1590). У пісьмовых помніках гэта слова выяўлена і са значэннем 'пасудзіна': За *горщокъ* великій до греня воды дали осм[аков] е͂ (ГЮМ, VIII, 147, 1691). Як мера яно ўжывалася ў стараўкраінскай мове: Тридцать сыровъ, два *горшки* масла (ІСУЯ, I, 580).

Н. Гараеў адносіць слова *горшокъ* да аднакарэнных са словам *гарнец*. На яго думку, гэтыя два словы маюць адну словаўтваральную аснову—*горн* (Гараеў, 76). Такім чынам, першапачатковае значэнне як аднаго, так і другога вытворнага — 'пасудзіна, абпаленая ў горне'.

У фальклорных запісах мінулага стагоддзя слова *горшокъ* ужываецца з метрычным значэннем: Ня я прала, кума прала, а я памагала: за то кумѣ *горшокъ* крупъ и три куса сала (Зап., 548).

Глекъ (*глякъ*) — адзінка вымярэння вадкасці (алею): ...Гришка Ходоровичъ жаловал на учтивог[о] Мартина Раковича, иж он дей мне остал винен сорок *глеков* алею (АВАК, XXXIX, 514, 1579); ...продавать только 5 *гляков* алею (ГЮМ, VII, 340, 1583).

Гэта слова ўжывалася ў агульнаўсходнеславянскай мове, упершыню адзначана ў помніку 1117 г. (Сразн., I, 519). І. Сразнеўскі тлумачыць яго як 'пасудзіна', а ў ілюстрацыйным прыкладзе гэта слова ўжываецца са значэннем адзінкі вымярэння: Десять *глекъ* вина. А. Праабражэнскі лічыць, што генетычна яно звязана са словам *глей*, г. зн. першапачатковае яго значэнне 'пасудзіна з глею (гліны)', а час утварэння — агульнаўсходнеславянскі перыяд (Праабр., I, 125—126).

У старабеларускай мове слова *глякъ* мела тэрміналагічнае значэнне адзінкі вымярэння, пра што сведчыць такі прыклад: ...а *гляки* на продаванъе олею маютъ быти ровные, цехованые... (ГЮМ, VIII, 341, 1583). У дакуменце, з якога цытуецца гэты прыклад, *глякъ* зацвярджаецца як мерка пэўнай велічыні ў г. Магілёве. Аднак канкрэтную велічыню гэтай меры ўстанавіць не ўдалося.

У сучаснай беларускай мове слова *гляк* (*глёк*) мае значэнне 'гаршчок з гліны з вузкім горлачкам' (Янк., 1959, 60; Юрч., 1966, 66; Бяльк., 135).

Дежа (*дѣжка*) — адзінка вымярэння вадкасці, масла, рыбы: ...взяли полтораста щукъ рыбъ свѣжихъ, а *дежа* рыбъ солоныхъ... (Груш., 128, 1561); ...меду пресного бочка 1 полная, полтора вшатка, а *дежокъ* полныхъ 2

(АС, I, 145, 1571); ...въ первомъ въ том свирнѣ отъ лазни масла *дежок* 16 (АС, I, 146, 1571).

Гэта слова са значэннем 'пасудзіна' ведаюць многія славянскія мовы, М. Фасмер адносіць яго да праславянскіх. З такім значэннем у старабеларускай мове выяўлены памяншальныя формы *дежка, дежечка:* У городни пороху бочечка одна малая, яко бы на полъбарила, у другой *дежечце* ручничного пороху 20 фунтов... (ДМАМЮ, 92, 1547); Делва: кадь, стаговъ, фаска, бочка, или *дѣжка* (Бяр., 29).

Велічыня *дежи,* відаць, не была аднолькавая, бо гэта мера не была афіцыйна зацверджана. У асобных выпадках у помніках ёсць указанні на яе велічыню: На новой пивницы въ схованью взято дей масла такъ рочного *дѣжокъ* тридцать, в кождой дей *дѣжцѣ* по двѣ ведре (АВАК, III, 287, 1577).

У сучаснай беларускай мове слова *дзяжа* ўжываецца са значэннем 'пасудзіна, у якой заквашваюць цеста на хлеб'.

Кадь (кадка) — адзінка вымярэння пераважна мёду, а таксама масла, агуркоў, капусты, соладу і інш.: У Верхе на Обушковыхъ дѣтехъ *кадь* меду (БАДГ, 2, 1463); ...в спижарни масла *кадокъ* шесть, и вядеръ две... (АВАК, XX, 137, 1598); Огородных речей в подклете: капусты *кадей* полторы солоное... (АВАК, XIV, 228, 1581); въ них идеть намъ дани по два бобры а *кадь* рыбы (РИБ, XXVII, 707, 1498). Ужывалася гэта слова і са значэннем 'пасудзіна': порозних *кадей* 13 (АС, I, 144, 1571). У «Лексіконе» П. Бярынды: Делва: *кадь...* (Бяр., 29). Такое значэнне яно мела ва ўсіх славянскіх мовах і, згодна з меркавання-

мі М. Фасмера, было запазычана праз грэчаскую мову (καδδικος 'жбан', 'вядро') з старажытнаяўрэйскай (Фасм., II, 157). Метрычнае значэнне мела гэта слова ў агульнаўсходнеславянскі перыяд, пра што сведчыць ужыванне яго як меры сыпкіх рэчываў у 1 Ноўгарадскім летапісе (Сразн., I, 1172).

Велічыня гэтай адзінкі ў розны час і ў розных месцах была неаднолькавая. Так, у XV ст. у *кадь* месцілася 5 пудоў мёду: двѣ *кади* меду по пяти пудовъ (АЗР, I, 103, 1483). У помніках трапляюцца кадзі на тры, дзесяць пудоў (АВАК, XXXIX, 539, 1579; АВАК, XXII, 237, 1566), на тры, чатыры *ушатки* (АС, IV, 239, 1571; АВАК, XIV, 228, 1581), на дзве, чатыры *медницы* (АВАК, XXII, 237, 1566; АВАК, VIII, 486, 1599), на дзве бочкі (АВАК, XX, 137, 1598). Такі разнабой велічыні *кади* звязаны, відаць, з тым, што гэта была даволі распаўсюджаная народная мера. Сведчанні пра яе афіцыйнае зацверджанне не выяўлены.

У сучаснай беларускай мове слова *кадзь* (*кадушка*) — 'пасудзіна' і 'адзінка вымярэння' (нетэрміналагічнае значэнне): Ета ж мы гуркі, капусту ў *кадушцы* солім (Хідра); У яе йшчэ *кадзь* ячменю і ліпаўка жыта ёсць (Бягомль).

Калдубъ — адзінка вымярэння мёду: ...взято меду прѣсного *калдубовъ* пять, в каждомъ дей *калдубѣ* по три ведри (АВАК, III, 287, 1577). М. Гарбачэўскі дае два значэнні гэтага слова: 'пасудзіна, выдаўбаная з цэлага кавалка дрэва' і 'мера сыпкіх і вадкіх рэчываў, асабліва мёду' (Гарб., 177—178). З розным фанетычным афармленнем яно ўжывала-

ся ў іншых славянскіх мовах: у рускай *кадолб, кадолбь* 'пасудзіна з кавалка дрэва', ва ўкраінскай *кадіб, кадівба* 'кадушка для захавання збожжа, мукі', чэшскай *kadlub, kadlubek,* польскай *kadlub* 'пасудзіна з цэлага кавалка дрэва', верхнелужыцкай *kadolb* 'комін' (Фасм., II, 157). Паходжанне і ўтварэнне яго не зусім зразумелае. Шырокае ўжыванне ў славянскіх мовах са значэннем 'пасудзіна' дае падставу сцвярджаць, што такое значэнне папярэднічала метрычнаму.

У сучаснай беларускай мове слова *кадаўб*[*а*] ўжываецца са значэннем 'пасудзіна на збожжа, муку, выдаўбаная з суцэльнага кавалка дрэва', а таксама 'глыбокая яма ў рэчцы' і 'калдобіна на дарозе' (Янк., 1959, 85—86; Бяльк., 217).

Карайманъ — адзінка вымярэння мёду: Пану Яну Довойновичу 12 *карайманов*ъ меду съ ключа Кіевъского (РИБ, XXVII, 205, 1441—1480); ...дани чотыри *кора*[*и*]*моны* меду пресного (РИБ, XXVII, 149, 1493). Гэта слова зафіксаваў І. Насовіч, растлумачыўшы яго як 'каробка з лубу ці кары, зробленая велічынёй з пэўную меру': *Карайманъ* меду (Нас. АУ, 173). У Дз. Празароўскага ёсць слова *караміонъ*, якое ён растлумачыў як 'гліняная пасудзіна'. Ён пісаў: «караміон, равный 3/4 медимна, который содержал в себе 2 амфоры, каждая по 1,167 ведр[а], был [равен] 1,764 ведр[а]»[7]. Магчыма, што *карайманъ* — гэта трансфармаванае слова *карамион,* запазыча-

[7] Д. Прозоровский. Древние меры жидкостей.— ЖМНП, 1854, III, стар. 248—249.

нае з грэчаскай мовы. У старабеларускай яно ўжывалася да XVI ст. У помніках пазнейшай пары не выяўлена.

Ковшъ — адзінка вымярэння сыпкіх рэчываў і вадкасці: ...бируть на нихъ з двухъ сохъ бочку муки, а бочку овса, а по два *ковшы* муки, а по два *ковшы* овса; ...медовой дани липечни 75, *ковшов* 2, тыхъ липечни у ведро пинское две, а в липечню *ковшовъ* десять, чинить меду ведеръ пинскихъ 37, пол и 2 *ковшика* (ДМАМЮ, 158, 1565). Гэта слова выяўлена ў помніках старабеларускага пісьменства і са значэннем 'пасудзіна': *Ковъшъ* и поварку и корецъ до кухни [купили] (ГЮМ, V, 135, 1688). З такім самым значэннем яно ўжывалася ў старарускіх помніках 1357—1359 гг. (Сразн., I, 1243), а таксама ў польскай мове. А. Брукнер выказвае меркаванне, што яно было запазычана з Русі, а Я. Карскі лічыць яго літоўскім (*kaušas*)[8]. Метрычнае значэнне яно мела ва ўкраінскай мове[9].

Помнікі старабеларускага пісьменства паказваюць, што *ковшъ* — афіцыйная адзінка вымярэння ў сістэме мер г. Пінска, яго велічыня — $^1/_{20}$ частка вядра.

У сучаснай беларускай мове слова *коўш* мае значэнне 'пасудзіна': *Каўшом* гарэлку пілі. Яшчэ ў аднаго ёсць *коўш*, дык да яго хадзілі пазычалі гарэлку піць (Бягомль), а таксама 'плата за памол у млыне': Сапраўды ён (Андрэй Лучанок. — *К. С.*) цікавіўся, як ягоны парабак Іван Шкворань браў *каўшы*

[8] Е. Карский. Белорусы. Введение..., стар. 134.

[9] В. Винник. Назви одиниць виміру і ваги..., стар. 109—110.

(Р. Сабаленка, «Полымя», 1971, № 1, 64). І. Насовіч запісаў дзве прыказкі, у якія гэта слова ўваходзіць у першую са значэннем 'мера', у другую — 'пасудзіна': Вясною коробъ воды, да *ковшъ* грязи, а восенню *ковшъ* воды да коробъ грязи (ОРЯС, 13); Коли медъ, дакъ *ковшомъ*. Упрек неуважительным, неумеренным за столом (ОРЯС, 64).

Колода — адзінка вымярэння мёду і збожжа: 2 *колодѣ* меду (АЗР, I, 37—38, 1417); Ловцу Гиревъцу 5 *колодъ* ржи в ключника Луцъкого (РИБ, XXVII, 294, 1488). З метрычным значэннем ужывалася гэта слова ў агульнаўсходнеславянскай мове — у Пераяслаўскім летапісе 996 г. (Сразн., I, 1255).

Слова *колода* ўжо ў старажытнасці вызначалася полісеміяй. І. Насовіч выявіў такія яго значэнні: 'вулей або колькасць мёду з цэлага вулля, або спецыфічная мядовая мера; хлебная мера; сувей; кайданы для калоднікаў' (Нас. АУ, 169). Аднак ён не адзначыў яшчэ двух значэнняў, якія гэта слова мела ў старабеларускай мове — 'калода (кавалак дрэва)' і 'пасудзіна'. Якраз апошняе паслужыла асновай для ўтварэння значэння адзінкі вымярэння. Этымалагічна гэта слова, якое ўжываецца ў іншых славянскіх мовах, М. Фасмер звязвае з дзеясловам *колоть* (Фасм., II, 293).

На думку К. Саханевіча, якую падтрымлівае В. Віннік, *колода* была спецыфічнай украінскай мерай старажытнай пары [10].

Корецъ — адна з асноўных адзінак вымярэння сыпкіх рэчываў у дзяржаўнай сістэме

[10] В. Винник. Назви одиниць виміру і ваги..., стар. 24.

мер Вялікага княства Літоўскага: позычилъ Юрьеви 20 *корцовъ* пшеницы (АЗР, I, 9, 1347); Сума овса циншового семьдесятъ *корцей* безъ полкорца (АС, I, 35, 1536); петрушки *корецъ* одинъ (АВАК, XIV, 228, 1581). Статутам Вялікага княства Літоўскага 1566 г. велічыня бочкі была зацверджана з чатырох карцоў: абы была бочка, *въ которой бочцѣ маеть быти чотыры корцы* мѣры нашое дворное ровныхъ безъ верху и трясенья (Статут 1566 г., раздз. III, арт. 30). У пастанове сейма 1766 г. гэта адзінка абазначалася словам *чвэрць*: на вымярэнне збожжа павінна быць аднастайная бочка, у якой *чвэрці* чатыры [11].

У старабеларускай мове слова *корецъ* ужывалася са значэннем 'пасудзіна': ...а потомъ у домужъ моемъ от клети замокъ отбившы, речи моих немало побрано и коробю узяли, у которой были хусты белые, ку тому питушок московских десет, *корец* зелезный, котлы два... (АВАК, XXXIX, 458, 1579); ковъшъ и поварку и *корецъ* до кухни (ГЮМ, V, 135, 1688).

Значэнне меры гэта слова мела ў рускай, украінскай, славенскай, чэшскай, польскай, палабскай мовах. М. Фасмер лічыць, што яно ўтварылася ад слова *кора* (Фасм., II, 325), г. зн. першапачаткова мела значэнне 'пасудзіна з кары'. Такой самай думкі прытрымліваецца і Д. Зяленін, які адмаўляе меркаванне Ліндэ і Д. Шапіры пра запазычанне са стараяўрэйскай мовы, бо, на думку Д. Зяленіна, не

[11] Volumina legum, t. VII. Petersburg, 1860, стар. 320.

можа быць, каб кніжнае слова так глыбока ўвайшло ў народную мову [12].

Магчыма, што метрычнае значэнне слова *корецъ* набыло ў агульнаславянскі перыяд, бо гэтым словам абазначалася мера ў многіх славян.

У Вялікім княстве Літоўскім *корецъ* быў роўны прыблізна 101 літру (4 карцы на бочку, а ў бочцы 406,7 літра).

У сучаснай беларускай дыялектнай мове слова *карэц* ужываецца са значэннем 'невялікая конаўка з ручкай', а ў літаратурнай выяўлена з метрычным значэннем: Прыйшла вясна для перамог і прынясла мячу спачын. І ўсе, хто мог, трымаў зачын — *карэц* віна (С. Панізнік, «Полымя», 1968, № 4, 92).

Коробъ (коробка, коробокъ) — мера сыпкіх, а таксама некаторых іншых рэчываў: Августа л̃ дня, за отвезене вапны, коробовъ пяти отъ ратушы к валу, дали [осмаков $\widetilde{i}$] (ГЮМ, X, 169, 1695); яблокъ содовыхъ полторы *коробки* великое... (Груш., 133, 1562). У помніках гэта слова выяўлена са значэннем 'пасудзіна': тамъ же было собрано и на одно мѣстце знесено скрынекъ тринадцать, кубловъ два, *коробокъ* две (АС, IV, 226, 1596).

Першае ўжыванне слова *коробъ* у помніках старажытнага пісьменства выявіў І. Сразнеўскі ў дакументах 1264—1265 гг. У прыкладах, якія цытуе І. Сразнеўскі, яно мае значэнне адзінкі вымярэння (Сразн., I, 1288). Гэта

---

[12] «Филологические записки», вып. 1—6. Воронеж, 1903, стар. 4.

слова ўжывалася ва ўкраінскай, рускай, а таксама ў іншых славянскіх мовах са значэннем 'пасудзіна' (Праабр., I, 357). А. Праабражэнскі адносіць яго да слоў з няяснай этымалогіяй. Ён выказвае думку, што гэта слова было запазычана з лацінскай мовы (*corbis* 'корзіна'), аднак невядома, праз якое пасрэдніцтва.

Шырокае ўжыванне гэтага слова са значэннем 'пасудзіна' ў славянскіх мовах дае падставу зрабіць вывад, што такое значэнне першапачатковае.

У сучаснай беларускай дыялектнай мове *кораб* — 'пасудзіна для пераноскі і захоўвання мёду і збірання рою' (ЛП, 336), 'вялікі кош з лучыны' (Бягомль), 'пасудзіна': Тады мы паелі з Парассяй і Яўменіхай той *кораб* малака (Бягомль), а таксама мера (нетэрміналагічнае значэнне): Ныклала поўны *кораб* яец — буду прадаваць (Бяльк., 230). Яно ўваходзіць у склад фразеалагізмаў «наверзці сем карабоў» 'нахлусіць, нагаварыць многа прыдуманага і абы-чаго, намалоць языком, намалоць лухты' і «нарадзіцца ў дзіравым корабе», 'быць нешчаслівым' (Янк., 1968, 230).

Кошъ (кошикъ) — адзінка вымярэння сушаных ягад («фикг» і «розынок»): Розинок великихъ бочки в̃ (2), въ нихъ *кошовъ* і̃ (10) (АВАК, XIV, 651, 1601); Розинокъ *кошъ* а̃ (I), фикги *кошики* в̃ (АВАК, XIV, 649, 1601).

Кошъ — асноўная адзінка вымярэння пры аптовым гандлі, запісаная ў прывілеях на Магдэбургскае права: ...продавати... фикги, розынъки — *кошемъ* (РИБ, XXVII, 741—742, 1499).

Як пішуць В. Мартынаў і А. Міхневіч, слова *кош* — агульнаславянскае, з праславянскага **kosjo* [13]. Першае яго ўжыванне выяўлена ў Астраміравым евангеллі І. Сразнеўскім са значэннем 'кош' (Сразн., I, 1035). З метрычным значэннем яно ўжывалася ў польскай мове (Карл., II, 493).

У сучаснай беларускай мове гэта слова ўжываецца з некалькімі значэннямі: 'пасудзіна'; 'сплеценая з лазы скрынка, якая ставіцца на воз для перавозкі сыпкіх рэчываў'; 'рыбацкая снасць; 'скрынка з дошак над жорнамі ў млыне, у якую засыпаецца збожжа' (Янк., 1966, 100). Як адзінка вымярэння ўжываецца таксама, але не мае тэрміналагічнага характару: Цётка Насця падпаліла ў печы, унесла ў хату *кош* бульбы і насыпала ў таз з вадой (Палтаран, 89). З такім значэннем ужываецца памяншальная форма *кошык*: Энзэ і сапраўды грунтоўны, — аполец сала, бохан хлеба, пара каўбас, з *кошык* бульбы і яблыкі (Брыль, II, 135).

Як сінонім слова *кошъ* з метрычным значэннем у старабеларускай мове ўжывалася *крошня*. Так, у прывілеі Навагрудку на Магдэбургскае права запісана: Купцы наши не будуть мѣти моцы инако товары свои продавати, а ни куповати, только подъ тою мѣрою нижей выписаною: ...фикги, розынки *крошнями*... (АЗР, II, 91, 1511). Як бачым, *крошнями* прадаваліся тыя самыя *фикги* і *розынки*, што і *кошемъ*. Аднак *крошня* ў помніках трапляец-

---

[13] «Маладосць», 1969, № 10, стар. 135.

ца значна радзей. Апрача прывілея, яна больш нідзе не выяўлена.

Гэта слова ўжывалася ў іншых славянскіх мовах: у рускай — 'плецены з прутоў кош', украінскай, славенскай, славацкай, чэшскай — 'кош', 'кораб', у польскай — 'скрынка, у якой носяць шкло' (Праабр. I, 393). У чэшскай мове з XII ст. яно мела значэнне 'мера солі' [14]. Паходжанне яго невыразнае. Ужыванне ў славянскіх мовах са значэннем 'пасудзіна (кош)' сведчыць, што такім было першапачатковае значэнне гэтага слова.

Кубелъ — адзінка вымярэння мёду (ужывалася рэдка): ...украдено меду пресного чотыри *кублы,* въ которыхъ важило меду по два камени (АВАК, XVIII, 109, 1592). Часцей гэта слова трапляецца ў помніках са значэннем 'пасудзіна': в томъ же спихлеру у двухъ кадках солоду ечменного бочокъ чотыри, хмелю фасы две, *кубъловъ* тощихъ тры (АВАК, XX, 137, 1598); ...*кублы* чотыри житныхъ, а в нихъ ечменю бочокъ дванадцать (ДМАМЮ, 138, 1563).

М. Фасмер, зарэгістраваўшы слова *кобел (кобл),* растлумачыў яго значэнне як 'мера сыпкіх рэчываў'. Ён прывёў таксама яго фанетычныя варыянты ў іншых славянскіх мовах, дзе яно мае значэнне 'чан, ушат, ведро, лохань'. На думку М. Фасмера, яно было запазычана з германскіх моў (сярэдне-верхненямецкае *kübel* 'чан') (Фасм., II, 267).

---

[14] A. Sedlaček. Paměti a doklady o staročeských mirách a vahách.— «Rozpravy Ceske Akademie Věd a Uměni». Praha, 1923, стар. 132.

У агульнаўсходнеславянскай мове з метрычным значэннем ужывалася слова *полѣкъбелие* 'палавіна кубла, хлебная мера' (Сразн., II, 1140). Прымаючы пад увагу гэта слова, можна лічыць, што *кубелъ* быў мераю ў агульнаўсходнеславянскі перыяд.

У сучаснай беларускай мове гэта слова мае значэнне 'вялікая пасудзіна для захоўвання збожжа' і 'адзінка вымярэння' (нетэрміналагічнае): А яна сваё: я зарок дала на гэта і на гару лезе ў *кубел* за палатном (Галавач, I, 147); Не вер бацьку: пчаляры ўсе скупыя. Яшчэ тую бяду каб скалануў, дык напэўна цэлы *кубел* мёду набраў бы (Брыль, I, 92).

Кузня — адзінка вымярэння мёду (ужывалася рэдка): ...дани чотыри карамоны меду пресного а два ведре, а две *кузни* меду (РИБ, XXVII, 149, 1493). З іншымі значэннямі, апрача метрычнага, гэта слова не выяўлена. Магчыма, што яно з'яўляецца аднакарэнным са словам *кузаў*, якое ўжываецца ў сучаснай беларускай мове. Так, у адным з апавяданняў, запісаным П. Шэйнам на Віцебшчыне, ужываецца слова *кужни*, магчыма, фанетычны варыянт *кузни:* Надрала я бяросты, нарабила *кужни* такіи, даю ў тыя *кужни* да стаўлю (Шэйн, II, 458). П. Шэйн растлумачыў гэта слова як 'кузовочки' і са спасылкай на «Опыт областного великорусского словаря» паказаў, што яно ўжываецца ў Кашынскім павеце Цвярской губерні і абазначае маленькі кошык, сплецены з драніц. У сучаснай беларускай мове *кузня* — 'невялікая пасудзіна з бяросты, у якую збіраюць ягады' (Бярозаўскі р-н, паведаміла Л. Ф. Шаталава), а *кузёмка, кузенька, кузьма* —

'пасудзіна'[15]. Прымаючы ўсё гэта пад увагу, можна зрабіць вывад, што такім было першапачатковае значэнне, ад якога ўтварылася метрычнае.

Куфа — адзінка вымярэння вадкасці, пераважна віна: Миколай Каниковский... зе Львова мѣлъ малмазеи *куфъ* 3... (АС, III, 292, 1583); взято горелки оковитое доброе *куфъ* две великихъ (АВАК, XVIII, 251, 1646). Са значэннем адзінкі вымярэння ўжывалася вытворнае *полукуфокъ*: ...мѣлъ... вина Венгерского *полукуфковъ* 20... (АС, III, 307, 1583). Велічыню *полукуфка* І. Насовіч паказвае розную: у старажытнасці — 6 (Нас. АУ, 332), у мінулым стагоддзі — 40 вёдзер. Я. Ісаевіч лічыць, што на Украіне ў старажытнасці месцілася 2 бочкі [16].

Згодна з меркаваннямі Я. Карскага, слова *куфа* было запазычана беларускай мовай з нямецкай праз польскае пасрэдніцтва (*kufa*). У нямецкую мову яно прыйшло з лацінскай (*cōpa, cūpa*)[17]. Прычына запазычання, відаць, тая, што віно, адзінкай вымярэння якога была *куфа,* прывозілі з-за мяжы.

З метрычным значэннем ужывалася гэта слова ў мінулым стагоддзі: У погрібах стыялі *куфы* віна: на левым баку — сіла, а на правым безсілья (Белар. эпас, 93). Выяўлена яно

---

[15] А. У. Арашонкава і інш. Да лексіка-семантычнай дыферэнцыяцыі ў беларускіх народных гаворках.— «Весці АН БССР». Серыя грамадскіх навук, 1971, № 1, стар. 90.

[16] Я. Ісаевич. Деякі питання української метрології, стар. 10—12.

[17] Е. Карский. Белорусы. Введение..., стар. 154.

ў сучаснай беларускай дыялектнай (Касп., 172) і літаратурнай мовах са значэннем 'пасудзіна': Каля вялізнай дубовай кованай жалезам *кухвы* з гарэлкай з бровара пана Вашамірскага круціўся-вярцеўся стары карчмар Лейба (Бядуля, III, 74).

Липечня[18]. Гэта слова ўжывалася рэдка, яно выяўлена толькі са значэннем меры мёду: Надъ то: медовой дани *липечни* 75, ковшовъ 2, тыхъ *липечни* у ведро пинское две, а в *липечню* ковшовъ десять, чинить меду ведер пинских 37 и пол и два ковшика (ДМАМЮ, 158, 1565).

Ніякіх фактаў пра ўтварэнне слова *липечня* не выяўлена ні ў старабеларускай мове, ні ў сучаснай, а таксама ў суседніх мовах. На нашу думку, першапачатковае яго значэнне — 'пасудзіна, зробленая з кавалка ліпы' (сучаснае дыялектнае *ліпаўка* — 'выдаўбаная з кавалка дрэва кадка' — Бягомль). Ўтваральнай асновай гэтага слова з'яўляецца назоўнік *ліпа*.

Як паказвае цытаваны прыклад, *липечня* магла ўваходзіць у сістэму мер г. Пінска.

Лубня — адзінка вымярэння мёду: ...взято меду прѣсного... *лубня*, въ которой дей двѣ ведре (АВАК, III, 287, 1577). Гэта слова ўжывалася рэдка, значна часцей трапляецца ў помніках аднакарэннае з ім *лубка*: ...под час огню погинуло... меду пресного *лубокъ* шесть

---

[18] Ва ўказальніку да «Документов Московского архива Министерства Юстиции» даецца форма назоўнага склону адз. ліку *липечень*. На нашу думку, больш правільнай будзе форма *липечня*.

(ДМ БССР, 843, 1624); меду пресного *лубковъ* четыри, важило пудовъ двадцать (ГЮМ, IV, 254, 1686). Як мера ўжывалася і памяншальная форма *лубочка*: Меду *лубочка* отъ панов прошлорочных шафарей, которая важыла пудъ одинъ (ГЮМ, IV, 286, 1688).

Гэта слова ў старабеларускай мове ўжывалася і са значэннем 'пасудзіна': И тежъ беруть из собою важныхъ а важать за кожды пуд по 5 безменовъ..., а они перед тым лечъ только метывали по 4 безмены въ пудъ в *лубках*, а не голыи (Доўн.-Зап., 1905, 18, 1534); *Лубочку* на мед [купили] (ГЮМ, VIII, 93, 1691). У старарускай мове з метрычным значэннем ужывалася слова *лубъ* (Сразн., II, 270; Кочын, 175). І. Сразнеўскі адзначае, што яно мела таксама значэнне 'лубяны кораб, які ўжываўся як пэўная мера'. Бясспрэчна, што яно ўтварылася ад назоўніка *луб* 'кара' ў рускай мове безафіксным спосабам, а ў беларускай — пры дапамозе суфіксаў і першапачаткова мела значэнне 'пасудзіна з лубу'.

У сучаснай беларускай мове *лубка, лубянка* — 'пасудзіна', 'сявалка': Дзень за днём Марына змірылася з тым, што Мацей хоча ехаць. І калі настаў той дзень, яна сабрала *лубянку*, перавязала яе раменьчыкам, каб вечка не адвальвалася, запрагла каня і пад'ехала пад Некрашы (М. Лобан, «Полымя», 1967, № 2, 30); *Лупкі* звалі то сівалкі. Зробяць як карзінку з ліпы, хто зваў сівалка, хто *лупка* (Бягомль). І. Насовіч запісаў выслоўе «з лубки живем», якое растлумачыў: «Так земляробы выказваюць свой стан перад іншымі саслоўямі» (Нас. СБН, 52). Гэта слова выяўлена ў

літаратурнай мове і са значэннем адзінкі вымярэння: За пару *лубак* жыта мы куплялі свежай сялявы (М. Танк, «Полымя», 1967, № 3, 125).

Лукно — адзінка вымярэння пераважна мёду: Мишку Войшнаровичу шестнадцать человекъ, на имя Самуйловичи, дають пятипядное *лукно* меду дани (РИБ, XXVII, 103, 1449); а къ тому даивали зъ села Бабыничь на церковь светого Михаила два *лукня* меду пресного, въ которое *лукно* уложываеть по десети пудов меду (АС, I, 216, 1597). З метрычным значэннем ужывалася таксама вытворнае *полуконье:* чотыри *полуконья* меду дають (ДМАМЮ, 9, XV ст.). Гэта, відаць, была адзінка, напалавіну меншая за лукно, яна ўтварылася пры дапамозе скарочанай формы лічэбніка половина (*пол+луконье — полуконье,* параўн. палавіна капы — адзінкі лічэння — *полукопье*).

У старабеларускай мове слова *лукно* мела таксама значэнне 'пасудзіна': У городни пороху бочечка одна малая, яко бы полъбарыла, ...особливо тежъ у *лукне* 50 функтовъ (ДМАМЮ, 92, 1547). Са значэннем меры яно ўжывалася ў «Русской правде». У іншых славянскіх мовах мела рознае значэнне: у рускай і ўкраінскай — 'адзінка вымярэння' і 'пасудзіна', у сербахарвацкай — 'мера збожжа', славенскай — 'падатак, падарунак свяшчэнніку', чэшскай — 'берасцяны кош, мера збожжа'. На думку М. Фасмера, гэта слова праславянскае: *lǫk(ъ)no* ад *lǫčiti* (Фасм., II, 532). Метрычнае значэнне яно набыло, магчыма, у агульнаславянскі перыяд.

У старабеларускай мове ўжывалася вытворнае ад слова *лукно — полуконное* 'плата за лукно мёду': Тивунщыны на выѣздчого дають тыежъ данники, къ тому съ кождого дыму по полъ е͂ ($4^1/_2$) гроша, овса по корцу, а пищого при овсѣ отъ корца по пенезю, *полуконного* s̃ (6) грошей (АВАК, XIV, 11, 1555); Иванъ Кропивка, дымъ 1, дани даеть пудъ меду, за данью *полуконного* гр. полъ 3, а цыншу гр. 20 (ДМАМЮ, 132, 1560).

У фальклорных запісах мінулага стагоддзя выяўлена памяншальная форма *лукошко* 'пасудзіна': А кошка *ў лукошку* каруўнки тчець, а кот на пячи прадаець калачи (Зап., 308). І. Насовіч запісаў прыказку «Вѣкъ зжиць не *лукошко* сшиць», якую ўжываюць, апавядаючы пра складанае і цяжкае жыццё.

Медница — адзінка вымярэння мёду і масла: А дани меду 10 *медницъ*, безменъ и 2 воски (АС, I, 33, 1536); меду пресного *медницъ* двадцать, масла *медницъ* десять (АВАК, XX, 298, 1631). *Медница* ў якасці асноўнай адзінкі вымярэння была запісана ў Статуце Вялікага княства Літоўскага 1588 г. Гэта слова ўжывалася і са значэннем 'пасудзіна': Мисъ ценовыхъ великихъ двѣ а полумисковъ немалыхъ ценовыхъ одинадцать, *мѣдницъ* мосяндзовыхъ три (АВАК, VIII, 465, 1593), а таксама 'мерка' (агульная назва): И тамъ жо, на ратушу, мають мети бочку мерную и *медницу* [съ] знаменемъ местъскимъ (РИБ, XXVII, 743, 1499). Гэта слова ўжывалася таксама ў рускай і польскай (Даль, II, 368; Брукнер, 332), украінскай ('берестянка для меду' — Грынч., II, 430) мовах. Занёсшы яго ў артыкул *медь*

(*miedź*), А. Брукнер і У. Даль засведчылі, што *медь* і *медница* — аднакарэнныя, што другое ўтварылася ад першага і мела першапачатковае значэнне 'пасудзіна з медзі'.

Як адзінка вымярэння *медница* ў розных дакументах прыраўноўваецца да розных колькасных эквівалентаў: 2 *медницы* на кадь (АВАК, VIII, 486, 1599); 84 и полъ 4 безмена а *медницами* 47 *медницъ* (АС, I, 34, 1536). Ва ўказальніку да т. XIV АВАК «*медница* — мера сыпучих и жидких тел, равная 12 гарцам». Пастанова сейма 1766 г. зафіксавала велічыню *медницы* на 7 гарцаў.

У сучаснай беларускай мове слова *мядніца* ўжываецца са значэнем 'пасудзіна': Кучучыха на верандзе з лыжкай каля *мядніцы* стаяла, варэнне варыла (М. Лобан, «Полымя», 1967, № 2, 22).

Носатка (насатка, насадка) — адзінка вымярэння вадкасці: къ двору нашому къ Глушицы *насадку* меду даютъ (АС, III, 2, 1492); а *носатку* меду за два грошы (РИБ, XXVII, 546, 1494); от моего шынкара взялъ горелки носатку (АВАК, XXXIX, 581, 1580). Гэта слова мела метрычнае значэнне ва ўкраінскай мове. І. Сразнеўскі выявіў яго са значэннем 'пасудзіна': А *насадокъ* изъ пировъ и изъ брагчинъ у нихъ не емлютъ (1509) (Сразн., II, 328—329). І. Насовіч растлумачыў яго так: «Сосуд, вмещавший в себе две колоды меду в виде ушата, носимого на коромысле, или в виде сбитейного сосуда с носом» (Нас. АУ, 24). У «Словаре белорусского наречия» ён тлумачыць гэта слова як «драўляная пасудзіна з носам для вылівання вадкасці». Відаць, ад

сваёй формы (з «носам») пасудзіна атрымала назву *носатка*.

У сучаснай беларускай мове *насатка* — 'пасудзіна': *Насатка* — гэта такая бочачка з двума днамі і рыльцам (Амговічы, МКДЭ МПІ). У літаратурнай мове не выяўлена.

Ошиток — адзінка вымярэння збожжа (ужывалася рэдка): ставити имъ солоду *ошитковъ* десеть, да два *ошытки* пшеницы (АС, I, 1, 1406). Ва ўказальніку да т. V «Археографического сборника» гэта слова тлумачыцца як мера сыпкіх рэчываў. В. Махэк адзначыў таксама аналагічныя словы ў старачэшскай (*ošitka*) і славацкай (*ošivka, ošietka*) са значэннем 'пасудзіна, аплеценая (абшытая) лыкам ці пруткамі' (Махэк, 334). Магчыма, што і старабеларускае слова ўтварылася такім самым шляхам, як і ў чэшскай мове — ад дзеяслова *абшываць* 'аплятаць' і першапачаткова мела значэнне 'пасудзіна'.

Пипа — адзінка вымярэння віна (ужывалася рэдка): ...отъ кождое *пипы* вина по осьмнадцать грошей польских... (АВАК, VIII, 502, 1615). З іншымі значэннямі ў помніках старабеларускага пісьменства слова не выяўлена.

М. Гарбачэўскі дае два значэнні слова *пипа*, якое ён адносіць да польскіх: 'мера вадкасці; шведская — 469,07 літра або 38,138 рускага вядра, руская — 440,7 літра, або 35,829 рускага вядра'; 'прадаўгаватая бочка на віно або драўнінпае масла' (Гарб., 257). А. Брукнер лічыць яго запазычаным з італьянскай мовы, дзе яно мае значэнне 'бочка', і параўноўвае з французскім *pipe* (Брукнер, 415). У рускай мове гэта слова мела значэнне 'замежная

мера віна, бочка, 40—50 вёдраў' (Даль, III, 111). Паколькі гэта мера рэдка трапляецца ў помніках старабеларускага пісьменства, можна зрабіць вывад, што шырокага распаўсюджання яна не атрымала. Такое слова ў сучаснай беларускай мове не ўжываецца.

Решето (рѣшето), сито. Гэтыя словы ўжываліся са значэннем адзінак вымярэння сыпкіх рэчываў: Наперъвей жаловалъ Демид[ъ] Степановичъ с[ъ] Озерыщъ на Романа Герасимовича ѡ томъ ижъ-бы казалъ слугамъ своимъ взяти в него: тридцат[ь] копъ сена... а *решето* цыбули (БА, II, 21, 1530); ...сѣменю ильненого *ситъ* три, сѣменю конопленого *рѣшоты* двѣ (АС, I, 181, 1590); насѣнья льняного *сито,* орѣховъ *сито* (АВАК, XIV, 12, 1555).

Словы *решето* і *сито* абазначалі прылады аднолькавага гаспадарчага прызначэння. Са значэннем 'прылады прасяваць муку' гэтыя словы ўжываліся ў іншых славянскіх мовах. Слова *решето,* на думку А. Праабражэнскага, агульнаславянскае, генетычна звязана з прыметнікам *рѣдокъ,* а *сито* ўжывалася не толькі ў славянскіх, але і ў іншых індаеўрапейскіх мовах. Генетычна яно звязана з індаеўрапейскім *sē, sei* 'сеяць, кідаць насенне' (Праабр., 237, 290). І. Сразнеўскі зарэгістраваў слова *рѣшето* з двума значэннямі: 'лукошко с сетчатым дном' і 'мера сыпучих тел' (Сразн., III, 227). Метрычнае значэнне словы *решето* і *сито* набылі таму, што прылады, якія яны абазначалі, ужываліся не толькі для прасявання мукі, але і для захоўвання і вымярэння збожжа.

Абодва словы выяўлены ў запісах народнай творчасці мінулага стагоддзя: Съ суботы на

недзѣлю собралася (имярек) родзина; знесли ж ёны семъ *ситъ* муки... (Зап., 704); Дай же вамъ, боже, гэтага дабра многа, три бочки мякины, да *решето* бобу (Зап., 704). З такім самым значэннем у сучаснай дыялектнай і літаратурнай мове выяўлена слова *рэшата:* Андрэй не выпускаў з рук нязграбнай прывабнай клубнічыны. — Вось гэта ягадка. І многа гектар можа даць такой? — Трэба лічыць: метраў з дзесяці — *рэшата* першай, а там яшчэ *рэшата* і яшчэ. *Рашот* са тры назбіраецца (М. Лобан, «Полымя», 1967, № 1, 45); Ды нашай казе не так многа трэба: паўбочкі грэчкі на перапечкі, *рэшата* аўса, наверх каўбаса... (Шырма, I, 64).

Ручка — адзінка вымярэння мёду; ужывалася пераважна ў XV ст.: а съ ней идеть 3 *ручьки* меду (АЗР, I, 38, 1415); Дали есмо къ церкви Дорогицкой, къ Светой Тройцы, шесть *ручокъ* меду пресного (РИБ, XXVII, 1492).

І. Сразнеўскі выявіў гэта слова ў дакументах XI ст. са значэннем 'пасудзіна' (Сразн., III, 200). І. Насовіч растлумачыў яго значэнне ў старабеларускай мове як 'жбан' ('кувшин'). Аднак утварэнне яго аўтары слоўнікаў не тлумачаць. Магчыма, што ў аснову назвы гэтай пасудзіны пакладзена яе прыкмета — з ручкай, таму яна атрымала назву *ручка.*

Як адзінка вымярэння *ручка* была роўнай 0,5 вядра берасцейскага (ДМАМЮ, 327, 1566). Дзяржаўнай адзінкай вымярэння *rączka* была ў Польшчы.

Сакъ — адзінка вымярэння мёду і сыпкіх рэчываў: меду осимъ *саковъ;* два *саки* хмелю (АВАК, VI, 494, 1548); а въ той кадцы

меду пресного было *сакъ* (АВАК, XVIII, 65, 1589).

І. Сразнеўскі зарэгістраваў слова *сакъ* са значэннем 'адзенне' (Сразн., III, 244). Г. Кочын растлумачыў яго як 'мера', 'мяшок' (Кочын, 310). А. Брукнер адзначае, што слова *sak,* якое ўжываецца ва ўсіх славян, запазычана з яўрэйскай мовы (Брукнер, 479). І. Насовіч яго значэнне тлумачыць як 'кузов, медовая мера' (Нас. АУ, 422 адв.). У «Лексіконе» П. Бярынды «*Саккъ,* мѣхъ, или ризе архіер[еа]» (Бяр., 230). Такім чынам, гэта слова ў розных слоўніках зарэгістравана са значэннямі 'пасудзіна' ('кузов'), 'мяккая тара' ('мех'), 'адзенне', 'мера'. На нашу думку, асновай для ўтварэння значэння меры былі два значэнні гэтага слова: для адзінкі вымярэння мёду — 'пасудзіна' ('кузов'); сыпкіх рэчываў (хмелю) — 'мех'. Мала верагодна, што асновай было адно значэнне 'пасудзіна' ці 'мех', бо мёд мехам мераць нельга, а, як паказваюць іншыя меры, хмель мераўся не на пасудзіны, а на мяхі.

У сучаснай беларускай мове *сак* — 'рыбацкая сетка канічнай формы', 'паліто пэўнага выгляду', 'сумка' (Касп., 274).

Сѣвня, сѣвальня — адзінка вымярэння сыпкіх рэчываў: ярицы два *севѣнъ* (АВАК, VI, 413, 1549); ...онъ узялъ у мене полъ *севни* пшеницы... (АВАК, XVII, 413, 1541); зъ того села повинность: конюшому овса чотыри солянки..., жита по *сѣвальни*... (АВАК, XIII, 240, 1589).

Гэта слова зарэгістраваў М. Гарбачэўскі са значэннем 'пасудзіна на 3 або 4 гарцы' і 'адзінка вымярэння' (Гарб., 333). Першапа-

чатковае яго значэнне — 'пасудзіна, з якой сеюць збожжа'. Звычайна яна робіцца з лубу або саломы. Як пісаў М. Нікіфароўскі, сяўня звычайна выкарыстоўваецца толькі вясной, а ўвесь астатні час яна ўжываецца для зберагання сыпкіх рэчываў [19]. Гэтым можна растлумачыць, што словы *сѣвня, сѣвальня* набылі значэнне меры. Разам з тым не менш важна, што, як ужо гаварылася раней, колькасць збожжа, засыпанага ў сявальню, служыла для вызначэння плошчы зямлі.

У сучаснай беларускай мове *сяўня, сявенька, сявальня* — 'пасудзіна' і 'адзінка вымярэння збожжа': Насыпле (гаспадар. — *К. С.*) *сяўню*, узыдзе на край загону і, азірнуўшыся на ўсе бакі, каб не было дзе лішніх вачэй, паспешліва скідае нагавіцы (Палтаран, 171—172); Гэта той бярэзнік, дзе летась дзядзька назбіраў цэлую *сявеньку* слаўных баравікоў-бярозавікаў (Колас, V, 20).

Соломяникъ — адзінка вымярэння збожжа (ужывалася рэдка): жита сто чтыридесять копъ ячменю молоченого два *соломяники* (АВАК, VI, 403, 1549). З іншымі значэннямі гэта слова не выяўлена. Яно зарэгістравана ў слоўніку М. Гарбачэўскага са значэннем 'пасудзіна' і 'хлебная мера' (Гарб., 337). Калі прыняць пад увагу словаўтваральную аснову (*солом-*), то можна ўстанавіць, што першапачатковае значэнне слова *соломяникъ* — 'пасудзіна з саломы', ад якога ўтварылася значэнне меры.

---

[19] Н. Никифоровский. Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии. Витебск, 1895, стар. 85.

Труска — адзінка вымярэння хмелю: ...тоть Ворошило тестъ его тыхъ пяти копъ грошей а меду пяти медницъ и семи *трусокъ* хмелю не заплативши и сам змеръ (АВАК, XXI, 5, 1555); хмѣлю *труски* 4 (АС, IV, 235, 1569). Паходжанне гэтага слова не высветлена. І. Насовіч дае значэнне 'щепотка', якое магло б стаць асновай для ўтварэння метрычнага. Аднак наўрад ці прадавалі хмель дробачкамі, якія можна ўзяць у тры пальцы. На нашу думку, у прыкладах гаворка ідзе пра больш значныя меры. Улічваючы агульны характар утварэння значэння 'мера сыпкіх рэчываў', можна дапусціць, што першапачатковае значэнне слова *труска* — 'пасудзіна' або 'мех'. Нельга таксама выпускаць з-пад увагі сучаснае значэнне слова *трусіць* 'калаціць, выкалочваць'. Калі лічыць, што *труска* і *трусіць* аднакарэнныя, то першапачатковае значэнне слова *труска* магло быць 'пэўная колькасць хмелю, якую намалочвалі за адзін раз, магчыма, за адну ўкладку'.

Ушатокъ (*вшатокъ*) — адзінка вымярэння вадкасці: ...2 *ушатъки* меду пресного даютъ (РИБ, XXVII, 25, 1471); ...яричного пива двѣ бочки — *ушатковъ* въ тыхъ бочкахъ по пяти, чварта бочка пива пшеничного — въ ній *ушатковъ* два, огурковъ солоныхъ въ той же пивницы кадь въ чотыри *вшатки* (АС, IV, 239, 1571). Слова ўжывалася і са значэннем 'пасудзіна': въ немъ (бровары. — *К. С.*): чапы пивныхъ три, кадей шесть, *ушатокъ* одинъ (АС, IV, 300, 1593).

У гістарычных слоўніках гэта слова не выяўлена. У мінулым стагоддзі слова *ўшатка* ў беларускай мове ўжывалася са значэннем

'вядро, падобнае на даёнку з ручкай' (Нас. СБН, 672). У рускай мове слова *ушат* мае значэнне 'пасудзіна' (Даль, IV, 143). У. Даль дае яго ў артыкуле *ухо,* тым самым сцвярджаючы, што *ушат* і *ухо* аднакарэнныя. З думкаю У. Даля нельга не пагадзіцца. Такім чынам, першапачатковае значэнне слова *ушат* — 'пасудзіна з вушкамі для пераноскі', а *ушаток* — яго памяншальная форма.

Велічыня гэтай меры для мёду адзначана ў т. VII «Археографического сборника» — 6 пудоў (АС, VII, 354).

Цеберъ — адзінка вымярэння вадкасці (ужывалася рэдка): Для челяди квасу *цеберъ* [купили] (ГЮМ, I, 65, 1679). З метрычным значэннем выявіў гэта слова І. Сразнеўскі ў дакуменце, датаваным 1289 г. (Сразн., III, 143).

На думку А. Міхневіча і В. Мартынава, слова *цэбар* 'пасудзіна' было запазычана з польскіх дыялектаў. Як на доказ гэтага, яны звяртаюць увагу на першапачатковае *ц* (праславянскае * сьЬьгь) [20].

З першапачатковым значэннем 'пасудзіна' слова *цэбар* ужываецца ў сучаснай беларускай мове. Выяўлена яно і з метрычным значэннем: Пасля паўдня ў іх ужо было *цаброў* тры ўлову (Колас, IX, 373).

Чаша — адзінка вымярэння сыпкіх рэчываў і вадкасці: ...тымъ бобровникомъ нашым здавна хоживало с кожъдого дыму... по *чаши* крупъ, ...а з ынъшыхъ по *чаши* конопель; и врокомъ имъ... по солянъце соли, и по *чаши* крупъ, и по *чаши* маку (БА, II, 144, 1533).

[20] «Маладосць», 1969, № 10, стар. 135—136.

М. Гарбачэўскі растлумачыў значэнне гэтага слова як 'літоўская мера вадкасці на два рускія вядры і 18,8 кручка' (Гарб., 81). У Г. Кочына яно зарэгістравана са значэннем 'пасудзіна' і з заўвагай, што яна служыла мерай вадкасці і сыпкіх рэчываў (Кочын, 391). Гэта слова праславянскае, першапачатковае яго значэнне 'пасудзіна' (Праабр., II, 1195). Велічыню гэтай меры ў Вялікім княстве Літоўскім паказвае Ф. Петрушэўскі — 12 гарцаў [21].

Шанокъ — адзінка вымярэння сыпкіх рэчываў: ...проса посѣянно *шанокъ* (АС, IV, 241, 1571); Овса для кони *шанки* два (ГЮМ, IX, 188, 1692).

У гістарычных слоўніках гэта слова не выяўлена. У сучаснай беларускай мове *шанька, шаня* [22] і ва ўкраінскай *шанк* маюць значэнне 'пасудзіна'. Магчыма, гэта першапачатковае значэнне слова *шанокъ*.

М. Гарбачэўскі адносіць гэту меру да дзяржаўных у Вялікім княстве Літоўскім. Ён адзначае, што ўжываліся два шанкі — стары на 48 гарцаў і новы на 24 (Гарб., 353).

У сучаснай беларускай мове гэта слова выяўлена і са значэннем адзінкі вымярэння: Тадорка, сынок, — пісаў бацька. — ...За каго ты пакутуеш?.. За тых рабаўнікоў, якія ў твайго бацькі апошні *шанак* жыта выцягнулі... (Крапіва, II, 16).

---

[21] Ф. Петрушевский. Общая метрология, ч. I, стар. 394.

[22] Гл.: А. Крывіцкі. Залатыя россыпы слоў.— «Маладосць», 1968, № 12, стар. 134; У. Караткевіч. Званы ў прадонні азёр.— «Маладосць», 1969, № 12, стар. 107.

Фаса (*фаска*) — адзінка вымярэння сыпкіх рэчываў і вадкасці[23]: ...хмелю *фасы* две (АВАК, XX, 137, 1598); оливы *фасокъ* 6, в нихъ каменей 36 (АС, III, 316, 1583); ...масла *фаска* (ГЮМ, I, 108, 1679). У помніках старабеларускага пісьменства гэта слова выяўлена і са значэннем 'пасудзіна': Богданъ Омельяновичъ... провади до Кролевца... товару своего, то есть якель, або пшона *фасъ* великихъ и малыхъ солянокъ, въ нихъ лаштовъ ді (14), лою *фасъ* великихъ и малыхъ солянокъ вшиткихъ ої (19), въ нихъ важить каменей фм (540) (АВАК, XIV, 653, 1601). Ужывалася гэта слова і яго памяншальная форма ў польскай мове (*faska, faseczka* 'бочка'), ва ўкраінскай 'кадушка на масла' (Брукнер, 119; Грынч., IV, 357). Зарэгістравана яно ў абодвух слоўніках І. Насовіча: у «Алфавитном указателе» — 'скрынка на пуд велічыні' (252), у «Словаре белорусского наречия» — 'кадушка з вушкамі' (673).

Слова *фаса* было запазычана з нямецкай мовы, дзе *Fass* — 'пасудзіна'. Значэнне адзінкі вымярэння яно магло набыць у старабеларускай мове. Не выключаецца магчымасць запазычання з польскай мовы. Так, А. Гілевіч у артыкуле «Studija z dżejów miar i wag w Polsce» пісаў: «...на тэрыторыі этнаграфічнай Польшчы самай распаўсюджанай мерай прэснага мёду быў пакоў (pokow, pokowa, urna mellis), часткамі якога былі чвэрці (ćwierci,

---

[23] Так называлася і адзінка лічэння. Пра яе гл. у раздзеле «Адзінкі лічэння».

guarty), ручкі (rączki), *фаскі* (*faski*), місы (misy), жбаны (dzbany)... [24]

У сучаснай беларускай мове слова *фаса* (*фаска*) ужываецца рэдка. Так, М. Каспяровіч зарэгістраваў яго фанетычны варыянт *паса* 'невялікая дашчаная пасудзіна для збожжа, якая мае форму бочкі' і памяншальную форму *фаска* 'маленькая бочачка на масла' (Касп., 231, 326). Я. Колас ужывае гэту форму са значэннем меры ў адным са сваіх пісьмаў: З Балачанкі прывёз *фаску* салёных грыбоў («Полымя», 1969, № 2, 179). У гэтым прыкладзе слова *фаска* мае значэнне неканкрэтнай меры.

Значэнне адзінкі вымярэння набылі некаторыя словы з першапачатковым значэннем 'мех'.

Вантух, лантух — адзінкі вымярэння хмелю: ...мещанинъ Пинский на имя Матеецъ... продалъ хмелю *лантухъ* и померного отъ того хмелю не далъ... (Груш., 136, 1562); Хмелю *вантуховъ* шесть — кождый *вантухъ* плачонъ по тридцати и по пети копъ Литовскихъ (АВАК, III, 289, 1577).

У т. III «Актов, издаваемых Виленскою Археографическою комиссиею» *вантух* тлумачыцца як 'мяшокъ'. Гэта слова зарэгістраваў у слоўніку В. Бурнашоў — 'большой шерстяной мешок, в который сваливают овечью шерсть при рассортировке' (Бурнашоў, I, 351). А. Брукнер тлумачыць яго значэнне як 'грубае

---

[24] Sprawozdanie Towarzystwa Naukowego we Lwowie, r. XVI, 1936, стар. 320.

палатно' і лічыць запазычаным з нямецкай мовы — *wagentuch* (Брукнер, 601). Такім чынам, развіццё значэння слова ішло наступным чынам: 'грубае палатно' (у нямецкай мове Tuch 'палатно')⟶'мех, пашыты з такога палатна'⟶'адзінка вымярэння'. Прымаючы пад увагу другую частку слова *лантух* (Tuch), можна меркаваць, што гэта слова таксама запазычана з нямецкай мовы, дзе яно, відаць, абазначала палатно іншага гатунку.

У сучаснай беларускай дыялектнай мове *лантух* — 'мяшок', а таксама 'трыбух, жывот, страўнік', а *лантухі* — 'унутранасці' (Бяльк., 246). У І. Бялькевіча гэта слова зарэгістравана са значэннем меры: Купіў *лантуг* аўса — сеіць нечым, увесь скарміў коньмі (Бяльк., 246).

Куль — адзінка вымярэння збожжа (ужывалася рэдка): ...продавати водлѣ уставы нашой... за бочку жита десять грошей, за *куль* овса пять грошей... (АЗР, III, 107, 1559).

Слова *куль* ужывалася ў рускай, украінскай і польскай мовах. А. Праабражэнскі лічыць, што яно запазычана з лацінскай, дзе *culleus* — 'скураны мех', праз польскае пасрэдніцтва (Праабр., I, 410). Аднак Я. Карловіч піша, што гэта слова — запазычанне польскай мовы з усходнеславянскіх (Карл., II, 623). Такім чынам, адзінай думкі пра паходжанне слова няма. Калі прыняць пад увагу значэнне, якое дае А. Праабражэнскі, то гэта слова трэба аднесці да групы з першапачатковым значэннем 'пасудзіна', 'мех'.

У мінулым стагоддзі слова *куль* мела значэнне адзінкі вымярэння («вядомая хлебная

мера» — Нас. СБН, 269). А. Семянтоўскі адзначыў, што такая мера ўжываецца ў Веліжскім павеце, яна раўняецца казённай чвэрці[25]. У сучаснай беларускай дыялектнай мове гэта слова таксама мае метрычнае значэнне: *Куль* мукі ў лаўцы купілі (Янк., 1966, 104).

Мехъ — адзінка вымярэння сыпкіх рэчываў: Ивану Спиридонову 2 *мехи* соли з мыта въ Смоленъску (РИБ, XXVII, 279, 1487); Пану маеру куп[или] 2 *мехи* уголля (ГЮМ, XIX, 45, 1711). Гэта мера ўжывалася ў гандлёвых зносінах Полацкага княства з Рыгаю: Княжо нашъ горожанинъ Фредрикъ продалъ чоловѣку *мехъ* соли (РЛА, 27, 1299—1307).

Слова *мехъ,* якое ўжывалася ва ўсіх славянскіх мовах, першапачаткова мела значэнне 'скура з поўсцю'. Яно генетычна звязана з індаеўрапейскім **mēsza* 'баран', **mēszi* 'авечка' і 'скура з авечкі' (Брукнер, 331).

Са значэннем адзінкі вымярэння гэта слова ўжывалася ў рускай і ўкраінскай мовах.

У сучаснай беларускай мове слова *мех* і памяншальная форма *мяшок,* якое страціла значэнне ацэнкі, маюць значэнне 'ёмістасць', 'тара' і 'адзінка вымярэння' (нетэрміналагічнае значэнне): З гумна вынес тры *мяхі* жыта і ўскінуў на воз (С. Грахоўскі, «Маладосць», 1967, № 12, 97); Учора бацька прывёз з млына *мяшок* мукі з новага жыта (Крапіва, II, 343).

---

[25] А. Сементовский. О мерах и весах, употребляемых в Витебской губернии, стар. 4.

СЛОВА *мера*, ЯГО ВЫТВОРНЫЯ І ІНШАМОЎНЫ АДПАВЕДНІК *маца*

Слова *мера* ва ўсіх славянскіх мовах вызначаецца полісеміяй. З некалькімі значэннямі яно ўжывалася і ў старабеларускай мове, і сярод гэтых значэнняў — 'адзінка вымярэння': а на Глушици съ тыхъ селецъ къ двору нашому *мѣру* ржи, а *мѣру* овса (АС, III, 2, 1492); на то далъ десеть *мѣръ* жита, на тотъ часъ жито куповано *мѣру* по полторы копы (АВАК, IX, 469, 1629).

Таксама часта, як і слова *мера*, ужывалася памяншальная форма *мерка*: ...вина на обѣдню *мѣрокъ* десять... (АС, VI, 310, 1596); жыта *мерокъ* тридцать... Пшеницы дошло *мерокъ* две... Конопель дошло *мерок* две. Гречихи дошло *мерокъ* семъ (ГЮМ, IV, 270, 271, 1688).

Помнікі старабеларускага пісьменства не паказваюць, ці слова *мера* і яго памяншальная форма абазначалі адну адзінку вымярэння, ці гэта былі дзве меры. І. Насовіч у «Алфавитном указателе» занатаваў толькі слова *мерка* 'мера в четверик и более', слова ж *мѣра* тлумачыць як 'вид, степень, положение' (203).

У Магілёўскіх актах з метрычным значэннем таксама шырока ўжывалася слова *мерникъ*: Съ того жъ сыценя вышло меду кгарцовъ чотыри ста пятьдесятъ шесть, было *мерниковъ* чотыри и ушатки два и кгарцовъ осемъ (ГЮМ, IV, 285, 1688); За картою п. войта, за *мерникъ* пива... запл[атили] зі [золотых] (ГЮМ, XX, 55, 1711).

Са значэннем меры выяўлены таксама вытворныя *полумѣръ* і *полумѣрокъ:* казалъ ми князь его милость купить овса 40 *полумѣровъ*, *полумѣръ* по 3 гроши (АС, VII, 19, 1538—1539); Исай Носов..., будучи до уряду зазванъ... о сем коп гречихи и о *полумерокъ*, до права не стал...; о сем коп гречихи и *полумерокъ* гречихи (АВАК, XXXIX, 97, 100, 1578).

Слова *мера,* памяншальная форма *мерка*, а таксама *полумерок* са значэннем адзінак вымярэння ўжываліся ў стараўкраінскай мове. В. Віннік, улічваючы агульную заканамернасць фарміравання адзінак вымярэння сыпкіх рэчываў і вадкасці, прыходзіць да вываду, што першапачаткова гэта слова магло абазначаць пасудзіну, якой мераліся сыпкія і вадкія рэчывы [26], г. зн. утварэнне метрычнага значэння адбылося таксама, як і іншых слоў з першапачатковым значэннем 'пасудзіна'. Аднак у старабеларускай мове такое значэнне не захавалася. Відаць, у глыбокай старажытнасці слова *мера,* апрача канкрэтнага значэння 'адзінка вымярэння', набыло агульнае 'мера' ('любая адзінка вымярэння'), з якім ужывалася ў старабеларускай і ў іншых славянскіх мовах. Пра тое, што канкрэтная метрычная адзінка можа набываць агульнае значэнне 'мера', ужо гаварылася (гл. *бочка, меднища, ведро*). У старабеларускай мове адбылася адваротная з'ява. Слова *мера,* якое мела значэнне 'любая адзінка вымярэння', набыло канкрэтнае: 'пэўная адзінка вымярэння'.

---

[26] В. Винник Назви одиниць виміру і ваги..., стар. 84—87.

Гэта слова індаеўрапейскага паходжання (Фасм., II, 600), таму яно і атрымала шырокае распаўсюджанне ва ўсіх славянскіх мовах.

З помнікаў старабеларускага пісьменства нельга ўстанавіць канкрэтную велічыню *меры, мерки, мерника* і г. д., і гэта не дае магчымасці вызначыць дакладна, у якой словаўтваральнай залежнасці яны знаходзяцца паміж сабой.

У сучаснай беларускай мове з метрычным значэннем выяўлена толькі слова *мерка*: Ёсць шчэ *мерка* жыта ў клеці (Колас, I, 155). У дыялектнай мове яно ўжываецца са значэннем 'пасудзіна з ручкай для вымярэння збожжа і бульбы' (магчыма, асміна?).

Значэнне меры ў старабеларускай мове мела слова *маца*: ...жита 225 *мацъ* (РИБ, XXVII, 776); Повинность подданыхъ того села: ...платятъ зъ волоки грошей тридцать, овса *маца* одна, гусь одна... (АВАК, VI, 58, 1589). З такім самым значэннем яно ўжывалася ў рускай, украінскай і польскай мовах. А. Брукнер тлумачыць яго значэнне ў польскай мове як 'збожжавая мера на 16 гарцаў' і паказвае, што паходзіць яно з нямецкай мовы, дзе *Metzen* — 'мера' ад *messen* 'мераць' (Брукнер, 316). М. Гарбачэўскі дае меншую велічыню *мацы:* 3 берлінскія кварты, або 1 варшаўскі гарнец (3,76 літра) (Гарб., 203).

Ужыванне гэтага слова, якое ў нямецкай мове мела агульнае значэнне 'мера', з канкрэтным колькасным значэннем, паказвае, што і ў нямецкай мове, як і ў старабеларускай, агульная метрычная назва магла набываць канкрэтнае значэнне.

МЕРЫ ЛІЧЭБНІКАВАГА ПАХОДЖАННЯ

Некаторыя назвы адзінак сыпкіх рэчываў і вадкасці, што ўжываліся ў старабеларускай мове, утварыліся ад дробавых лічэбнікаў.

Полуйца — адзінка вымярэння сыпкіх рэчываў: Первей сего дали есмо пану Довкшю у Рогачевской волости Плесович данники, две *полуйцы* дають... (АЛРГ, 16, 1440—1444); а маетности у него побрали, то есть: ...гречихи *полуйцы* три... (АС, I, 181, 1590).

У слоўніках гэта слова не выяўлена. У дадатку да «Ревизии Кобринской экономии» ёсць блізкае слова *полуйникъ* 'половинник, держащий половину'. І. Насовіч зарэгістраваў слова *полуйка* 'жменя лёну, напалову змятага ў мяле, але яшчэ не ачышчанага' (Нас. СБН, 463). І. Сразнеўскі слова *полуина* тлумачыць як 'палавіна' (Сразн., II, 1140). Характэрна, што ў словах *полуйникъ* і *полуина* пасля зычнага *л* стаіць галосны *у*, як і ў слове *полуйца*, а не *о*, як у слове *половина*. На нашу думку, слова *полуйца* генетычна звязана з лічэбнікам *половина*: *половица — полуица — полуйца*.

Третинникъ — адзінка вымярэння сыпкіх рэчываў і вадкасці: сховалъ есми полтора *третинника* пшеницы, два *третинника* ячменю..., а я Иван Гораинъ такъ тежъ у томъ острове сховалъ есми жита полтора *третинника*, а я Калавуровая у томъ же острове сховала есми гречки *третинниковъ* три (АВАК, XVIII, 400—401, 1660); ...серебра ломаного гривень осмъ, овса меновали взято *третинниковъ* пять (АВАК, XXVIII, 248).

Гэта слова са значэннем меры ўжывалася ў стараўкраінскай мове. В. Віннік, спасыла-

ючыся на думку А. Несялоўскага, лічыць, што ўпершыню ў помніках яно трапляецца ў вопісу падольскіх замкаў, напісаным на лацінскай мове, а назва *третинник* з'яўляецца сведчаннем глыбокай даўніны гэтай меры, бо яна адлюстроўвае праславянскі прынцып падзелу цэлага на часткі, у аснове якога ляжыць дзяленне не на два, а на тры. Што ж да велічыні *третинника,* то В. Віннік спасылаецца на К. Саханевіча, які лічыў, што на Падоллі гэта мера складалася з 160—204 літраў [27].

У сучаснай беларускай мове гэта слова не выяўлена. У дыялектным слоўніку Ф. Янкоўскага зарэгістравана слова *траціна* са значэннем 'трэцяя частка надзела' (Янк., 1966, 183).

Чверть (четверть, чвертка, четвертка, чвертникъ) — адзінка вымярэння сыпкіх рэчываў: ильну десятки три, сѣмени ильненого *чверть* одну (АС, I, 181, 1590); въ которомъ струзе мелъ ми спустити пят[ь]десять *четверътей* жита (БА, II, 212, 1533); Его мл.п. референдаря Брестовъского пану писарю Вилковъскому овъса *чвертникъ* купили (ГЮМ, I, 50, 1679).

Пастановай сейма 1766 г. *чверть* была зацверджана як адна з асноўных адзінак вымярэння Вялікага княства Літоўскага замест ранейшага карца. Відаць, пэўны час *чверть* і *корецъ* ужываліся як сінонімы, пра што сведчыць такі прыклад: Къ тому съ кождое волоки, гдѣ жыто, до скарбу его милости повинни

---

[27] В. Винник. Назви одиниць виміру і ваги..., стар. 121.

по *чверти,* альбо по корцу жыта (АС, I, 189, 1594). Замене *корца* на *чверть* садзейнічала тое, што бочка мела 4 карцы, а таксама прывядзенне ў агульную сістэму адзінак вымярэння сыпкіх рэчываў і вадкасці (*бочка — чверть — осмина — шеснастка*).

Слова *чверть* выяўлена ў помніках старабеларускага пісьменства са значэннем 'прылада вымярэння' ('мерка'): Там-же на ратушу мѣти *четверти* мѣрные и мѣдницу под ихъ знаменемъ мѣстъскимъ (СДГА, 5, 1511).

Чверть і яго варыянты ўжывалася з метрычным значэннем ва ўкраінскай, рускай, польскай і чэшскай мовах. Не выклікае сумнення тое, што адзінкай вымярэння стаў дробавы лічэбнік *четверть (чверть).*

Яшчэ ў мінулым стагоддзі *четверть* ужывалася на Беларусі як казённая мера (8 чацверыкоў, або 64 гарцы). На Віцебшчыне гэта мера раўнялася палавіне бочкі (72 гарцы). Як сведчыць А. Семянтоўскі, ужывалася таксама *чвертка* (32 гарцы), *получвертка* (16 гарцаў), *четверик казённый* (8 гарцаў), *четверик старой меры* (16,8 і 10 гарцаў)[28].

У сучаснай беларускай мове *чвэрць* 'адзінка вымярэння' ўжываецца як гістарызм: Прадаўшы, купілі *чвэрць гарэлкі,* узялі з яе па чарцы, астатняе закаркавалі і паклалі пад пасцілку... (Караткевіч, 2, 252). У дыялектнай мове выяўлены такія варыянты: *чацвярык: Чацвярык* — ета чатыры гарцы, даўно была такая мерка (Шчыткавічы, МКДЭ МПІ);

[28] А. Сементовский. О мерах и весах, употребляемых в Витебской губернии, стар. 4.

чацвóртка — мерка з ручкай, паўасміннік, каля 0,7 пуда: Дам *чацьвóрткy* жыта за тое, што мне жнеш (В. Рожын, МКДЭ МПІ); *чвертка* — чацвёртая частка гарца (Рэдкавічы); *чэцьверць* — мера вадкасці (3 літры) у Ашмянскім і Бярэзінскім раёнах.

Осмина. Гэта слова ўтварылася ад лічэбніка *осмъ,* ужывалася са значэннем меры сыпкіх рэчываў: Трухан с[ъ] Торопца жаловал ѡ томъ, ижъ взято в него: три ѡсмины полоцких ѡвса, воз[ъ] сена... (БА, II, 21, 1530); Овъса для коней мескихъ купили осмину, дали зол[отых] два... (ГЮМ, I, 19, 1679). З такім самым значэннем ужывалася памяншальная форма *осминка*: ...пшеницы *осминокъ* пять, ...ечменю *осминокъ* чотыри (АС, I, 172, 1588). Помнікі пісьменства не паказваюць, ці слова *осмина* і яго памяншальная форма абазначалі адну, ці гэта былі розныя меры. Памяншальная форма зафіксавана ў І Ноўгарадскім летапісе. Гэта значыць, што слова *осмина* — агульнаўсходнеславянскае. Адзінка вымярэння, якая абазначалася гэтым словам, уваходзіла ў склад дзяржаўнай сістэмы мер Вялікага княства Літоўскага. Пастановай сейма 1766 года яе велічыня была зацверджана на $^1/_8$ бочкі (18 гарцаў, прыблізна 51 літр)[29].

У сучаснай беларускай мове *асміна* 'адзінка вымярэння' выяўлена ў творах старэйшых пісьменнікаў: Ну, то я прышлю (грэчкі.— *К. С.*), цэлую *асміну* прышлю, — сказаў падлоўчы (Колас, IX, 46). У дыялектнай мове

---

[29] С. Гольдштейн. Польско-литовские древности, стар. 139.

гэта слова і яго вытворнае *паўасміна (паўасміннік)* маюць значэнне 'адзінка вымярэння' і 'пасудзіна, якой мераць (мерка)': *Асміна* — тры пуды, бувала, мералі, як хто купляў ці пазычаў (Шчыткавічы); Два *паўасміннікі* жыта ў *асміну* ўсыплюць — поўна *асміна* будзе (В. Рожын); Дзежачку на паўтара пуда рабілі, *паўасмінкай* называлі. У нас і цяпер *паўасмінка* есь (Горкі) (усе прыклады — з МКДЭ МПІ).

Як сведчаць матэрыялы літаратурнай і дыялектнай мовы, гэта слова і яго вытворныя выходзяць з актыўнага ўжывання.

З метрычным значэннем ужываліся таксама запазычаныя словы лічэбнікавага паходжання *кетвиртайня* і *кварта*.

Кетвиртайня як мера сыпкіх рэчываў ужывалася рэдка і пераважна на тэрыторыі этнічнай Літвы. Яно выяўлена толькі ў «Інвентары Плоцельскай дзяржавы»: ...збожья, стацій зъ волоки стародавное осѣлое жита по *кетвиртайни,* а по другой *кетвиртайны* овса мѣры торговое Плотельское, а с трохъ волокъ пшеницы *кетвиртайня,* ечменю *кетвиртайня* (АВАК, XIII, 312, 1585).

Слова *кетвиртайня* — літоўскага паходжання. У літоўскай мове яно мае значэнне 'чацвёртая частка, чвэрць чаго-небудзь'. Я. Карскі пісаў, што гэта слова мела таксама значэнне 'мера поля, чвэрць' і параўноўваў яго з літоўскім *ketvirtainis* [30].

Ужыванне гэтага слова ў старабеларускай мове з'яўляецца сведчаннем узаемадзеяння

[30] Е. Карский. Белорусы. Введение..., стар. 126.

беларускай і літоўскай моў у перыяд, калі беларусы і літоўцы ўваходзілі ў склад адной дзяржавы.

Кварта — адзінка вымярэння сыпкіх рэчываў і вадкасці: Горѣлку ктобы кольвек везти въ дорогу мѣлъ, тогды отъ ста квартъ по два гроши Литовскихъ [брати мають] (АС, I, 278, 1634); До пива одного вару, абы не кваснило, соли *кварт* две [купили] (ГЮМ, V, 107, 1688). Гэта слова ёсць у «Лексіконе» П. Бярынды: Ватъ: вѣдро, албо мѣра ѡ шести и тридцѧти *квартъ* албо кадь, кѳфа (Бяр., 14).

Слова *кварта* запазычана старабеларускай мовай з лацінскай (лац. *quarta* 'чвэрць'), магчыма, праз польскае пасрэдніцтва. З метрычным значэннем яно ўжывалася ва ўкраінскай мове. Гэта адзінка ўваходзіла ў склад сістэмы мер Вялікага княства Літоўскага, яе велічыня — чвэрць гарца.

Са значэннем адзінкі вымярэння ўжывалася таксама памяншальная форма *кватерка*: Тому жъ Шкутку купили горелки *кватерки* две... (ГЮМ, XVIII, 83, 1691). Гэта таксама была дзяржаўная мера, велічыня яе — $^1/_4$ кварты.

Прымаючы пад увагу тое, што слова *кварта* было запазычана старабеларускай мовай са значэннем меры, можна сцвярджаць, што яно пашырыла семантыку і набыло значэнне 'пасудзіна': А другой дочце моей Настаси, отписую котелъ горелочный зъ с трубами, *кварту* одну цыновую... (ГЮМ, XX, 471, 1596). Утварэнне такога значэння паказвае, што не толькі словы з першапачатковым значэннем 'пасудзіна' набывалі значэнне адзінкі вымярэння,

але і словы са значэннем 'мера' набывалі значэнне 'пасудзіна'.

У сучаснай беларускай мове ў творах старэйшых пісьменнікаў са значэннем меры выяўлены словы *кварта, паўкварта, кватэрка*: Райскі... вывалак з-за школьных папак *кварту* гарэлкі і ўрачыста паставіў яе на стол (Колас, IX, 47); Мамка! І ты ж дзядзьку частавала таксама — яечняй і *паўквартай* (Колас, IV, 242); А! якая там плата,— махнуў рукою Піліп: — І на *кватэрку* гарэлкі не выкраіш (Колас, IX, 385). У дыялектнай мове слова *кварта* са значэннем 'конаўка' ўжываецца па ўсёй тэрыторыі Беларусі (ДАБМ, к. 248).

* * *

У старабеларускай мове ўжывалася яшчэ некалькі адзінак вымярэння сыпкіх рэчываў і вадкасці, якія першапачатковым значэннем і спосабам утварэння метрычнага значэння адрозніваюцца ад тых, якія ўжо аналізаваліся, і не могуць быць аб'яднаны ў якую-небудзь групу. Таму яны аналізуюцца асобна.

Солодъ — адзінка вымярэння соладу, прарошчанага на піва ці на гарэлку збожжа: *солодовъ* ячныхъ двадцать, в кождомъ по три солянки...; ...у другой клети... *солодовъ* пшеничныхъ осмъ (АВАК, XXII, 237, каля 1566 г.).

Ужыванне гэтага слова з метрычным значэннем звязана з тым, што на адзін затор (вар) піва ці гарэлкі ідзе пэўная колькасць прарошчанага зерня. Слова *солодъ*, такім чынам, абазначала не толькі рэчыва — прарошчанае збожжа, але і пэўную колькасць гэта-

га збожжа, што садзейнічала набыццю метрычнага значэння.

Варъ — адзінка вымярэння піва: А люди на нихъ варать дванадъцать *варовъ* пива (РИБ, XXVII, 465, 1488); въ Кодню взяломъ пива въ корчми той *варъ* целый за копъ 8 литовскихъ (АС, IV, 308, 1599). Як сінонім гэтага слова са значэннем меры ўжывалася *пиво*: а на владычина поезника варать *пивъ* зиме 12, а лете 12 (РИБ, XXVII, 468, 1488).

Слова *варъ* у старабеларускай мове ўжывалася таксама са значэннямі: месца варэння піва (з такім значэннем ужывалася і слова *пиво*): А того здавна не бывало, што владычнымъ бояромъ ездити по тымъ жеребъемъ много, нижъли тол[ько] одно посельникъ ездить по тымъ *варомъ* пивнымъ, поки объедеть пива, а объехавъши пива, прочь едеть (РИБ, XXVII, 474, 1488); плата за варэнне піва: з села Ощередского подданые его королевской милости довати повинни: меду прѣсного пуды два, *вара* за тымъ медомъ давати грошей литовскихъ двадцать восьмъ (АВАК, XIII, 240, 1589). Такая плата, відаць, давалася тады, калі даннік плаціў падатак не кіслым мёдам, а прэсным.

Яшчэ ў «Повести временных лет» са значэннем 'пэўная мера мёду або піва' ўжывалася слова *провара*: Избывъ же Володимеръ сего, постави црквъ, и створи праздник, варѧ т҃ *проваръ* меду (Сразн., II, 1512). Слова *перевара* І. Сразнеўскі зафіксаваў са значэннем 'чан для варки меда и пива, как мера'; 'варница пива и меда, место, где варят пиво и мед'; 'пошлина за варку пива и меда' (Сразн., II,

897). Слова *варъ* са значэннем меры ўжывалася ва ўкраінскай мове [31]. Усё гэта дае падставы лічыць, што такое значэнне ўтварылася ў агульнаўсходнеславянскі перыяд. Утварэнне яго звязана з тым, што пэўная колькасць піва, затор (вар) была абкладной падатковай адзінкай. Пэўным жа падаткам магла абкладацца пэўная колькасць піва, якая, відаць, устанаўлівалася практыкай.

На думку М. Доўнар-Запольскага, *варъ* быў роўны тром бочкам гандлёвым [32].

Яшчэ ў мінулым стагоддзі І. Насовіч выявіў гэта слова са значэннем адзінкі вымярэння: *Вар* пива. Два *вары* меду (Нас. СБН, 44).

Дякло — адзінка вымярэння сыпкіх рэчываў: Съ того жъ двора Волчина взялъ панъ Литаворъ дванадцать *дяколъ* жита (РИБ, XX, 875).

Гэта слова паходзіць з літоўскай мовы — літ. *duokle* 'даніна' (Брукнер, 108). У старабеларускай мове яно мела значэнне 'збожжавы падатак': А *дяколъ* дають 18, а по четыры бочки жыта въ *дяклѣ*, по четыре овса (Люб., VIII). Паколькі *дякло* (падатак) складалася з пэўнай колькасці збожжа, то гэта слова набыло метрычнае значэнне. Праўда, нельга сказаць, што такая мера атрымала шырокае распаўсюджанне, відаць, яна ўжывалася толькі тады, калі мералі збожжа, якое аддавалі як падатак.

---

[31] В. Винник. Назви одиниць виміру і ваги..., стар. 114.

[32] М. Довнар-Запольский. Государственное хозяйство Великого княжества Литовского при Ягеллонах, стар. 451.

Лаштъ — шырока ўжывальная адзінка вымярэння сыпкіх рэчываў: ...ни одного *лашту* попелу за то не обецовалъ (РИБ, XXVII, 700, 1489); Сума всее соли со всихъ с тыхъ коморъ двадцать тисячей *лаштовъ* и чотыриста и 50 *лаштовъ* и 4 *лашты* и 14 бочокъ (АЛРГ, 178, 1522); ...насѣнья ильняного *лашты* г (3) (АВАК, XIV, 645, 1601).

Гэта адзінка запісана як асноўная мера попелу і смалы ў прывілеях на Магдэбургскае права: ...продавати и куповати... попелъ, смолу — *лаштомъ*... (РИБ, XXVII, 741—742, 1499).

Некаторыя даследчыкі адносяць *лашт* да адзінак вагі, у прыватнасці М. Кастамараў, Н. Усцюгоў [33], а таксама В. Віннік. У слоўніках звычайна даюцца два значэнні гэтага слова: «мера, содержащая в себе 12 четвертей или вес в 120 пудов» (Нас. АУ, 128 адв.). Такія самыя значэнні дае і В. Бурнашоў, толькі крыху ўдакладняе другое: «Вес, коим измеряются грузы перевозных судов, содержащий в себе 120 пудов» (Бурнашоў, I, 353). Такім чынам, *лаштъ* — гэта адзінка вымярэння сыпкіх рэчываў і адзінка вызначэння грузападымальнасці суднаў. Так, у Гданьску карабельны лашт — 32 цэнтнеры (адзінка грузападымальнасці). Ён прыраўноўваўся да двух вазоў па чатыры кані, або да чатырох вазоў па два

---

[33] Н. Костомаров. Очерк торговли Московского государства в XVI и XVII ст. СПб., 1862, стар. 168; Н. Устюгов. Очерк древнерусской метрологии.— Исторические записки АН СССР, т. XIX, 1946, стар. 344.

кані [34], г. зн. на сушы служыў як адзінка вымярэння. Неабходнасць вызначэння грузападымальнасці судна спрыяла ўтварэнню значэння 'мера сыпкіх рэчываў', а на сушы *лаштъ* якраз і з'яўляўся такой мерай.

Слова *лаштъ* запазычана з нямецкай мовы (ням. *last* 'цяжар, груз'). З метрычным значэннем яно ўжывалася таксама ў рускай і польскай мовах.

У старабеларускай мове ўжывалася слова *лаштовое* са значэннем 'плата, падатак' (магчыма за вымярэнне): зъ *лаштового* з ваги и зъ иншихъ доходовъ мѣскихъ... такій пожитокъ собе брати маютъ... (АС, I, 277, 1634); арендовалисмы мѣщаномъ тогожъ мѣста Полоцкого... доходы мѣскіе, то есть *лаштовое* (АС, I, 277, 1634).

У сучаснай беларускай літаратурнай мове выяўлены толькі адзін выпадак ужывання слова *лашт* у артыкуле на гістарычную тэму: ...Фёдар Кісялёнак... прывёз потым забраную ў яго маёмасць, а таксама 40 *лаштаў* панскай шмальцугі ва ўладанне свайго пана (В. Мялешка, «Маладосць», 1971, № 1, 201). У «Руска-беларускім слоўніку» рускаму слову *ласт* 'мера' даецца беларускі адпаведнік *ласт,* у «Беларуска-рускім слоўніку» таксама зарэгістравана гэта слова з паметамі «марское» і «мера».

---

[34] A. Gilewicz. Studija z dźijów miar i wag w Polsce.— «Sprawozdanie Towarzystwa Naukowego we Lwowie», r. XVI, 1936, стар. 320.

НАЗВЫ АДЗІНАК ВАГІ

Назвы адзінак вагі, што ўжываліся ў старабеларускай мове, даволі цяжка паддаюцца класіфікацыі паводле іх першапачатковага значэння з той прычыны, што пераважная большасць іх з'яўляюцца запазычаннямі рознай пары. Таму словы гэтай групы падзяляюцца для аналізу на два разрады ў залежнасці ад іх паходжання: адзінкі агульнаўсходнеславянскага (беларускага) паходжання; запазычаныя адзінкі вагі.

Характэрна, што сярод запазычаных слоў пераважаюць тыя, якія ў той мове, з якой яны запазычаны, мелі значэнне 'вага', 'цяжар'. Нязначную групу складаюць назвы, утвораныя ад лічэбнікаў.

АДЗІНКІ ВАГІ АГУЛЬНАЎСХОДНЕСЛАВЯНСКАГА (БЕЛАРУСКАГА) ПАХОДЖАННЯ

Камень — адзінка вагі, якая часцей за ўсё ўжываецца ў помніках старабеларускага пісьменства. У адрозненне ад іншых адзінак, якія служылі для вызначэння колькасці або аднаго тавару, або пэўнай групы тавараў,

камень не быў абмежаваны ва ўжыванні. На *камені* важылі:

цвёрдыя рэчывы (масу): стали *каменей* 35, ...свинцу *каменей* 9 (АС, III, 302, 1583); лою шмальцованого *каменей* ро (170) (АВАК, XIV, 651, XVI ст.);

сыпкія рэчывы: насенья цыбульного *каменей* 2 (АС, III, 304, 1583); с тое клети взялъ соли белой *каменя* полтора... (АВАК, XXXIX, 217, 1579);

вадкасць (мёд): ...взял меду пресного *камени* три (АВАК, XXXIX, 371, 1590);

іншыя тавары: взято... льну тертого тысячу; конопель тертыхъ полторы тысячи; пряжи напряденое въ клубкахъ — *каменей* сто (АВАК, III, 287, 1577); аеру *каменей* 2 (АС, III, 306, 1583). У мытнай грамаце віленскім гандлярам сярод тавараў, якія важыліся на *камені*, названы воск, пянька, хмель, перац, рыс, мігдалы, слівы, кмен, галун, бабкі, імбер і інш. (АЗР, IV, 249—250, 1605). Пра шырокае ўжыванне гэтай адзінкі сведчыць тое, што ёй карысталіся для ўдакладнення іншых спосабаў вызначэння колькасці: воску штук д; в нихъ важить *каменей* рої (119), лою шмальцованого фас ш (18) и следевок θ (9) в нихъ важить *каменей* хм (640) (АВАК, XVIII, 65).

Вагавы эквівалент *каменя* не быў пастаянны і аднолькавы. Я. Ісаевіч лічыць, што ў Вільні ў 1544 г. ён важыў 34 фунты [1]. У Пінску, як сведчаць дакументы, ...каждый *камень* важитъ по фунтовъ тридцати и шести. Велічы-

[1] Я. Ісаевич. Деякі питання української метрології..., стар. 10—12.

ня гэтай адзінкі вагалася ад 32 да 40 фунтаў. Пастановай сейма 1766 г. велічыня *каменя* зацверджана з 40 фунтаў [2].

У помніках гэта слова выяўлена і са значэннем 'гіра': и при вазе маюць мети *камень* и гирю, и безмень — все посполу... (АЛРГ, 216, 1529). Гэта значэнне адзначае І. Сразнеўскі ў Вітаўтавай грамаце 1395 г.: Тивуномъ дохода ихъ безменомъ не давати имъ тивуномъ доходъ у нашъ *камень* вѣсячии у Меньскіи (Сразн., I, 1188).

На нашу думку, развіццё значэння адзінкі вагі ў слове *камень* звязана з тым, што камень (мінерал) ужываўся ў якасці гіры, таму гэта слова набыло значэнне 'гіра', якое і выяўлена ў ранніх помніках беларускага пісьменства І. Сразнеўскім. Паколькі гірай мог быць не любы камень, а толькі той, які меў пэўную вагу — калі б ужываліся камяні рознай велічыні, то вагу рэчыва вызначыць было б немагчыма, — слова *камень* набыло значэнне 'пэўная адзінка вагі'. Як сведчыць А. Семянтоўскі, яшчэ ў канцы XIX ст. на Віцебшчыне як гіры ўжываліся камяні, на якіх былі выбіты лічбы — адзінкі вагі [3]. Пазней, відаць, гэта адзінка была выцеснена больш распаўсюджаным пудам, які ўваходзіў у сістэму мер Расіі.

Ад слова *камень* 'адзінка вагі' ў старабеларускай мове ўтварылася слова *каменщизна* 'плата за гандаль у горадзе': ...Жаловали на мещанъ и резниковъ места Могилевского... иж

[2] С. Гольдштейн. Польско-литовские древности, стар. 142.

[3] А. Сементовский. О мерах и весах, употребляемых в Витебской губернии, стар. 16.

они водлуг ревизии,.. с повинности *каменицизны* по пятнадцати грошей платити не хочут (АВАК, XXXIX, 396, 1579).

Гривна — у помніках старабеларускага пісьменства адзінка вагі каштоўных металаў: Коновъ серебряная, великая, позлотистая в три вѣнки — въ которой важить дей *гривень* серебра тридцать (АВАК, III, 121, 1577); Чарка сребраная во двѣ *гривнѣ* коштовала золотыхъ дванадцать (АС, I, 250, 1616).

Гэта слова агульнаўсходнеславянскага паходжання, яно ўтварылася ад назоўніка *грива* і першапачаткова мела значэнне 'жаночае ўпрыгожанне'. Паколькі на такое ўпрыгожанне ўжываліся залатыя і сярэбраныя манеты, слова *гривна* набыло значэнне 'грашовая адзінка', з якім ужывалася ў агульнаўсходнеславянскай мове і якое захавалася ў старабеларускай — *гривна* была дзяржаўнай грашовай адзінкай у Вялікім княстве Літоўскім, яе кошт — 48 грошаў. Паколькі каштоўнасць грашовай адзінкі вызначалася яе вагой, г. зн. грашовыя адзінкі мелі пэўную вагу, то за назвай грашовай адзінкі замацаваўся пэўны колькасны эквівалент. Тая *гривна*, якая ўжывалася на Беларусі, важыла 195,9 грама, прыблізна палавіну фунта [4].

Значэнне адзінкі вагі гэта слова мела ў рускай і ўкраінскай мовах [5].

З такім самым значэннем у старабеларускай мове ўжывалася памяншальная форма

[4] С. Гольдштейн. Польско-литовские древности, стар. 142.

[5] В. Винник. Назви одиниць виміру і ваги..., стар. 125.

гривенка: Труханъ с[ъ] Торопца жаловал о-том ижъ взято в него: ...две решета гороху, две *гривенки* соли (БА, II, 21, 1530); а они емлють по *гривенкѣ* перцу, на старосту емлють по *гривенкѣ* перцу (Зб., 9).

На думку І. Каўфмана, гэта адзінка разам з *гривной* з XIV ст. займала цэнтральнае месца ў сістэме мер Маскоўскай дзяржавы і ўжывалася для важання золата і серабра, а таксама пораху, ладану і інш.[6]

У сучаснай беларускай мове слова *грыўня* ўжываецца са значэннем 'грашовая адзінка' як гістарызм, а таксама 'пятнаццацікапеечная манета' (БРС, 217).

Золотникъ: я дал[ъ] робити пятьдесятъ *золотниковъ* и два серебра, а шолъку пят[ъ]-десять же *золотниковъ* (БА, II, 20, 1530); а десять *золотниковъ* ровного жемчугу, а *золотникъ* по копе грошей (АЗР, II, 58, 1508). Як адзінка вагі каштоўных металаў гэта слова ўжывалася ў дагаворах Рыгі з Полацкам: а серебрыныи весы Рызьскии держати болии Полочъкихъ весовъ серебреныхъ *полузолотникомъ* (РЛА, 119, 1405). У рускай мове гэта слова мела значэнне 'грашовая адзінка': «Золотникъ — денежная единица в новгородском денежном счете» (Кочын, 129).

Слова *золотникъ* утварылася ад назоўніка *золото* і першапачаткова мела значэнне 'грашовая адзінка'. Метрычнае значэнне яно набыло таксама, як і *гривна.* У сучаснай беларускай мове ўжываецца са значэннем адзінкі вагі як

---

[6] И. Кауфман. Русский вес, его развитие и происхождение. СПб., 1906, стар. 7—8.

устарэлае, а таксама як тэхнічны тэрмін (БРС, 292).

Як бачым на прыкладзе *гривны* і *золотника,* грашовыя адзінкі выконвалі функцыю адзінак важання каштоўных металаў і набывалі трывала замацаваную вагавую функцыю. Некаторыя грашовыя адзінкі Вялікага княства Літоўскага таксама ўжываліся як адзінкі вагі каштоўных металаў. Такую функцыю выконвалі *талеръ, золотой, рубль, скоецъ:* У великой чарѣ позлотистой зъ ушицами гривень 12 и полъ, 11 *скойцевъ* (АС, III, 251, 1577); Коновъ серебряная, великая позлотистая, въ три вѣнки въ которой важить дей серебра тридцать, а позолоты *золотыхъ чирвоныхъ* чотырнадцать (АВАК, III, 251, 1577).

Шырока ўжывалася на Беларусі адзінка вагі *берковецъ* (*берковескъ, берковискъ*): взялъ в него товару его четырнадцать *беръковесковъ* сала (БА, II, 27, 1530); ...такий пожитокъ собе брати маютъ: напродъ важчого пенязей осмъ, одъ *берковиска* пеньки грошы два Литовскихъ, ...отъ *берковиска* соли грошъ Литовский, отъ *берковиска* лою гроши два Литовскихъ... (АС, I, 277—278, 1634); Купили... *берковец* штабы, сторговали *берковецъ* талеровъ битыхъ дванадцать (ГЮМ, X, 8, 1691).

Гэта адзінка шырока выкарыстоўвалася ў гандлёвых зносінах паміж Полацкам і Рыгаю. Не выпадкова ў дагаворы рыжан з палачанамі запісана спецыяльнае ўзгадненне вагавых адносін рыжскага і полацкага *берковца:* А восковый весъ держати по старому закону, штоже нашъ *берковеск* восковый болши вашего *беръковьска* полулудом Ризьского весу... а *бер-*

ковескъ солоный учинити у восковыи *берковьскъ* (РЛА, 120, 1405). Пра шырокае ўжыванне *берковца* ў гандлёвых зносінах Рыгі з Полацкам сведчыць і тое, што ён служыў для вызначэння колькасці (ці кошту) іншых тавараў, якія не важыліся: И потом, княжо, ты на другыи день емъ его сковалъ еси и дѣржалъ его еси до того же дне, а товара еси от-ялъ на г *берковъскы* воску (РЛА, 26, 1299—1307).

Гэта слова выяўлена ў помніках агульнаўсходнеславянскага перыяду — у грамаце Усяслава, напісанай да 1135 г. (Сразн., I, 71).

Даследчыкі лічаць, што яно было запазычана са шведскай мовы, але думкі пра характар запазычання разыходзяцца. Так, А. Праабражэнскі адзначае, што са шведскай мовы было запазычана слова *biaerkö* 'адзінка вагі на 400 фунтаў' (Праабр., I, 24). У М. Фасмера погляд на характар запазычання іншы: ён лічыць, што запазычана была складаная назва *бьрковьскъ пѫдъ* 'мера вагі горада Б'ёркё на востраве Меларэн' (Фасм., I, 157), г. зн. мегрычнае значэнне мела слова *пѫдъ,* а прыметнік *бьрковьскъ* паказваў прыналежнасць гэтай адзінкі да пэўнай мясцовасці. Калі прыняць пад увагу марфалагічнае афармленне гэтага слова — суфікс *-ьскъ,* які ў далейшым змяніўся і набыў форму *-ьцъ(-ец),* то думка М. Фасмера больш дакладная. Больш таго, меркаванне М. Фасмера дае падставы лічыць, што назва гэтай адзінкі ўтварылася на глебе агульнаўсходнеславянскай мовы — права на такі вывад дае тое, што субстантываваны прыметнік, які прыняў на сябе значэнне складанай

назвы (*бырковьскъ пѫдъ*), утварыўся на глебе агульнаўсходнеславянскай мовы.

Магчыма, што ў старабеларускай мове (у суседніх славянскіх мовах не выяўлены) з дапамогай скарочанай формы лічэбніка *полови-на* (*пол-*) утварылася адзінка вагі *полберковецъ* (*полуберковескъ*), якая была зацверджана як адна з асноўных адзінак у прывілеях на Магдэбургскае права: Тежъ кроме Вилневцомъ ни одинъ купецъ иного места не будеть моцы мети инако куповати и продавати, только подъ тою мерою, въ томъ листе на долу выписаною: напервей воски — штукою, або по *полуберъковеску*... (РИБ, XX, 741—742, 1499).

Слова *беркавец* вызначаецца ўстойлівасцю да семантычных змен і ў сучаснай беларускай мове захоўвае значэнне 'адзінка вагі на 10 пудоў': Два *беркаўцы* сена купіў сяголета, свайго не хапіло (Рэдкавічы, МКДЭ МПІ). У літаратурнай мове яно ўжываецца рэдка. У творах мастацкай літаратуры выяўлены толькі адзін прыклад, дзе гэта слова ўжываецца ў словазлучэнні, якое мае значэнне 'вельмі многа': Выслужыць многа я не мог. Служылі з нашых адзінкі, сувязяў няма. Далей служыць не было сэнсу. А такіх армецаў было там трыста *беркаўцаў* ды яшчэ напарстак (Караткевіч, 2, 228). Можна яшчэ прыгадаць «цётку Беркавец» з аповесці У. Дубоўкі «Ганна Алелька».

ЗАПАЗЫЧАНЫЯ АДЗІНКІ ВАГІ

Запазычаных адзінак вагі і іх назваў больш у параўнанні з адзінкамі аўтахтоннага паходжання. Такую з'яву можна вытлумачыць шырокімі гандлёвымі зносінамі Вялікага кня-

ства Літоўскага і асаблівасцю (найбольшай універсальнасцю) гэтага спосабу вызначэння колькасці рэчыва. Пры дапамозе важання можна вызначыць колькасць як сыпкіх і вадкіх рэчываў, так і масы.

Безменъ — адзінка вагі, якая даволі часта трапляецца ў помніках старабеларускага пісьменства: купил масла полпета *безмена* за грошей двадцать одинъ (АВАК, XXXIX, 368, 1579); Купили железа ...пудовъ і и *безменовъ* б̃... (ГЮМ, I, 65, 1679).

Пільная ўвага многіх даследчыкаў (І. Сразнеўскі, А. Праабражэнскі, Н. Гараеў, Г. Кочын, М. Фасмер, А. Брукнер, А. Сабалеўскі) да слова *безмен* бадай-што лепш за ўсё пацвярджае складанасць выяўлення крыніцы яго паходжання. Меркаванне А. Бернэкера і А. Сабалеўскага пра ўсходнеславянскае паходжанне гэтага слова абвяргаецца М. Фасмерам як неабгрунтаванае (Фасм., I, 144—145). Думка Расенена, якую прыводзіць М. Фасмер, — гэта слова паходзіць ад чувашскага *vismen* 'мера (мерка)' ад *vis* 'мераць'—і якая паўтараецца ў слоўніку М. Шанскага і інш., не можа быць прынята як бясспрэчная, таму што калі б слова было запазычана са значэннем 'мерка (прылада вымярэння)', то тады адным з магчымых шляхоў развіцця семантыкі яго ў агульнаўсходнеславянскай мове мог быць наступны: чувашскае *vismen* 'мера (мерка)' агульнаўсходнеславянская мова запазычвае з такім самым значэннем (бо іншых аўтары этымалагічных слоўнікаў не даюць), на глебе агульнаўсходнеславянскай мовы развіваецца

значэнне 'вага (прылада важання)', а потым 'адзінка вагі'. Аднак невядома, з якім значэннем—'адзінка вагі' ці 'прылада важання' (або нават вымярэння)—было запазычана гэта слова. Больш таго. Першы раз ва ўсходнеславянскіх помніках яно трапляецца са значэннем 'адзінка вагі' ў дакуменце, напісаным у 1396 г. на тэрыторыі Беларусі: Дали есьмо нашу грамоту Борисовцомъ, што же тивуномъ дохода их *безмѣномъ* не давати, но давати... у нашъ камень вѣсячіи Менскій (АЮЗР, I, 2, 1396). Калі ж прыняць пад увагу агульны характар утварэння запазычаных адзінак вагі (тое, што большасць іх мела першапачатковае значэнне 'вага', 'цяжар'), то можна пагадзіцца з думкай А. Брукнера, які лічыў, што гэта слова запазычана з цюрскіх моў: *wezne* 'вага', *wezmin* 'цяжкі', з арабскай *wëznä* 'вага', *wazn* 'цяжар' (Брукнер, 23).

У больш позніх помніках старабеларускага пісьменства гэта слова трапляецца і са значэннем 'прылада важання', якое, магчыма, утварылася на глебе агульнаўсходнеславянскай ці старабеларускай мовы: Штожъ в сий-ж годъ и по за в сийж годъ Гнездиловцы пану его м[и]л[о]сти дань даивали на свой *безменъ*. Ино тымъ *безъменомъ* важучи, черес[ъ] тые два годы пану его м[и]л[о]сти дань не сполна выходила (БА, II, 257, 1534); ...*безменовъ* два пограбилъ (АВАК, XXVI, 316, 1586).

Адзінка вагі *безменъ* не была ўвесь час нязменнай, пра што сведчаць указанні і ўдакладненні яе вагі ў помніках: За дань медовую, яко много пудовъ на которое село альбо обрѳбъ вложоно и описано, за кождый пудъ

мѣры данное у *шесть безменовъ,* по грошей трыдцать чотыры (АС, I, 181, 1594); И тежъ беруть из собою важчых а важеть за кожды пуд по *5 безменовъ,* а перед тымъ метывали по *4 безмены* в пуд. На основе такіх удакладненняў можна ўстанавіць, што *безменъ* у XVI ст. — 6—10 фунтаў. Дз. Празароўскі дае яго велічыню ў Маскоўскай дзяржаве на 10 фунтаў[7], а Я. Ісаевіч — на 8—9 фунтаў[8].

У сучаснай беларускай мове слова *бязмен* значэння 'адзінка вагі' не мае, захавалася толькі значэнне 'прылада важання': Потым ён (гаспадар. — *К. С.*) вынес з сяней торбу з *бязменам,* паважыў:— На, бяры, свае хунты.— Вага есь, *бязмену* твайму не веру. Нясі на вагу. (М. Лобан, «Полымя», 1967, № 2, 46).

Литра. Гэта адзінка вагі мела лакальны характар ужывання, яна выкарыстоўвалася толькі пры важанні шоўку, які прадаваўся на вагу: ...а взялъ изъ скрынки тоѣ... двѣ *литры* шолку червчатого, а тесьма шолку зеленого (АЗР, II, 58, 1508); Взяли есмо шолку тридцать пять *литер* (АВАК, XXXIX, 286). Гэта была асноўная адзінка пры аптовым гандлі, пра што сведчаць прывілеі на Магдэбургскае права: ...тежъ мають продавати сукна поставомъ, китайки и тафты кускомъ, шолки *литрою...* (АЗР, II, 91, 1511).

Слова *литра* 'грашовая адзінка, грыўна, адзінка вагі' выяўлена ў помніках агульнаўсходнеславянскага пісьменства X ст. (Сразн.,

---

[7] Д. Прозоровский. Монета и вес в Русском государстве, стар. 258.

[8] Я. Ісаевич. Деякі питання української метрології, стар. 10—12.

III, 26). А. Праабражэнскі лічыць, што яно паходзіць са старажытналацінскай мовы, дзе *lithra* — 'вага, ватэрпас', якое потым змянілася ў лацінскай мове і прыняло форму *litra* 'адзінка вагі' і 'манета' і ў такой форме перайшло ў грэчаскую мову (Праабр., I, 452). Што ж да вагі *литры*, то, на думку І. Каўфмана, грэчаская *литра* была роўнай рымскай *либре,* бо рымляне пасля заваявання краіны пакінулі старую назву адзінкі вагі (г. зн. грэчаскую *литру*), але ўвялі вагавы эквівалент сваёй *либры.* На аснове вылічэнняў І. Каўфман прыходзіць да вываду, што Кіеўскай Руссю была запазычана пад назваю *литра* адзінка вагі, якая мела вагавы эквівалент рымскай *либры* (327, 456 г) і якую запазычылі ўсе народы Заходняй Еўропы [9].

Пранікненне ва ўсходнеславянскую мову слова *литра,* відаць, звязана з тым, што шоўк на ўсходнеславянскія землі прывозіўся на продаж з-за мяжы. Разам з прывазным таварам была прывезена адзінка вагі і яе назва. Старабеларуская мова наследавала слова *литра* з агульнаўсходнеславянскай мовы.

У сучаснай беларускай мове ўжываецца адзінка вымярэння вадкасці *літр* (у народных гаворках *літра, літар*), якая запазычана пазней з французскай мовы: — Ат, што там людскае па тых кніжках будзе... Газы *літру* дадуць ды яшчэ мо фунт селядцоў (М. Лобан, «Полымя», 1967, № 3, 62).

---

[9] И. К а у ф м а н. Русский вес в его развитии и происхождении, стар. 69—70.

Пудъ — адна з асноўных адзінак вагі ў сістэме меры і вагі Вялікага княства Літоўскага. Гэта слова прыйшло з нямецкай мовы, дзе *Pfund* — 'адзінка вагі'. З такім значэннем яно, відаць, было запазычана, бо з ім яно атрымала найбольш шырокае распаўсюджанне. Генетычна яно звязана з лацінскім *pondus* 'вага', *pendere* 'важыць'.

У агульнаўсходнеславянскай мове гэта слова было вядома і з агульным значэннем 'вага': Аще вощный *пудъ* исказиться, лежить капъ святіи Богородици на горѣ... то тымъ *пудъ* измѣряче, право учинити (Даговор смаленскага князя з Рыгай 1229 г., ВС, 16). Тут слова *пудъ* мае значэнне 'вага' і 'вагавы эталон'. Пра існаванне агульнага значэння 'вага' сведчыць таксама той факт, што ў старабеларускай мове (у дагаворы Полацка з Рыгай) ужываецца прыметнік *пудъный*, значэнне якога можна вызначыць як 'вагавы, той, што ўжываецца для важання': А соль весите *пудънымъ* ременемъ, по старому закону (РЛА, 119, 1405).

У помніках старабеларускага пісьменства *пудъ* — 'адзінка вагі мёду, воску, радзей іншых рэчываў (металу)': дають 20 *пудовъ* дани меду (РИБ, XXVII, 20, 1461); напродъ важчого отъ *пуда* воску пенезей осмъ..., одъ *пуда* мѣди и одъ *пуда* цыны пенезей осмь (АС, I, 277, 1634). Велічыня гэтай адзінкі мянялася ад 40 да 50 фунтаў.

У помніках старабеларускага пісьменства выяўлена адзінка вымярэння, якая называлася *пудовня:* Данилью три чоловеки, дають дей *пудовню меду* (РИБ, XXVII, 70); *пудовню* меду малиновную (АЛРГ, 135, 1509). Гэта слова

ёсць у І. Насовіча: «*пудовня*. Мера, содержащая в себе пуд весу» (Нас. АУ, 365 адв.—366). Такім чынам, *пудовня* — 'адзінка вымярэння сыпкіх рэчываў', аб'ём яе адпавядае пуду вагі. Узнікненне гэтай адзінкі звязана, відаць, з тым, што ў асобных выпадках трэба было вызначыць вагу пры адсутнасці прылад важання, якія, магчыма, былі больш дэфіцытнымі, чым прылады вымярэння — пасудзіны.

У сучаснай беларускай мове слова *пуд* не страціла значэння адзінкі вагі: Каля яе (жанчыны. — *К. С.*) на невялікім, *пудоў* на пяць, камені, стаяла босая дзяўчынка (М. Лобан, «Полымя», 1967, № 1, 33); Ад вашага сяла мне належыць дванаццаць *пудоў* трыццаць фунтаў жыта (Колас, IX, 94). Яно ўжываецца ў некаторых фразеалагічных словазлучэннях. Фразеалагізм «з'есці не адзін пуд солі» мае значэнне 'пражыць разам, перажыць многае з кім-небудзь': А некаторыя з тых, з кім ён, Антанюк, *з'еў не адзін пуд солі,* хто не раз кляўся ў дружбе, падкідвалі і такое: за нязгоду з палажэннямі партыі. Прывыклі думку аднаго чалавека, часам даволі спрэчную, выдаваць за палітыку партыі... (І. Шамякін, «Полымя», 1968, № 2, 9). І. Насовіч занатаваў прыказку «Морозъ, сорокъ *пудовъ* на возъ», калі гавораць пра лёгкую дарогу на марозе, і загадку «Самъ худъ, а голова зъ *пудъ*» (Бязмен) (ОРЯС, 79).

Вытворных ад слова *пуд* у сучаснай беларускай мове нямнога. Прыметнік *пудовы* мае значэнне 'вагою на пуд' і 'вельмі цяжкі': І вось аднойчы правёў яе, развітаўся, спускаюся па лесвіцы, а насустрач мне — дзяцюк. Здараві-

ла, метры можа на два. Хапае загрудкі, пад нос — *пудовы* кулак (Л. Гаўрылкін, «Полымя», 1968, № 1, 92); Багата рыбы ў Свіслачы. Трапляюцца часта тут *трохпудовыя* самы... (М. Паслядовіч, II, 99). І. Насовіч зарэгістраваў таксама дзеяслоў *пудзіць* 'пудамі купляць што-небудзь на харч, купляць на вагу': Мы въ городзѣ живучи, усё *пудзимъ* да *пудзимъ* (Нас. СБН, 538).

На абмежаванай тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага (толькі ва Упіцкім павеце) ужывалася метрычная адзінка, якая называлася *пундель:* У возе было ечменю бочка меры крокиновское, гороху полбочки, соли *пундели* два (АВАК, XXVI, 131, 1585). Велічыня гэтай адзінкі была 25 фунтаў (Карл., V, 433). З. Даўнене, спасылаючыся на К. Яблонскіса, лічыць, што гэта слова ўвайшло ў старабеларускую мову з літоўскай (*pundelis)* [10]. У слоўніку Г. Кочына зарэгістравана слова *пунъд* з метрычным значэннем (3 *пунъды* пшеніч), якое ён выявіў у «Рэвельскіх актах» і растлумачыў як адзінку вагі, параўноўваючы са словам *пуд* (Кочын, 228).

У сучаснай літоўскай мове pundas, pundulus — 'звязка, скрутак, клунак, цюк, пук'[11].

Фунтъ — адзінка вагі, што шырока выкарыстоўвалася на ўсёй тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага. Гэта слова мае аднолькавую крыніцу паходжання са словам *пуд* (ням.

[10] З. Даунене. Из истории лексики, обозначающей единицы измерения в торговле в старом белорусском языке.— Ученые записки высших учебных заведений ЛитССР, т. 11. Языкознание, 1965, стар. 49—75.

[11] A. Lyberis. Lietuvių-rusų žodynas. Vilnius, 1970.

Pfund 'вага'), але запазычаны *фунтъ* пазней, таму мае іншае фанетычнае аблічча і колькасны эквівалент. Прывілеямі на Магдэбургскае права гэта адзінка была зацверджана як асноўная пры аптовым гандлі: Тежъ тые купцы чужыи ...подъ тую меру продавати мають... цытваръ и иншые зел[ь]я дорожшіе — *фунтомъ* (РИБ, XXVII, 703, 1498). На *фунты* важылі розныя рэчывы: ... за два *фунты* свинцу 16 пѣнязей (АС, XII, 20, 1538—1539); ...пороху одважили зъ подъ ратуши *фунтовъ* тридцать четыри (ГЮМ, IV, 130, 1686); Мыла въ дорогу *фунтовъ* три... (ГЮМ, X, 33, 1698).

Колькасны эквівалент фунта складаў ад 360 да 450 г, а паводле пастановы сейма 1766 г.— 374, 8282 г[12].

Гэта слова не змяніла значэння ў сучаснай беларускай мове, яно абазначае адзінку вагі на 400 г. У дыялектнай мове часцей ужываецца фанетычны варыянт *хунт*: Барыс (эсэр) сягоння даставіў у кантору тры *фунты* масла (Колас, IX, 700); Некалі ексяль усё малое *хунтамі* важылі. *Хунт* — чатырыста грамаў (МКДЭ МПІ). Ужываецца яно таксама са значэннем 'плата за памол у млыне і ўвогуле плата': Жыў (Басалыга Мірон. — *К. С.*) не бедна, не багата. Жыта на хлеб малоць у млын не вазіў, каб *хунты* не аддаваць, у свае жаронцы малоў (М. Лобан, «Полымя», 1967, № 2, 49); Здавай свае *хунты*. Дакуль цягнуць будзеш? (М. Лобан, «Полымя», 1967, № 2, 46). Ужываецца вытворнае *фунтоўка* 'ранні гату-

[12] С. Гольдштейн. Польско-литовские древности, стар. 142.

нак салодкіх груш', а таксама 'гатунак бульбы' (паведаміла М. А. Жыдовіч). Такую назву бульба і грушы атрымалі за вялікую вагу.

Лотъ — невялікая адзінка вагі, $^1/_{32}$ частка фунта (прыблізна 12 г): ...шесть *лотовъ* шолку черленого по шести грошей купленого (АВАК, XXVII, 141, 1549); гвоздикъ *лотовъ* четыри; цынамону *лотовъ* три... (ГЮМ, I, 21, 1679); купили дроту грубого до зегару s̃ *лотов* (ГЮМ, I, 94, 1680).

Гэта адзінка ўжывалася ў многіх заходнееўрапейскіх краінах. В. Махэк лічыць, што слова *лот* запазычана з кельтскай мовы (Махэк, 276). Н. Гараеў дае два значэнні: 'грузіла' і 'частка фунта (вага)' — і параўноўвае з французскім і нямецкім *loth* 'свінец, цяжар са свінцу, лот' (Гараеў, 192). М. Фасмер лічыць, што слова *лот* 'мера вагі' і 'прыбор для вымярэння глыбіні' было запазычана праз нямецкую ці галандскую або нават сярэдневерхненямецкую мову з кельтскай (Фасм., II, 522). У старабеларускай мове гэта слова ўжывалася толькі са значэннем адзінкі вагі, што дае падставу лічыць яго запазычаным з такім значэннем. У сучаснай мове з метрычным значэннем яно ўжываецца як устарэлае, а ў актыўным ужыванні знаходзіцца са значэннем 'прылада мераць глыбіню'.

Око. Гэта адзінка вагі ў помніках старабеларускага пісьменства трапляецца рэдка, яна выяўлена ў Магілёўскіх актах: [купили] апраку *око* у п. Розинковича... (ГЮМ, XVIII, 20, 1710); купили одно *око* апраку (ГЮМ, XVIII, 7). Выдаўцы «Гісторыка-юрыдычных матэрыялаў» тут жа растлумачваюць, што

око — вага, 3 фунты, а апрак — напітак. Слова *око* ёсць у слоўніку Б. Грынчанкі, яго значэнне 'мера вагі, 3 фунты' і 'мера вадкасці' (якога аб'ёму — невядома) (Грынч., III, 48). У адным дакуменце старабеларускага пісьменства ёсць такі прыклад: купили апраку *око* фунтовъ два и полъ, г. зн. *око* — адзінка вагі на 2,5 фунта. Калі гэта была адзінка вагі (а не мера вадкасці), то яна мае сувязь з цюркскім *ока* 'фунт' (Праабр., I, 643). Такая адзінка шырока ўжывалася на Украіне, адкуль, магчыма, і пранікла на Беларусь.

Цетнаръ (*центнаръ*) — асноўная адзінка вагі пры аптовым гандлі металам, запісаная ў прывілеях на Магдэбургскае права: Тежъ кроме Вилневцомъ ни одинъ купецъ иного места не будеть моцы мети инако куповати и продавати, только под тою мерою, в томъ листе на долу выписаною: ...железо, олово, медь, цыну, мосязь, и инъшыи речи таковъскіи — *цетънаремъ*... (РИБ, XXVII, 741, 1499).

Гэта слова прыйшло ў старабеларускую мову з лацінскай праз нямецкае і, магчыма, праз польскае пасрэдніцтва (лац. *centēnārius* ням. *Zentner*). Ужывалася яно ў чэшскай мове. У старабеларускай было вядома не толькі метрычнае значэнне слова *цетнаръ*, але і яго лічэбнікавае паходжанне (лац. *centēnārius* 'сто'). Гэта выклікала спарадычнае ўжыванне беларускага лічэбніка *сто* як адзінкі вагі там, дзе павінен быць *цетнаръ*. Так, у прывілеі Навагрудку запісана: продавати железо возом, белое железо бочкою або *стом*.

Пастановай сейма 1766 года велічыня *цетнара* зацверджана роўнай беркаўцу.

У сучаснай беларускай мове ўжываецца слова *цэнтнер* 'адзінка вагі, 100 кг'. Яно генетычна звязана са старым *цетнаремъ,* але запазычана другі раз разам з новай метрычнай сістэмай.

Кантаръ (*кинтаръ*) — адзінка вагі бавоўны (ужывалася рэдка): а што привезеть изъ Бесарабъ, или перецъ, или баволну или будь што: отъ 12 *кантари* у Бобковѣ полърубель серебра, а на головное мыто у Сочавѣ отъ 12 *кантари* одинъ рубель серебра (АЗР, I, 31, 1407); ...а пак оного товару продават не могучи, зложил весъ у в ымъбар у дому гостином, которого было тры мехи бавелны ваги турецъкой, а *кинтаровъ* одинадцат (АВАК, XXXIX, 170, 1579).

Апошні прыклад паказвае, адкуль была запазычана гэта адзінка вагі. *Кантаръ* генетычна звязаны з лац. *centēnārius,* але запазычаны іншым шляхам — праз грэчаскую, арабскую і турэцкую мовы, таму мае іншае фанетычнае аблічча. Такая адзінка вагі ўжывалася ў Расіі і на Украіне. Дз. Празароўскі лічыць, што вага яе была 2,5 пуда, яна была роўнай візантыйскаму цэнтнеру [13].

У сучаснай беларускай мове слова *кантар* М. Каспяровіч занатаваў са значэннем 'гіра' (Касп., 159), а І. Бялькевіч 'бязмен' (Бяльк., 220).

---

[13] Д. Прозоровский. Монета и вес в России до конца XVIII столетия. СПб., 1865, стар. 257.

АДЗІНКІ КОЛЬКАСЦІ

Апрача вымярэння і важання, даволі шырока ўжываўся яшчэ адзін спосаб вызначэння велічыні рэчыва — з дапамогай адзінак колькасці. Адзінкі колькасці, паводле азначэння «Большой Советской Энциклопедии», — «гэта велічыні, прынятыя за аснову параўнання тых велічыняў, якія вымяраюцца», бо звычайна кожная адзінка мае пэўны колькасны эквівалент.

Гэта група назваў адзінак найменш вывучана як у старабеларускай, так і ў іншых усходнеславянскіх мовах. Так, В. Віннік у працы «Назви одиниць виміру і вагі в українській мові», прысвечанай лексікалагічнаму аналізу метрычных адзінак, не разглядае іх зусім. Толькі асобныя адзінкі (*полоть, штука, постав*) аналізуюцца ў некаторых працах.

Калі параўнаць адзінкі колькасці з іншымі мерамі паводле сферы ўжывання, то можна ўбачыць некаторую абмежаванасць першых. Так, адзінкі вымярэння і вагі ўжываюцца пры вызначэнні колькасці многіх рэчываў, тады як адзінкі колькасці менш універсальныя, яны ўжываюцца для невялікай групы аднатыпнага рэчыва або нават аднаго пэўнага рэчыва.

У залежнасці ад першапачатковага значэння словы-адзінкі колькасці аб'ядноўваюцца ў групы, а ў асобных выпадках вылучаюцца невялікія групы ў залежнасці ад таго, колькасць якога рэчыва вызначаецца пры дапамозе той ці іншай адзінкі.

АДЗІНКІ КОЛЬКАСЦІ З ПЕРШАПАЧАТКОВЫМ ЗНАЧЭННЕМ 'ЗВЯЗКА', 'ВЯЗАНКА'

Словы гэтай групы ўжываліся як адзінкі колькасці тканіны, тытуню, лёну, пянькі, немалочанага збожжа, саломы, сена, скур.

Бунтъ — адзінка колькасці пянькі, скур, прадзіва: побрано речы мое... два *бунты* бели (АВАК, XXVIII, 40, 1592); ...пенки чистое *бунтовъ* тридцать шесть, у Бѣшенковичахъ бунтовъ шесть (АВАК, IX, 468, 1626); скуръ турецкихъ *бунтъ* цѣлый... (ГЮМ, XX, 19, 1711). Зрэдку ўжывалася і памяншальная форма *бунтикъ:* Еще купили отъ пана Озаринского бурмистра *бунтикъ* хребтовъ (ГЮМ, VIII, 94, 1691).

Пра паходжанне гэтага слова ўсе даследчыкі (Я. Карскі, А. Брукнер, Н. Гараеў, М. Шанскі) выказалі аднолькавую думку: яно запазычана з нямецкай мовы, дзе *Bund* мае значэнне 'саюз, аб'яднанне, звязка'. Відаць, апошняе стала асновай для ўтварэння значэння адзінкі колькасці. Магчыма, што запазычана гэта слова з метрычным значэннем, з якім яно ўжывалася ў іншых мовах: у польскай 'звязка з 15 прадметаў' (Карл., I, 234), у рускай 'адзінка колькасці солі' («мерный ворох озерной соли»), кноту («бунт фитиля — 25 са-

жень»), струн (14 пар), скурак (20 штук) (Даль, I, 142).

Дакладны колькасны эквівалент *бунта* на Беларусі ўстанавіць не ўдалося. У сувязі з тым, што гэта была адзінка розных тавараў, відаць, колькасны эквівалент таксама быў розны. У артыкуле «Аб гандлі і гандлёвых сувязях Магілёва ў XVII ст.» В. Мялешка піша, што ў бунце было 15 прадметаў [1], у іншых матэрыялах *бунт* прыраўноўваецца да 645 кг[2]. У адным з дакументаў, надрукаваных у АВАК, напісана: Sedem buntow penki, które ważyły kameni trzysta pięćdźesiąt (АВАК, VIII, 527, 1673). У гэтым выпадку *бунт* — 50 каменяў.

У мінулым стагоддзі гэта слова і яго памяншальная форма ўжываліся са значэннем адзінкі колькасці: А што прасці, так прадзе,— бурчыць калаўротак. *Бунцік* лёну так звядзе, што не выйдзе мотак (Багушэвіч, 82). Насовіч зарэгістраваў яго з двума значэннямі: «1. Беспокойство, несогласие, помешательство. *Бунту* только надзелав своим порядком, рассказом. 2. Связка, куль. Два *бунты* пеньки» (Нас. СБН, 38).

Вязка — адзінка колькасці сена, саломы, дроў, пянькі, лёну, абаранкаў: ...для п. Сакевича куп[или] ...дровъ *вязку*, ...сена *вязку*... (ГЮМ, XX, 21, 1711); пенки *вязки* три... (ГЮМ, XX, 44, 1711); стратили на харчъ... абаранковъ *вязка* (ГЮМ, I, 92, 1680).

Утворанае да дзеяслова *вязати*, слова *вязка* абазначала працэс, вязанне — з такім зна-

[1] Труды Института Истории АН БССР, вып. III. Минск, 1958, стар. 63.

[2] Белоруссия в эпоху феодализма, т. I, стар. 463.

чэннем яно ўжываецца ў сучаснай беларускай мове (БРС, 194). У далейшым яно стала абазначаць не толькі працэс, але і тое, што звязана, стаўшы адзінкай колькасці. Аднак, як паказваюць назіранні, гэта адзінка не была метрычным тэрмінам, а шырока ўжывалася як бытавая мера. Колькаснае значэнне мела гэта слова ва ўкраінскай мове (Грынч., I, 261).

Як адзінка колькасці *вязка* была неаднолькавая. Трэба думаць, што вязка сена, саломы, дроў мела такую колькасць, якую можна звязаць і панесці. Што ж да вязкі лёну, то, калі меркаваць па фактах сучаснай мовы, яна мела пэўную колькасць. Так, у «Лексіцы Палесся» гэта слова зарэгістравана з такім значэннем: «звязка (ад 10 да 25 жменяў) «выцертага» і вытрапанага валакна для захоўвання». З метрычным значэннем ужываюцца таксама аднакарэнныя словы *зв'язок, звјезок, з'јазок, сув'азок, зв'азочки* — ад 15 да 80 жменяў «выцертага» і вытрапанага лёну (ЛП, 262).

У сучаснай беларускай мове слова *вязка* і яго памяншальныя формы ўжываюцца як адзінкі колькасці сена, саломы, абаранкаў і не маюць тэрміналагічнага значэння: *Вязку* сена або саломы навяжаш і аддасі каню (Шчыткавічы, МКДЭ МПІ); І дзе тут душа вытрымае, каб... не прынесці з поля *вязанку* — другую саломы (Палтаран, 128).

Ноша — адзінка колькасці сена, травы: ...для п. Несиловского куп[или] ...сена *ношу*... (ГЮМ, XX, 49, 1711); ...купили... травы возы два, ...еще взяли *ношы* две (ГЮМ, I, 58, 1679). Значна часцей трапляецца ў помніках памяншальная форма *ношка:* купили сена

ношку (ГЮМ, XVII, 38, 1710); ...дров санки и *ношакъ* чотыри... (ГЮМ, XX, 3, 1711).

Слова *ноша* ўтварылася ад дзеяслова *нести* і ў старабеларускай мове мела значэнне 'тое, што можна панесці': ...опустивши *ношки,* мехи, прочь поутекали (АВАК, XVIII, 193, 1603). Потым яно набыло значэнне 'вязанка чаго-небудзь, якую можна панесці' і з такім значэннем ужывалася як адзінка колькасці. Такое значэнне яно мела і ў рускай мове (Даль, II, 538).

У сучаснай беларускай дыялектнай мове слова *ношка* захавала значэнне 'звязка, тое, што можна панесці' і 'адзінка колькасці' (бытавая мера, якая не мае замацаванай колькасці): Навязаў *ношку* сена; *Ношку* ўзяў на мельніцу: У мяшках і ў пасцілцы — *ношка,* а звязаў вяроўкай — ето ўйаска (Таль, МКДЭ МПІ).

Папуша — адзінка колькасці тытуню: ...тютюну 10 *папушъ*... (ГЮМ, XVIII, 120, 1710); ...тютюну *папушы* 2... (ГЮМ, XVIII, 118, 1710).

Гэта слова ўжывалася ў рускай, украінскай, польскай мовах са значэннем 'звязка, скрутак тытунёвых лістоў'. Яно запазычана з румынскай, дзе *papyša* — 'пучок, звязка; пук бавоўны'.

У сучаснай беларускай мове гэта слова і памяншальныя формы *папушка, папушачка* ўжываюцца са значэннямі 'скрутак табакі' і 'адзінка колькасці': Бацька мой курыў, дак у яго былі *папушкі,* а я нічога не хачу знаць, нат і глядзець у той бок не хачу (Шчыткавічы, МКДЭ МПІ); Я каго люблю, за таго пайду, да што люлечку курыць. Куплю люлечку, куп-

лю другую, і цюцюну *папушачку* (Горкі, МКДЭ МПІ); Няслі на продаж вясковую бесарабку і мультанку, пакручаную ў жоўтыя і зялёныя *папушы* — з круглай цаной наперад, налічанай яшчэ з дому па тым, што трэба купіць (І. Пташнікаў, «Полымя», № 12, 146); На дарогу добрую *папушку* тытуню-гасцінца даў дзед Доўнар (Колас, V, 146). М. Каспяровіч зарэгістраваў яго са значэннем 'пачак чаю або табакі', а ў прыкладзе яно ўжываецца са значэннем адзінкі колькасці: У мяне асталася адна *папушка* табакі (Касп., 229).

Повесмо (*повѣсмо*, *повисмо*) — адна з асноўных адзінак колькасці лёну, пянькі: конопель тертыхъ *повѣсомъ* 300 (АС, IV, 235, 1569); ...покрадено вѣ мене клеть, то есть... ильну сто *повесомъ* (АВАК, XVIII, 19, 1562); ...льну *повѣсомъ* триста, конопель сто (АВАК, II, 266, 1590).

Са значэннем адзінкі колькасці лёну гэта слова ўжывалася ў рускай, украінскай, чэшскай і польскай мовах. І. Насовіч растлумачыў яго значэнне так: «звязка часанага лёну, якая складаецца з 10 або 12 жменяў» (Нас. СБН, 434). У дужках ён ставіць слова *вѣсъ*, ад якога, на яго думку, утварылася *повѣсмо*. Аднак В. Махэк паказаў яго ўтварэнне іначай. Ён лічыць, што яно ўтварылася ад дзеяслова *вязаць* і мела форму *po-vęz-ьto* (Махэк, 338). На наш погляд, думка В. Махэка больш правільная, яе пацвярджаюць тлумачэнні значэння слова *повесмо* рознымі даследчыкамі: большасць з іх указвае, што гэта *звязка* лёну ці пянькі, у якую ўваходзіць пэўная колькасць жменяў (ад адной да сарака).

У сучаснай беларускай дыялектнай мове слова *павесма* не страціла значэння адзінкі колькасці: Чатыры жмені ў *павесма* (Амговічы, МКДЭ МПІ). У «Лексіцы Палесся» «[Повесмо] повысмо, повесмо, пувисмо, пависмо 'адзінка вымярэння «выцертага» і вытрапанага валакна, роўная 1,2, ..., 40 «жменям»' (ЛП, 248). У літаратурнай мове выяўлены адзін прыклад ужывання гэтага слова са значэннем 'скрутак, жмут': Прыходзіў дзядзька пагаманіць гадзіну перад сном. Набіваў ляжанку саломай, пакідаючы доўгую *павесму,* што злучала салому ў печцы з саломай на падлозе (Караткевіч, 2, 231).

Шырокае выкарыстанне ў старажытнасці *повесма* як адзінкі колькасці лёну і канапель выклікала ўжыванне гэтага слова са значэннем адзінкі колькасці прадзіва (апасродкаванага спосабу вызначэння колькасці якога-небудзь рэчыва праз колькасць іншага рэчыва): ...прадива шесть *повисемъ* (АВАК, VI, 494, 1549). З такім значэннем зафіксаваў гэта слова М. Гарбачэўскі: «Моток ниток определенного их количества» (Гарб., 272) і Г. Кочын (Кочын, 242).

Снопъ — адзінка колькасці зжатага, але немалочанага збожжа, а таксама сена: зъ каждого городу по *сноповъ* пятьнадесять [давать] (АВАК, II, 2, 1431); А лете сокол[ь]никомъ воеводинымъ, коли на поли замешкають, давати имъ по *снопу* сѣна (РИБ, XXVII, 548, 1494); А потомъ поличивши жито снопами, подалъ копъ двадцать осмъ малое ярицы, ...полбы копъ три, *сноповъ* десеть (АС, III, 69, 1606).

Гэта слова са значэннем 'звязка, звязаны пук немалочанага збожжа' ведаюць усе славянскія мовы, яно ўжывалася ўжо ў індаеўрапейскай мове-аснове: **snep-u, snep-, sn-op-* (Праабр., I, 354). У старабеларускай мове яно ўжывалася як падатковая адзінка: Такожъ з Рачъчанъ што боярину одному Новгородскому, на имя Кипріяну, а предъкомъ его пятый *снопъ*, ино съ того Кипріяна сынъ теперо на Мосъкве; ино того *снопа* теперъ нихто не береть (РИБ, XXVII, 465, 1488); ...к той церкви земля з давнихъ часовъ наданая, на которой тепер человек один дает на церковъ с пашни своей всякого збожя четвертый *сноп* (ВС, 343, 1619). Словазлучэнні «пятый сноп», «четвертый сноп» тут маюць значэнне 'пятая, чацвёртая частка збожжа'.

Помнікі старабеларускага пісьменства не паказваюць, ці мела гэта адзінка афіцыйна замацаваны колькасны эквівалент. Відаць, колькасць збожжа, якая ўваходзіла ў *сноп*, вызначалася ў практыцы.

У сучаснай беларускай мове *сноп* мае значэнне 'звязка збожжа' і можа ўжывацца са значэннем адзінкі колькасці: Сям'ёй ішлі на панскую малацьбу, бо трэба было за дзень паншчыны абмалаціць азіміны адну капу, а ярыцы — дзве. А капа — шэсцьдзесят *снапоў*, а кожны *сноп* ля перавясла — аршын кругом (Караткевіч, 1, 105). Як бачым, велічыня *снапа* можа быць дакладна акрэслена. На Палессі гэта слова мае значэнне 'адзінка колькасці лёну ці канопляў з 4—6 жменяў' (ЛП, 268).

Фаса (*фаска*) — адзінка колькасці вырабаў з металу (нажоў, сякер, цвікоў): ...ножовъ

Угорскихъ и полугорскихъ кгатунку *фаса* 1... (АС, III, 304, 1583); Абрамъ Юхновичъ ...мѣлъ товаръ съ Люблина: стали *фаска*, въ ней каменей 28; Иван Плавущичъ Пинчукъ мѣл товаръ свой зъ Люблина: ...гвоздья латного *фаска* 1 (АС, III, 296, 1583).

Як ужо адзначалася, у старабеларускай мове ўжывалася слова *фаса* са значэннем адзінкі вымярэння сыпкіх рэчываў і вадкасці. Яно генетычна звязана з нямецкім *Fass* 'бочка'. Назва ж адзінкі колькасці *фаса* (*фаска*) генетычна звязана з лацінскім *fascis* 'звязка, пучок, вязанка'[3]. З метрычным значэннем гэта слова ўжывалася ў стараўкраінскай мове. М. Худаш адносна яго паходжання таксама выказвае думку пра запазычанне з лацінскай мовы і на аснове аналізу дакументаў Львоўскага стаўрапігійскага брацтва прыходзіць да вываду, што ў стараўкраінскай мове *фаска* абазначала адзінку лічэння, якая складалася з 12 бунтоў, а ў бунце — 15 адзінак[4]. Аналіз ужывання гэтай адзінкі ў помніках старабеларускага пісьменства паказвае, што яна не мела трывала замацаванага колькаснага значэння: а потомъ дня 7 марца онъ самъ Иванъ мѣлъ товаръ свой: косъ у 2 *фасахъ* 1000... (АС, III, 305, 1583); Иж іа в року теперъ идучомъ... на свіатки будучы у Люблине на іаръмарку

---

[3] Латино-русский словарь. М., 1949, стар. 359.

[4] М. Худаш. Метрологічна термінологія в українській мові кінця XVI — початку XVII стст.— «Доповіді та поведомлення Львівського державного педагогічного інституту». Серия філологічна. Випуск другий. Львів, 1956, стар. 33—36.

торговаломъ з паномъ Іакубомъ краковцомъ ножевникомъ и купилъ есми отъ него *фасу* ножовъ Угорских за осмъ сот на слово. Ино колишъ ту приехавши оную *фасу* узбилъ, али в той *фасе* не доличилисе ножов великих целого ста (ГЮМ, XXXII, 210-II, 1578). Пра велічыню *фаски* — адзінкі колькасці сталі — сведчыць цытаваны прыклад (стали *фаска*; в ней каменей 28), дзе яна ўдакладняецца не колькасцю прадметаў, а вагой. Абмежаванае ўжыванне гэтай адзінкі (толькі ў мытнай кнізе і ў гандлёвым пагадненні) дае падставу зрабіць вывад, што на Беларусі яна не атрымала шырокага распаўсюджання і ўжывалася пры гандлі з Заходняй Еўропай.

Кипа — адзінка колькасці тканіны: Сукна *кипа* Рославскаіа цветнаіа за коп шестьдесіат піать (ГЮМ, XXII, 177); купил есми от него две *кипы* бармистых, а в *кипе* по сороку поставов сукъна. Ино колимъ тут приехавши у оных *кипах* поставы обличил, алимъ толко нашолъ поставовъ семдесіат осм (ГЮМ, XXII, 210, 1578). Гэта слова з аналагічным значэннем выявіў І. Сразнеўскі ў старарускай мове — у «Торговой книге» 1575—1610 гг. Пра яго паходжанне ('цюк, складзеныя адзін на адзін прадметы') М. Фасмер выказвае меркаванне, што яно запазычана з нямецкай мовы: ніжненямецкае, нідэрландскае *kip* 'мера, звязка' (Фасм., II, 235). У сучаснай беларускай мове гэта слова ўжываецца са значэннем 'пачак, стос': Фёдар бярэ *кіпу* газет і ідзе ў залу, на мяккую канапу (Палтаран, 28). У дыялектнай мове яно ўжываецца са значэннем 'сноп, звязка': *Кіпа* бобу, я помню, звалі (Бягомль).

АДЗІНКІ КОЛЬКАСЦІ З ПЕРШАПАЧАТКОВЫМ ЗНАЧЭННЕМ 'НІЗКА'

Усе словы гэтай групы шырока ўжываліся як бытавыя адзінкі колькасці, аднак ніводнае не мела тэрміналагічнага значэння.

Венокъ (венецъ) — адзінка колькасці цыбули, часнаку, баравікоў: ... у свирнѣ нашли есмо... цибули 72 *вѣнки* (АС, VII, 15, 1520); нашла купа в лазни... *венцы* три цыбули тоежъ Свирыдовны (АВАК, XVIII, 109, 1592); До кухни боровиковъ *венокъ* (ГЮМ, V, 134, 1688).

Слова ўжывалася ва ўсіх славянскіх мовах. М. Фасмер, параўнаўшы яго са словамі *венец* і *вить,* прыйшоў да вываду, што яно ўтварылася ад слова **vĕnъ* (Фасм., I, 292). Гэта слова ў старажытнасці вызначалася полісеміяй (Сразн., I, 487—488), і адным з яго значэнняў было 'сплецены (звіты) прадмет'. Паколькі цыбуля для захоўвання і на продаж плялася ў пляцёнкі, якія былі падобны на вянок, то і пляцёнка атрымала назву *венокъ.* Ад знешняга падабенства пляцёнкі цыбулі і нізанкі грыбоў апошняя таксама атрымала такую самую назву. У вянок цыбулі, грыбоў звычайна ўваходзіла больш-менш пэўная колькасць адзінкавых прадметаў, якая вызначалася практыкай, таму гэта слова набыло значэнне адзінкі колькасці.

Весло (свясло) — адзінка колькасці грыбоў, рыбы і палатна: а у дому пана Накозыи... нашла купа *весло* грыбовъ... (АВАК, XVIII, 252, 1620); ...слуги его взяли в него: курицу а петуха, кадцу огуръковъ а *свясло* сущу (БА,

II, 21, 1530); згинуло дей у насъ недавно осмь *веселъ* полотна (АВАК, XVIII, 271, 1624).

Гэта слова ўжывалася ў рускай мове са значэннем 'пояс з саломы ці травы, якім у час жніва звязваюць снапы' (Бурнашоў, II, 200), у Г. Кочына яно зарэгістравана са значэннем 'единица исчисления' (Кочын, 315). М. Фасмер тлумачыць яго як «жгут для перевязки снопов» і адзначае, што яно ўжываецца ў беларускай мове, балгарскай ('сувязь, звязка'), ужывалася ў стараславянскай ('повязка'). Утварылася яно ад дзеяслова *вязать* (Фасм., I, 76). Развіццё семантыкі слова *весло* (*свяслó*) ішло такім самым шляхам, як і слова *венокъ*.

Трэба меркаваць, што *весло* ў старабеларускай мове мела таксама значэнне 'скрутак', ад якога ўтварылася значэнне адзінкі колькасці тканіны.

У сучаснай беларускай мове гэта слова ўжываецца са значэннем 'нізка' (Янк., 1966, 57) і 'адзінка колькасці': Два *вяслы* лык купіў (Касп., 70); Цікаў павольна за сцяною гадзіннік, каля печы ляжалі *вяслы* цыбулі (Чорны, I, 398).

Плетенка — адзінка колькасці цыбулі: Томужъ пану Ницъкому на день четвертый купили мяса чверть; ...цыбули *плетенка*... (ГЮМ, I, 96, 1680); ...цыбули две *плетейки* (магчыма, памылка друку: *плетейки* замест *плетенки.— К. С.),* (ГЮМ, I, 23, 1679). Трапіўся адзінкавы прыклад, у якім гэта слова ўжываецца як адзінка колькасці дроў: купили до бровара дровъ плотовыхъ *плетенокъ* чотыри... (ГЮМ, VIII, 149, 1691).

На думку А. Праабражэнскага, агульнаславянскае слова *плетенка* ўтварылася ад дзеяслова *плетти* пры дапамозе суфікса *-енк-* (Праабр., II, 74). Развіццё семантыкі гэтага слова супадае з прааналізаванымі назвамі адзінак колькасці з першапачатковым значэннем 'нізка'. З апошнім значэннем гэта слова ўжываецца ў сучаснай беларускай мове.

Лыко (лычко) — адзінка колькасці рыбы: харчы въ дорогу купили розное... иголницы вялой *лыки* четыри... (ГЮМ, I, 23, 1679); Еще купили рыбы игольницы *лыкъ* пять (ГЮМ, VIII, 44, 1691).

Слова *лыко* 'малады луб, валакністае нямоцнае падкор'е з дрэва' (Даль, II, 276) мае таксама значэнне 'луб, садраны з ліпы, лазы, парэзаны на вузкія пасы'. На зроблены такім чынам пас з лыка нанізвалася рыба. Слова *лыко* набыло значэнне 'нізка рыбы', ад якога ўтварылася значэнне адзінкі колькасці, бо ў практыцы звычайна на *лыко* нанізвалася пэўная колькасць рыбы.

Троска — адзінка колькасці рыбы: по две *троски* юноновъ (РИБ, XX, 1453, 1520); уюновъ *троску* одну (АВАК, XIII, 339, 1588).

Гэта слова зафіксавана ў І. Сразнеўскага: «троска — жердь, кол; удар молнии; ср[авни] лит[овское] *tarsketi, trasketi, tresketi*» (Сразн., III, 1003). Н. Гараеў у артыкуле на слова *трость, тресть* для параўнання прыводзіць стараславянскія *трьсть* і *тръсть,* чэшскае *trest',trestina, trstina,* польскае *trzestina,* сербскае *треіе* (чарот), *треска* (трость), румынскае *trestie,* а таксама літоўскія *strustis* (сцябло), *trušas* (тросць), *trušis* (хвошч, салома)

(Гараеў, 377). Ва ўкраінскай мове *троск* — 'чарот' (Грынч., IV, 287).

Верагодней за ўсё, што слова *троска* мела значэнне 'чарацінка' (памянш. ад *трость* + + суфікс *-к-* = *тростка, троска*). На *троску* (чарацінку) нанізвалася рыба, таму гэта слова набыло значэнне 'нізка', а затым 'адзінка вымярэння'.

Метка таксама была адзінкай колькасці рыбы: Декабря 7, во второкъ, ...купилъ уюновъ *метокъ* 6 за грошей 9... (АС, IV, 308, 1599); для пана Витовта купили ...рыбы свежей и вялой (въ томъ числѣ 2 *метки* уюновъ за осм[аков] s̃i) (ГЮМ, XVIII, 17, 1710).

Са значэннем адзінкі колькасці рыбы гэта слова ўжываецца ва ўкраінскай мове (Грынч., II, 420). У сучаснай беларускай мове яно мае значэнне 'дубец, або вяровачка ў нізцы', пра што піша А. Крывіцкі ў артыкуле «Залатыя россыпы слоў». У гэтым артыкуле ён ужывае слова *метка* з пераносным значэннем: «Перабіраючы тэматычныя нізкі, ці, скажам па-паляшуцку, *меткі* слоў, можна зазначыць, што многія з іх па сваёй зладжанай і выразнай будове, ёмістым значэнні або пачуццёвай вастрыні маглі б заняць месца ў кагорце лексікі нашай літаратурнай мовы»[5]. Такім чынам, у сучаснай беларускай мове слова *метка* 'дубец або вяровачка ў нізцы' ўжываецца са значэннем 'нізка'. Відаць, у старабеларускай мове яно мела такое значэнне, ад якога і ўтварылася значэнне адзінкі колькасці. З апошнім яно выяўлена і ў сучаснай мове:

[5] «Маладосць», 1968, № 12, стар. 132.

У старога ўюноў поўная, як завязаць, торба, а ў хлапца ўсяго *меткі* тры (Сачанка, 62).

АДЗІНКІ КОЛЬКАСЦІ З ПЕРШАПАЧАТКОВЫМ ЗНАЧЭННЕМ 'СКРУТАК'

Бална — адзінка колькасці сукна (ужывалася рэдка): зостал есми виненъ... тридцать копъ и осьмъ копъ грошей литовское монѣты... за *балну* сукна Гарлицкого (АВАК, XVII, 164, 1539). Ва ўказальніку да тома XVII АВАК гэта слова тлумачыцца як 'скрутак, штука', ад ням. *ballen*. М. Гарбачэўскі растлумачыў яго як 'цюк, пакет, скрутак' і паказаў на ням. *Ballen* (Гарб., 35). Паколькі ў старабеларускай мове гэта слова ўжывалася толькі са значэннем адзінкі колькасці, то можна лічыць, што з такім значэннем яно было запазычана з нямецкай мовы.

Поставъ — адна з асноўных адзінак колькасці тканіны: Князю Анъдрею Черторійскому 20 копъ а *поставъ* новогоньский з мыта Луцъкого; ему же 20 копъ а *поставъ* новогоньский з мыта Берестейского (РИБ, XXVII, 313—314, 1490); Другая, девять даровъ царю, а девять *поставовъ* полустучьковъ (АЗР, I, 165, 1496). Гэта адзінка запісана ў прывілеях на Магдэбургскае права як адна з асноўных у аптовым гандлі тканінай: Тежъ тые купцы чужыи опричъ ярмарку подъ тую меру продавати мають сукно *поставом* (РИБ, XXVII, 703, 1498). Слова *поставъ* ужывалася таксама са значэннем 'кавалак (скрутак) тканіны': А такжо у Невгини у Полочанъ товаръ трясутъ, а

грабятъ и гличами *поставы* колуть (РЛА, 235, 1479). Як меру тканіны, гэта слова зарэгістравалі Г. Кочын, Б. Грынчанка, А. Брукнер.

Зрэдку з метрычным значэннем ўжывалася слова *ставъ*: пять *ставовъ* полотна кужельного... (АВАК, XVII, 416, 1558).

Выразных сведчанняў пра ўтварэнне слова *поставъ* няма. Н. Гараеў піша: «Поставъ (кросна, шкаф, постав ткани) от ставить» (Гараеў, 276). Як бачым, сярод іншых значэнняў ён называе 'кросны'. З такім значэннем у сучаснай беларускай мове ўжываецца *стаў, ставы*. Таму, на нашу думку, *поставъ, ставъ* — гэта кавалак тканіны, які можна выткаць, аснаваўшы кросны адзін раз. Паколькі звычайна кросны асноўваюцца на пэўную колькасць тканіны, то за гэтым словам замацаваўся пэўны колькасны эквівалент. Так, у сучаснай беларускай мове як мера палатна можа ўжывацца слова *кросны*: Выткала *кросны* палатна; выткала двое *красён* (Бягомль).

Поставъ у старажытнасці меў пэўную даўжыню — 50 локцяў, пра што сведчаць помнікі: ...ткацкого полотна *поставовъ* пять, въ кождымъ поставѣ было по петьдесят локти (АВАК, VIII, 485, 1599); ...сорокъ *поставовъ* полотна, а въ кождомъ *поставе* по пятидесят локоть (РИБ, XX, 875, каля 1516 г.). Апрача гэтага, слова *поставъ* ужывалася і са значэннем 'кавалак тканіны няпэўнай даўжыні': ...съ кубломъ украдено кошули кужельныхъ чотыры, рантуховъ тонкихъ въ *поставе* локоть осмъ... (АВАК, XVIII, 65, 1589). Зрэдку яно ўжывалася са значэннем адзінкі колькасці нітак (апасродкаваны спосаб вызначэння

колькасці аднаго рэчыва праз другое): пряжи кужельное *поставовъ* 5 (АС, I, 146, 1571). Раз на *поставъ* тканіны ішла пэўная колькасць нітак, то гэту колькасць можна было вызначыць пры дапамозе такой адзінкі.

У сучаснай беларускай мове *пастаў* — 'скрутак, кавалак палатна' і 'адзінка колькасці' (Янк., 1966, 141; ЛП, 253).

Сувой. Гэта слова таксама мела значэнне адзінкі колькасці палатна: взято и побрано съ того свирна речей не мало, то есть мѣди каменей десять, полотна *сувоевъ* двадцать (АВАК, XXVIII, 248, 1646); полотна *сувой* кужольного локоть тридцать, а въ другомъ *сувои,* тако-жъ кужелю локоть тридцать пять (АВАК, XVIII, 223, 1610). У другім прыкладзе гэта слова першы раз ужываецца са значэннем адзінкі колькасці, а другі — 'скрутак тканіны'.

Найбольш магчыма, што слова *сувой* утварылася ад дзеяслова *вить* 'скручваць' і першапачаткова мела значэнне 'скрутак палатна на навоі', ад якога ўтварылася значэнне адзінкі колькасці, бо такі скрутак меў пэўную даўжыню. Яно ўжывалася таксама ва ўкраінскай мове са значэннем 'скрутак палатна' (Грынч., IV, 225) і ў рускай — 'звіты скрутак паперы і інш.' (Даль, IV, 353). Такое значэнне, відаць, было ў агульнаўсходнеславянскай мове. У сучаснай беларускай мове *сувой* — 'скрутак палатна'.

Труба — адзінка колькасці тканіны (ужывалася рэдка): ...а потом дей на запусты масленые с клети згинуло две *трубы* полотна простого (АВАК, XXXIX, 539, 1579).

Асноўнае значэнне гэтага слова — 'доўгі, пусты ўнутры прадмет, звычайна круглы', з якім яно было запазычана з верхненямецкай мовы, а апошняй, у сваю чаргу, — з лацінскай (Шанскі, 341). Відаць, ад падабенства скруткa палатна з трубой (круглыя) гэта слова ў старабеларускай мове набыло значэнне 'скрутак палатна', а потым адзінкі колькасці. З такімі значэннямі ў сучаснай беларускай мове выяўлена памяншальная форма *трубка*: Чаточкавы зрабіў ён пранік ёмкі з аздобамі і ручкай гладкай, і палатно панёс з ёй да палонкі, дзе сажалка была і кладка. Усю *трубу* укінулі ў вадзіцу... (Купала, 503); У маёй старой хворасць нейкая ў касцях, дык яна і кажа: ахвярую *трубку* палатна на багародзіцу, зарок я ёй дала, мо вылечуся ад хворасці (Галавач, I, 147).

Клубъ — адзінка колькасці нітак: пражы льненой *клубовъ* осмъ не малыхъ... (АВАК, XXVI, 126, 1585); пражы волненой *клубовъ* деветь великихъ... (АВАК, XXVI, 126, 1585).

Як сведчыць А. Праабражэнскі, слова *клубъ* ужывалася ва ўкраінскай, славенскай, балгарскай, сербахарвацкай, чэшскай, польскай, верхнелужыцкай і палабскай мовах, а таксама ў старарускай і стараславянскай. Пэўнага вываду пра яго паходжанне ён не робіць, але лічыць памылковай думку Н. Гараева, які параўноўваў гэта слова са словамі *коло, колобок* (Праабр., I, 318).

Найбольш верагодна, што першапачатковае значэнне слова *клубъ* — 'круглы скрутак нітак'. З такім значэннем у помніках выяўлена памяншальная форма *клубокъ*: пражы

кужельное в *клубкахъ* на трыста локтей полотна (АВАК, XXVIII, 57, 1605). Паколькі ў *клубъ* звычайна маталася пэўная колькасць нітак, то слова набыло значэнне адзінкі колькасці.

У сучаснай беларускай мове памяншальная форма *клубок* мае значэнне 'скрутак нітак' (БРС, 394). Яно можа ўжывацца і з колькасным значэннем (тры *клубкі* нітак).

Мотокъ. Гэта слова таксама мела значэнне адзінкі колькасці нітак: Нити до шитья жалобы *мотки* два (АС, IV, 306, 1599); Едвабу *мотокъ* (ГЮМ, V, 30, 1688).

Утварылася яно ад дзеяслова *мотать*, ужывалася таксама ў рускай мове: «пряжа, смотанная в пятинку, воробы или мотовило, нитки или шелк в кругах, шлейкою» (Даль, III, 351). У. Даль зазначае, што ў матку звычайна бывае 5 пасмаў па 80 нітак, або 80 аршынаў. У сучаснай украінскай мове *моток* — 'адзінка колькасці нітак на 30 пасмаў'[6], у беларускай — пэўная колькасць прадзіва, перамотанага з верацяна на матавіла, а таксама знятага з матавіла. Пры перамотванні звычайна лічаць пасмы і такім чынам ведаюць колькасць нітак, што важна пры снаванні кроснаў. Такім чынам, слова *мотокъ*, маючы першапачатковае значэнне 'скрутак нітак', набыло значэнне адзінкі колькасці, бо ў маток звычайна ўваходзіць пэўная колькасць нітак.

---

[6] Й. О. Дзендзелівський. Спостереження над термінологією народної метрології говірок Закорпатської області.— «Навукові записки Ужгородського державного університету», т. XIV. Львів, 1955, стар. 96.

АДЗІНКІ КОЛЬКАСЦІ З ПЕРШАПАЧАТКОВЫМ ЗНАЧЭННЕМ 'РЭЧЫВА'

Воскъ — адзінка колькасці воску, лою, масла: А дани меду 10 медницъ, безменъ и 2 *воски* (АС, I, 33, 1536); воску семь *восковъ*..., лою *восковъ* пять... пограбилъ (АВАК, XXVI, 316, 1586); Реестр восковой дани отъ четырехъ Братств на Вилинскія церкви... 1. Свѣча до Светого Спаса зо двухъ каменей и чотырохъ *восковъ*. 2. Свеча до Светое Пречистое зъ пяти каменей и чотырохъ *восковъ*... (АС, VI, 50, 1560). У гэтым рэестры яшчэ шэсць разоў называецца даніна воскам, колькасць якой вызначаецца пры дапамозе *каменей* і *восковъ*, а рахунак усёй даніны падводзіцца так: Всего того воску чынить *каменей* 25 *фунтовъ* 32. Пры нашым падліку ўсёй даніны, запісанай у рэестры, атрымалася 25 *каменей* і 32 *воски*, г. зн. столькі, колькі ў рахунку *каменей* і *фунтовъ*. Гэта дае падставу зрабіць вывад, што *воскъ* з метрычным значэннем — гэта сінонім *фунта*. Параўнальна частае ўжыванне адзінкі колькасці *воскъ* сведчыць пра яе даволі шырокае распаўсюджанне, а сінанімічнасць з фунтам — што гэта адзінка набліжалася да адзінак вагі.

Сало — адзінка колькасці сала: а въ свирнѣ в Носовѣ знашолъ 10 плечъ а 4 *сала*... (Люб., VI, сярод актаў канца княжання Аляксандра); У третей клѣти пашной... масла ведеръ тры, *салъ* свиныхъ тры, солонины полтей чотыры (АС, I, 203, 1597). Гэта слова з метрычным значэннем ужываецца ў Статуце Вялікага княства Літоўскага 1588 г. За *сало* — пятнадцать грошей (раздз. XIII, арт. 10).

Хлебъ — адзінка колькасці хлеба: ...в каждый годъ даютъ на церковъ Успения... к празднику по яловицы, а по сту *хлебовъ* (ВС, 101, 1621); предкове нашы надали на церковъ въ кождый год... яловицу а сто *хлѣбовъ* (АС, I, 216, 1597).

Гэта слова з метрычным значэннем трапляецца ў запісах вуснай народнай творчасці мінулага стагоддзя: Налілі варіва. Падчапіў ён заборіну пад еты ўшаты і ўзяў бочонык пяць вёдзір воткі, пяць *хлебыў*... (Бел. эпас, 63). З такім самым значэннем яно выяўлена ў сучаснай беларускай літаратурнай мове: Гэтай мукі можа яшчэ хопіць на два скупыя *хлябы* (Чорны, IV, 203).

Сыръ — адзінка колькасці сыру: ...а городничый береть на нихъ за кождый возъ сена по 15, або 12 грошей, а по 2 *сыры*... (Доўн.-Зап., 1905, 18, 1534); За *сыръ* великий углястый — два грошы (Статут 1588 г., раздз. XIII, арт. 10). Са значэннем адзінкі колькасці слова *сыр* ужываецца ў сучаснай мове: ...перад імі на голым стале ляжала штук дзесяць падсушаных *сыроў* (Чорны, IV, 213).

Развіццё семантыкі слоў *воскъ, сало, хлебъ, сыръ* ад значэння 'рэчыва' да 'адзінка колькасці' ішло аднолькавым шляхам і звязана з тым, што словы, якія маюць значэнне 'рэчыва', могуць ужывацца таксама са значэннем 'частка рэчыва'. Так, у сучаснай мове словазлучэнне «прынесці хлеб» мае значэнне 'прынесці пэўную колькасць хлеба', «купіць сыр» — 'купіць кавалак сыру пэўнай велічыні'. Паколькі хлеб выпякаецца, сыр выраблянецца кавалкамі пэўнай велічыні, то словы

хлебъ, сыръ набылі значэнне 'кавалак', а потым 'адзінка колькасці'.

Таксама і сала бывае кавалкамі пэўнай велічыні, якія рэжуць, як колюць свінню, воск жа звычайна ператоплівалі на васкабойні і таксама адлівалі ў кавалкі пэўнай велічыні.

Для параўнання прыгадаем, што назвы рэчыва *солодъ, пиво* таксама ўжываліся з метрычным значэннем.

Руно — адна з асноўных адзінак колькасці воўны: волны овчое *рунъ* шестьдесять (АВАК, VIII, 557, 1603); 15 *рунъ* волны (Люб., VI, сярод актаў канца княжання Аляксандра).

Гэта слова зарэгістраваў І. Сразнеўскі з некалькімі значэннямі, сярод якіх 'воўна з адной авечкі як адзінка лічэння'. Са значэннем 'астрыжаная воўна' яно ўжывалася яшчэ да 968 года (Сразн., III, 196—197). А. Праабражэнскі лічыць, што яно ўтварылася ад дзеяслова *рвати,* а ўжывалася ў рускай, украінскай, балгарскай, сербахарвацкай, чэшскай, польскай мовах (Праабр., II, 224). А. Брукнер, тлумачачы ўтварэнне слова, піша, што стрыгчы авечак навучыліся позна, раней воўну ірвалі (Брукнер, 224), таму *руно* ўтварылася ад дзеяслова *рвати.* У рускай мове гэта слова ўжывалася са значэннем адзінкі колькасці гароху: «Руно гороху» — значит пучек гороху со стеблями (Бурнашоў, II, 180).

Такім чынам, першапачатковае значэнне слова *руно* — 'рэчыва' (воўна), ад якога ўтварылася значэнне 'пэўная колькасць рэчыва', а потым — 'адзінка колькасці'.

У сучаснай беларускай мове яно не страціла апошняга значэння, ужываецца таксама

памяншальная форма *руцэ, руцо*: «[руно]... 1) воўна з адной авечкі. З аднэj овэчки аднэ руно, jак острыжэш, она — воўна — не розпадаjецца — то руно. 2) воўна з ягнят і маладых авечак. Руно з молодых овечок, а вовна — со старых. 3) воўна веснавой стрыжкі. 4) астаткі воўны на авечках» (ЛП, 260); Сколькі авечка дась воўны — адно *руцо* (Шчыткавічы, МКДЭ МПІ). І. Бялькевіч зарэгістраваў гэта слова са значэннем 'воўна з аднае авечкі, скручаная ў ком' (Бяльк., 391).

АДЗІНКІ КОЛЬКАСЦІ З ПЕРШАПАЧАТКОВЫМ ЗНАЧЭННЕМ 'ЦЭЛАЕ' ('ТУША') І 'ЧАСТКА ЦЭЛАГА'

Словы, якія аб'ядноўваюцца агульным значэннем 'туша', ужываліся як адзінкі колькасці мяса.

Бохъ (ужывалася рэдка): ...а 4 *бохи* мяса; А в Лосевѣ у Мелнику до увяжчого взялъ 14 корцовъ соли... а 4 *бохи* мяса... (Люб., VI, сярод актаў канца княжання Аляксандра).

М. Гарбачэўскі слова *Boch* адносіць да польскіх і тлумачыць яго як тулавы жывёлы без скуры (Гарб., 42). У чэшскай мове *boch* — 'свіная лапатка' (*vepžove plece* — Махэк, 37). На думку А. Брукнера і аўтараў «Słownika języka polskiego», яно запазычана з нямецкай мовы, дзе *Bache* — 'кавалак' (Брукнер, 33; Карл., I, 179). Калі прыняць пад увагу тлумачэнне М. Гарбачэўскага, то слова *бохъ* мела значэнне 'туша' і магло ўжывацца як адзінка колькасці. У старабеларускай мове яно, ві-

даць, шырокага распаўсюджання не атрымала і выйшла з ужывання.

Туша: За *тушу* мяса вепрового полъ 16 гроша (АС, VII, 21, 1538—1539); За росказанемъ пана войта, водлугъ реестру, намъ даного, на тотъ же банкетъ яловицу *тушу* целую отъ Микиты Ивановича резника (ГЮМ, V, 130, 1688).

Слова *туша,* якое ўтварылася ад дзеяслова *тыти* 'тлусцець, паўнець', мае асноўнае значэнне 'забітая і ачышчаная жывёла (карова, свіння і інш.)' (Праабр., II, 1164). У сучаснай беларускай мове яно ўжываецца з такім самым значэннем (БРС, 931). Са значэннем адзінкі колькасці яно магло ўжывацца таму, што ў тушу ўваходзіла больш-менш пэўная колькасць мяса.

Стягъ (ужывалася рэдка): дани... за семь год чотырнадцат *стіагов* міаса іаловічого добрых... взял по весне бочку міаса *стіаги* пол третіа (ГЮМ, XXXII, 228-II, 1578); на тыхъ купцахъ, которые зъ Вязьмы и зъ Дорогобужа и зо Мстиславля и зъ селъ привозять къ городу мяса продавати цѣлыми *стяги,* бирали съ *стягу* по полугрошку (М. Ясинский. Уставные земские грамоты Литовско-русского государства, 149, 1505). Такая адзінка вымярэння была і ў Маскоўскай дзяржаве. Так, М. Кастамараў пісаў, што туша каровы лічылася за *стяг,* і гэта мера была параўнальнай для іншых адзінак колькасці мяса. Ялавічына прадавалася *стягами, стяг* дзяліўся на дзесяць або на пяць *полотей,* бо *полоти* былі няроўныя. У гандлёвай практыцы да *стяга* прыраўноўвалі дзесяць баранаў, дванаццаць гусей і зай-

цаў, трыццаць парасят і качак, цецерукоў, трыццаць курэй і тысячу яек[7].

У. Даль адносіць слова *стяг* да групы слоў, утвораных ад дзеяслова *стягивать* і тлумачыць яго так: «мясная туша, ...облупленая, без ног и головы». Ён спрабуе вызначыць развіццё семантыкі і піша, што такое значэнне ўтварылася таму, што «кожа, стянута, снята», але ставіць пытальнік — знак сумнення (Даль, IV, 352). У Н. Гараева гэта слова параўноўваецца з аналагічнымі ў іншых мовах. Сярод тых значэнняў, якія ён прыводзіць, як асноўныя вылучаюцца наступныя: 'кол', 'шост', 'кап'ё', 'паля', 'сцяг'. Ні адно з іх, на нашу думку, не магло стаць асновай адзінкі колькасці. Магчыма, У. Даль меў рацыю, калі лічыў, што яно ўтварылася ад дзеяслова *стягивать*. У такім выпадку яго першапачатковае значэнне магло быць 'туша', ад якога ўтварылася значэнне адзінкі колькасці.

Як паказваюць помнікі старабеларускага пісьменства, гэта слова ўжывалася на абмежаванай тэрыторыі Беларусі (на Магілёўшчыне). Магчыма, яно было запазычана з рускай мовы, але не атрымала шырокага распаўсюджання.

Зрэдку як адзінка колькасці мяса ўжывалася слова *вепръ*: ...покрадено въ мене клеть, то есть сермяга а (1)... простица, сорочокъ чотыри, наместцовъ два, ильну сто повесомъ, *вепръ* мяса, скоро убитый... (АВАК, XVIII, 10, 1562); ...у пашни тежъ зостало две седле воло-

[7] Н. Костомаров. Очерк торговли Московского государства. СПб., 1862, стар. 273.

скихъ со всею приправою, а мяса шесть *веп-ровъ* (АВАК, XVII, 234, 1540).

У старабеларускай мове гэта слова ўжывалася са значэннем 'кабан': ...а кгды веселье было, тогды далъ есми бочку меду престного за полтрети копы грошей, ку тому два *вепри* кормныхъ по полукопью грошей... (АВАК, XVII, 241, 1540). Такім чынам, гэтым словам называўся і жывы кабан, і туша забітага кабана. Апошняе значэнне стала асновай для ўтварэння метрычнага.

У сучаснай беларускай мове *вепр* — 'дзікі кабан'.

Шматлікую групу складаюць словы з першапачатковым значэннем 'частка цэлага', 'кавалак'. Гэтыя словы ўжываліся як адзінкі колькасці мяса, солі, цукру, хлеба, мыла, г. зн. масы рэчыва, а таксама тканіны і паперы.

а) адзінкі колькасці мяса

Секъ (ссекъ) (ужывалася пераважна ў Магілёўскіх актах): За три *секи* мяса Кирею заплатили золот[ых] два и асмаковъ десять (ГЮМ, I, 221, 1680); Еще купили до печеня два *ссеки* мяса яловичого (ГЮМ, VIII, 141, 1691).

З аўтараў слоўнікаў толькі В. Бурнашоў зарэгістраваў гэта слова са значэннем 'гадавы баран (у кіргізаў. — *К. С.*), які на наступны год дае адзін пуд сала сырцу' (Бурнашоў, II, 201). Мала верагодна, што гэта слова з кіргізскай мовы пранікла ў старабеларускую. Відаць, яно ўтварылася ад дзеяслова *секчы* 'аддзяляць частку ад цэлага' і першапачатко-

ва мела значэнне 'частка, кавалак адсечанага мяса', набыўшы пазней значэнне адзінкі колькасці.

Шротъ: Мяса купили тымъ же жолнеромъ *шроты* три... (ГЮМ, VIII, 36, 1691); Того жъ дня... купили *шротъ* мяса свиного (ГЮМ, XIII, 19, 1699). Слова ўжывалася і са значэннем 'свінцовы шарык, што ўжываецца пры стральбе': ...еще одеслали до Оршы... *шроту* 1/2 ф[унта] (ГЮМ, XXI, 45, 1711).

А. Брукнер лічыць, што слова *szrot* запазычана з нямецкай мовы, дзе яно мае значэнне 'шрот; мука грубага памолу' (Брукнер, 534). П. Шэйн, выявіўшы гэта слова ў адной з народных песень (От свинки *шротъ* солонинки), растлумачыў яго як 'дробь, дробинка, крупинка' (Зап., 788). Магчыма, што так трансфармавалася яго значэнне ад старабеларускага 'кавалак', з якім яно ўжывалася яшчэ ў XIV ст.: Волно резникомъ жидомъ, быдло купуючы, в рынку и в клеткахъ своихъ тушами и чвертями, и на *шроты* рубаючы, кому хотя продавати волно (Бярш., 27, 1389). Апошняе значэнне стала, відаць, асновай для ўтварэння значэння адзінкі колькасці.

У сучаснай беларускай мове *шрот* — 'свінцовы шарык для стральбы'. Зусім нядаўна гэта слова стала ўжывацца са значэннем 'камбікармы ў гранулах': Зыходзячы з неабходнасці больш рацыянальнага выкарыстання жмыхоў і *шротаў*...., уводзіцца пачынаючы з 1973 года сустрэчны продаж камбікармоў (замест макухі і *шротаў*)... («Звязда», 22 лістапада 1972 г.). З такім значэннем яно, відаць, запазычана з рускай мовы.

Шматъ: менъсива яловича *шматы* два... (ГЮМ, IV, 65, 1686); З росказання п. бурмистра, для п. Юргелевского купили: мяса *шматы* четыри... (ГЮМ, XX, 3, 1711). Слова ўжывалася таксама са значэннем 'кавалак зямлі': ...просил мене о *шматъ* земъли на поселенъе халупы (АВАК, XXXIX, 10, 1578). Форма жаночага роду *шмата* мела значэнне 'ануча': Портъ: онуча, *шмата* сплюгавленаа, одѣнье плохое (Бяр., 89).

Слова *шмат* ужываецца ў некаторых мясцовасцях Расіі са значэннем 'кавалак матэрыі, тканіны', ва ўкраінскай мове яно мае значэнне 'кавал', а *шмата* — 'шкумат'. У польскай *szmat* — 'кавалак, шкумат', а *szmata* — 'анучка' (Праабр., II, 1241). А. Праабражэнскі лічыць, што яно запазычана рускай мовай праз беларускую і ўкраінскую з польскай, а апошняя запазычыла з нямецкіх дыялектаў, дзе *shcnat, shcnata* — 'адрэзак, кавалак'.

У сучаснай беларускай мове гэта слова ўжываецца з некалькімі значэннямі. М. Каспяровіч зарэгістраваў яго са значэннем 'палаца (зямлі)': Два *шматы* зжалі, а тры асталося (Касп., 353), у Г. Юрчанкі *шмат* — 'участак, дзялянка' (Юрч., 1966, 224). М. Каспяровіч выявіў таксама вытворныя *шмаціна, шмацінка* 'хустка, шкумат'. У І. Бялькевіча *шмат* — 'кавалак' (Бяльк., 499). У творах мастацкай літаратуры гэта слова і памяншальная форма маюць два значэнні — 'кавалак' і 'многа': Пад нізкай столлю шпалеры звісалі закуранымі *шматамі* (Бядуля, I, 346); Гэты паскудны *шматок* паперы, які называўся «Дзяржаўны загад аб з'яўленні», быў афіцый-

ным дакументам (Брыль, I, 185); — Куды ідзеш супраць ночы? Мясцовы? Нешта не пазнаю. *Шмат* незнаёмых пайшло цяпер (Галавач, I, 140). У «Беларуска-рускім слоўніку» даюцца два значэнні гэтага слова: 'много; лоскут, клок'. Апрача гэтага, зарэгістравана каля 90 складаных слоў, першай часткай якіх з'яўляецца *шмат — шматаблічны... шматярусны* (БРС, 1025—1026).

У сучаснай беларускай мове ўжываецца некалькі вытворных ад гэтага слова: *шматаваць, расшматаны, пашматаны*: Гарнастай — подлы і хцівы звер, але з яго робяць бялюткую мантыю, і яе гаспадар чамусьці атрымлівае права *шматаваць* свой народ і процьму другіх (Караткевіч, 1, 136); Падзеленая яшчэ з Юстыніянавых часоў, *расшматаная* на часці, залітая крывёю Італія ўставала адзінай (Караткевіч, 2, 291); Нарэшце, паміж дрэваў пачаў зыбацца месяц, белы і круглы. Ён хаваўся з вачэй, але кожны раз зноў і зноў аказваўся на дрэве і трапятаў там, *пашматаны* рэдкімі галінамі (В. Карамазаў, «Полымя», 1969, № 1, 46).

Штука — адзінка колькасці розных рэчываў:

а) мяса: ...свежыны до варенья и печенья *штукъ три...* (ГЮМ, I, 39, 1679); Подле того свирна другий свиренъ на подклете, высокий, в немъ... мяса — зверины... *штук* 10 (ДМАМЮ, 124, 1560);

б) воску: Воску прошло черес Ковен без мыта 1000 *штук* и 20 и 5 (АЛРГ, 61, 1495); ...онъ ѣхалъ на ярмарокъ Познаня зъ осма *штуками* воску, въ которыхъ важило четыре-

ста и семьдесятъ каменей (Бярш., 156, 1528). *Штука* была асноўнай адзінкай пры аптовым гандлі воскам, пра што сведчаць прывілеі на Магдэбургскае права: ...куповати... воски *штукою* або каменем (СДГА, 4, 1501);

в) тканіны: чамлету чорного *штука*... (РИБ, XX, 275, 1516); куп[или] китаю *штуки* две (ГЮМ, XIX, 38, 1711). Са значэннем адзінкі колькасці ўжываліся вытворныя *штучка* і *полуштучекъ*: ...пани городничой штучку рубку (ГЮМ, I, 20, 1679); Пану Кмите Александровичу 3 *полуштучъки* сукна з мыта Луцкого (РИБ, XX, 306, 1490). Велічыня *штуки* для розных тавараў была розная: палатна — 48 локцяў, іншых тканін — 30, 50, 60, 96 локцяў [8], воску — адзін камень або паўберкаўца. М. Доўнар-Запольскі піша, што пераплаўлены на гарадской васкабойні воск адлівалі ў асобныя формы, якія мелі пэўны выгляд і вагу. Кавалак воску, адліты ў форму, называўся *штукой* [9].

Гэта слова ўжываецца ў рускай мове са значэннем 'рэч, прадмет, цэлы кавалак матэрыі' (Праабр., III, 108), ва ўкраінскай са шматлікімі значэннямі, сярод якіх — 'частка чаго-небудзь, кавалак' (Грынч., IV, 515), ёсць яно ў іншых мовах, у тым ліку ў польскай. А. Брукнер лічыць, што *sztuka* з польскай мовы пранікла ва ўсходнеславянскія, а польская запазычыла яго з нямецкай — *stuk* 'пень,

---

[8] Я. І с а е в и ч. Деякі питання української метрології..., стар. 10—12.

[9] М. Д о в н а р-З а п о л ь с к и й. Государственное хозяйство..., стар. 387—388.

абрубак, кавалак, калода' (Брукнер, 555—556).

У старабеларускай мове слова *штука* было полісемічным, што сведчыць пра яго ранняе запазычанне. Яно ўжывалася таксама са значэннямі 'адзінка, адзін прадмет' і 'хітрасць': Тарчицъ отъ отца Макария законника братского купили *штукъ* пять (ГЮМ, IV, 117, 1686); ...нашли одну *штуку* серебра... (АВАК, VIII, 504, 1618); Не возмете Трои мѣста через войну, если не учините над ним якой *штуки* (Хрэстаматыя па гісторыі беларускай літаратуры, 458).

З некалькімі значэннямі ўжываецца гэта слова ў сучаснай беларускай мове:

а) адзінка, адзін прадмет: У палукашку ў санях ляжала *штук* пятнаццаць зайцаў, рыба, сушаныя грыбы (Колас, IV, 46); Жук штогод прадаваў *штук* некалькі ўкормленых свіней (Брыль, I, 12);

б) кавалак (у фальклорных запісах мінулага стагоддзя): Тады Ілья Мурам асерчаў на яво, узяў шаблю, пурубіў Салаўя на мелкія *штукі* (Бел. эпас, 66);

в) адзінка колькасці тканіны: У дворніка знайшлі (немцы.— *К. С.*) скрынку гарэлкі, прыхаваны новы хамут, *штуку* каверкоту, якія той у час бамбёжкі і неразбярыхі прыцягнуў з магазінаў (У. Карпаў, «Полымя», 1969, № 9, 57);

г) хітрасць, блазенства: Можа я, дурань стары, і не даўся б на гэтую *штуку*, але тут яны ўсе: «Э, а вунь! Ха, ха, ха! Ну і возчык, а толькі смяецца» (Брыль, I, 286). Яно ўваходзіць у склад фразеалагізмаў «штуку ўрэзаць

(адпаліць, удзерці, укроіць)» 'зрабіць штосьці незвычайнае, недарэчнае, што здзівіць людзей' (Янк., 1968, 422), «не вялікая штука» 'нядзіўна, нядзіва, нічога дзіўнага' (Янк., 1968, 258).

У старабеларускай мове са значэннем адзінак колькасці мяса ўжываліся словы *полоть* і *чверть,* якія ўтварыліся ад лічэбнікаў і першапачаткова таксама мелі значэнне 'кавалак мяса пэўнай велічыні'.

Полоть: Мяса вепрового *полтей* двадцать осмь... (АВАК, VIII, 466, 1593); мяса купилъ *полти* 4 (АС, IV, 306—307, 1599). Гэта слова ўжывалася ў «Русской правде»: ...а мяса дати овенъ любо *полоть* (стар. 112). У розных славянскіх мовах яно мела рознае значэнне: ва ўкраінскай — 'палавіна вэнджанай гусі', чэшскай — 'палавіна вэнджанай свінні', у славенскай — 'палавіна', у польскай — 'паўтушы (свініны)'. А. Праабражэнскі лічыць, што генетычна яно звязана з лічэбнікам *половина* (*пол-, полу-*) (Праабр., II, 97). У старабеларускай мове гэта слова мела таксама значэнне 'палавіна вуліцы, сядзібы з аднаго боку вуліцы': Другая *полоть* тогожъ села (АВАК, XIV, 302, 1585).

Вагу *полтя* на Беларусі ўстанавіць не ўдалося. На думку Я. Ісаевіча, ён важыў 26 фунтаў [10].

У сучаснай беларускай літаратурнай мове гэта слова не выяўлена. У запісах вуснай народнай творчасці мінулага стагоддзя *полаць*

[10] Я. Ісаевич. Деякі питання української метрології..., стар. 10—12.

(*полсць*) ужываецца са значэннем 'кавалак сала': Наши дары ни малые, ни великие: починальничку по полтынничку, подхватничкамъ по дзесяць яецъ, музычынку — чырвоны злоты яму на боты, ящо къ тому *полсць* солонины — смычокъ подмазаць (Шэйн, I, 1, 139). Слова *полць* ёсць у слоўніку І. Насовіча: «*полць* (составлено из пол и цяць — пополам разрубить). 1. Полоток, в особенности половина гуся или утки. Цѣлую *полць* въ одзинъ горщокъ положи. 2. Половина свиного сала, вырезанная в длину. Кладзи *полци* въ рядъ (Нас. СБН, 463). У сучаснай беларускай дыялектнай мове яно ўжываецца са значэннем 'вялікі кавалак тоўстага сала' (ЛП, 398).

Чверть: купили харчы розное целяцины *чверть* на школе жидовъской... (ГЮМ, I, 36, 1679); Волно резникомъ жидомъ, быдло купуючы, в рынку и в клеткахъ своихъ тушами и *чвертями*, и на шроты рубаючы, кому хотя продавати волно... (Бярш., 27, 1389).

Б. Грынчанка зарэгістраваў слова *чвертка* ва ўкраінскай мове са значэннем 'палавіна задняй часткі мясной тушы'. М. Нікіфароўскі слова *чвартоўка* растлумачвае як 'рассяканне тушы на чатыры часткі для салення'[11]. Са значэннем 'рассячы тушу' ўжываецца слова *пачвертаваць* у фальклорных запісах Сержпутоўскага: От злупілі яны з вала скуру, павесілі яе на галіну сушыцца, а мяса *пачвертавалі*, закапалі ў зямлю ды й засыпалі трухою з сухога балота (Сержп., 1956, 86). У гэтых самых

[11] Н. Никифоровский. Очерки простонародного житья-бытья..., VII, заўвага 84.

запісах са значэннем 'кавалак мяса' ўжываецца слова *паўчвэрці*: Адрэзаў наш бедны *паўчвэрці* (мяса ад каровы.— *К. С.*), дае ён той бабе *паўчвэрці*, а баба не здолее паперці (Сержп., 1956, 67).

Бясспрэчна, што значэнне адзінкі колькасці набыў дробавы лічэбнік *чвэрть*. Велічыню гэтай адзінкі ўстанавіць не ўдалося.

Коровай (ужывалася рэдка са значэннем адзінкі колькасці сала): ...взяли дей... в томъ дому... *коровай* сала (ГЮМ, XXI, 400, 1598). У рускай мове гэта слова, апрача асноўнага значэння 'вялікі круглы хлеб', мела таксама значэнне 'ком з чаго-небудзь, як напр. каравай сала, каравай масла' (Бурнашоў, I, 267). Прымаючы пад увагу апошняе значэнне, а таксама тое, што ў старабеларускай мове гэта слова шырокага распаўсюджання не атрымала, можна зрабіць вывад, што яно запазычана з рускай мовы са значэннем 'кавалак' і ўжывалася на абмежаванай тэрыторыі (выяўлена ў Магілёўскіх актах).

Плечо: а въ свирнѣ въ Носовѣ знашолъ 10 *плечъ* а 4 сала (Люб., VI); а зъ ятокъ мясныхъ маеть давати кождый резникъ и кождого торгу по *плечу* мяса бараньего на двор нашъ (АЗР, II, 163, 1523). У рускай мове гэта слова ўжывалася як адзінка колькасці мяса. Велічыню гэтай адзінкі В. Бурнашоў растлумачыў так: «Плечо... 2. У животных, в снедь закалываемых, четверть туши, содержащая в себе переднюю ногу, лопатку, половину позвонков и ребра» (Бурнашоў, II, 72).

Такім чынам, слова плечо 'частка цела' набыло значэнне 'кавалак мяса пэўнай велічы-

ні', а потым 'адзінка колькасці'. Відаць, такая адзінка ўжывалася даволі шырока, пра што сведчыць вытворнае *плечковое* 'плата за гандаль мясам'. Волно резникомъ жидомъ, быдло купуючи в рынку и в клеткахъ своихъ... кому хотя продавати волно, не даючи до скарбу Нашого жадное повинности, *плечкового* и лоевого (Бярш., 27, 1389).

б) адзінкі колькасці солі і цукру

Голова — адзінка колькасці цукру: за *голову* цукру 40 грошей... (АС, VII, 18, 1538—1539); до того еще цукру *голову* фунт[ов] пол. г... (ГЮМ, I, 21, 1679).

Гэта слова са значэннем 'частка цела чалавека' ўжываецца ва ўсіх славянскіх і іншых індаеўрапейскіх мовах (Праабр., I, 139—140) і вызначаецца полісеміяй. Адно з яго значэнняў — 'кавалак цукру', якое яно набыло ад падабенства кавалка цукру да галавы. Так, У. Даль піша, што словам *голова* называецца «часам рэч, падобная выглядам на галаву, як напр. галава цукру, галоўка цыбулі, часнаку» (Даль, I, 368). Паколькі *голова* 'кавалак цукру' мела пэўную велічыню, гэта слова магло ўжывацца са значэннем адзінкі колькасці. У сучаснай беларускай мове яно ўжываецца з такім самым значэннем. Так, у «Беларуска-рускім слоўніку» зарэгістравана *галава* сыру. Такое самае значэнне мае памяншальная форма *галоўка*: Як толькі саспелі сыры, ён (Пятро. — *К. С.*) павёз іх прадаваць і ў першую чаргу абдарыў па цэлай *галоўцы* пана Стасека і пана Збышку... (Скрыган, 19).

Головажня — адзінка колькасці солі: Въ Семашка на Пусто мытѣ по двадцати и по пяти *голозаженъ* соли (АЛМ, I, 1, 9, II пал. XV ст.); ...а по 10 *головажень* соли (АЗР, II, 163, 1525). З такім значэннем слова ўжывалася ў «Русской правде»: а пшена 7 оуборковъ а гороху 7 оуборковъ, а соли 7 *головажень* (Русская правда, 124, Новгородская кормчая, 1283).

Нягледзячы на пільную ўвагу даследчыкаў да гэтага слова, характар яго ўтварэння застаецца незразумелым. І. Сразнеўскі, зарэгістраваўшы яго са значэннем 'мера солі', параўнаў з нямецкім *galwej, galwage*, але паставіў пытальнік — знак сумнення (Сразн., I, 541). Я. Карскі таксама параўноўвае яго з нямецкім *galwej* [12]. М. Фасмер, прааналізаваўшы меркаванні І. Сразнеўскага і Я. Карскага (старажытнае верхненямецкае, сярэдне-верхненямецкае *galwej* 'мера сыпкіх рэчываў'), выказаў сумненне, што гэта слова магло змяніцца так, каб набыць форму *головажня*. Ён лічыць, што яно ўтварылася з двух слоў — *голый* і *вага*. Аднак такая думка наўрад ці правільная, яна не пацвярджаецца адпаведнай словаўтваральнай мадэллю. Не прымаючы пад увагу фанетычныя змяненні гэтага слова, прыгадаем толькі, што ў нямецкай мове *galwej* — 'мера солі'. На Беларусі соль не здабывалася, а прывозілася з-за мяжы, а разам з прывазным таварам даволі часта прывозілася і адзінка, якой вызначалі коль-

[12] Е. Карский. Русская правда по древнейшему списку. Л., 1930, стар. 95.

касць тавару. Паколькі сведчанняў, што *головажня* была мерай сыпкіх рэчываў, няма, наадварот, ёсць сведчанні, што гэта быў кавалак солі, то можна дапусціць, што слова *головажня* мела таксама значэнне 'кавалак солі'. Магчыма, меў рацыю Е. Цімчанка, які тлумачыў значэнне гэтага слова як 'галава солі' (ІСУЯ, І, 550).

Характэрна, што гэта слова, якое бытавала ў мове з агульнаўсходнеславянскага перыяду, выйшла з ужывання і ў сучаснай беларускай мове не выяўлена.

Гуска — адзінка колькасці солі: купили на обедъ... соли *гусакъ* ѣі (ГЮМ, І, 57, 1679); Третьего дня на обедъ... соли *гусак* ѣ (ГЮМ, І, 58, 1679).

У Е. Цімчанкі зарэгістравана слова *гусакъ* са значэннем 'драбок выпаранай солі' (ІСУЯ, І, 631). У. Даль растлумачыў значэнне гэтага слова як 'вываранаяся соль у выглядзе галавы цукру' (Даль, І, 410). У польскай мове *huska* — 'малы вясельны хлябок' і 'галава выварапай солі' (Карл., ІІ, 65), у чэшскай — 'салёная булачка прадаўгаватай формы', а ва ўкраінскай — 'род пячэння' (Грынч., І, 342). Магчыма, што такія значэнні слова *гуска* набыло таму, што булкі (пячэнне) мелі форму, падобную да гусі. У далейшым значэнне слова стала больш агульным — 'кавалак' (у тым ліку і солі), ад якога ўтварылася значэнне адзінкі колькасці.

Толпи (форма назоўнага склону адзіночнага ліку не выяўлена) — адзінка колькасці солі: тымъ арендаромъ отъ кождое тысечи

толпъ великихъ по два гроши, а отъ тысячи *толпъ* малыхъ по грошу давши, ...далей съ тою солью добровольне ѣздили (АВАК, III, 294, 1550); ...никому в месте не было волно продавати соли толко ему, а давал *толп* седмнадцать за пеняз (ГБДМ, 348, 1566).

У «Словаре древнего актового языка» М. Гарбачэўскі піша: «*Filary solne, fisty* саляныя стаўпкі. Стаўпкі гэтыя, якімі прадавалася соль, мелі форму ўсечаных пірамід. Яны ў актах маюць дваякую назву: стаўпкі большых памераў называліся гурманамі, а меншых — *толпамі* або *толпкамі*» (Гарб., 132). Пра паходжанне гэтага слова А. Брукнер сцвярджае, што яно з'яўляецца аднакарэнным з рускім *толпа* і ўкраінскім *втолпитись* 'уціснуцца' (Брукнер, 572) і, дададзім ад сябе, беларускім *тоўпіцца* 'месціцца' (Капуста *стоўпілася* ў бочку — Бягомль). Таму, магчыма, слова *толпи* першапачаткова мела значэнне 'соль (яе пэўная колькасць), якая стоўпілася ў форме пры сушцы', а потым 'кавалак солі пэўнай велічыні' і, нарэшце, 'адзінка колькасці'.

Плитка — адзінка колькасці солі (ужывалася рэдка, выяўлены толькі адзін прыклад): ...соли ѣі *плитокъ* (ГЮМ, I, 49, 1679). Слова *плита,* ад якога ўтварылася памяншальная форма *плитка,* прыйшло з грэчаскай мовы (πλίνθος). А. Праабражэнскі адносіць яго да дыялектных у рускай мове, тлумачачы значэнне як 'тоўстая дошка з чыгуну, каменю' (Праабр., II, 75, 77). Відаць, гэта слова набыло значэнне адзінкі колькасці таму, што мела значэнне 'кавалак солі пэўнай велічыні і формы'.

в) адзінкі колькасці тканіны

Косякъ (ужывалася рэдка): ...да у Гриди жъ у Ликина взяли силно тѣ жъ мытники *косякъ* тафты... сто аршинъ, да два аршина кафинскихъ (Зб., 10, 1488); ...дал до жоны его китайки толко один *косякъ*, одно того не ведаю, колко локот тое китайки (АВАК, XXXIX, 299, 1579).

Гэта слова ў этымалагічных і гістарычных слоўніках зарэгістравана з рознымі значэннямі. А. Праабражэнскі растлумачвае яго як 'табун коней' (Праабр., I, 369), у Г. Кочына «косяк, косячек — кавалак тканіны» (Кочын, 153), Б. Грынчанка сярод іншых значэнняў прыводзіць 'кавалак сеткі' (Грынч., II, 292). І. Сразнеўскі зарэгістраваў гэта слова са значэннем 'кавалак', прычым не толькі тканіны, але і мяса: ...съ лавки по *косяку* мяса (Сразн., I, 1299). Утварэнне гэтага слова і яго паходжанне аўтары слоўнікаў не тлумачаць, аднак бясспрэчна, што яно мела значэнне 'кавалак', ад якога ўтварылася значэнне адзінкі колькасці.

Пра велічыню *косяка* ў канцы XV ст. можна меркаваць па цытаваным прыкладу — «сто аршинъ».

У сучаснай беларускай мове з колькасным значэннем гэта слова не выяўлена. І. Насовіч зарэгістраваў яго са значэннямі 'палка даўжынёй на сажань' і 'драўляны брус каля акна ці дзвярэй' (Нас. СБН, 249). У сучаснай літаратурнай мове яно выяўлена са значэннем 'парадак лёту самалётаў': Машыны ішлі пра-

вільным *касяком*, у стройным ладзе, яны забіралі шырокі паўкруг над горадам, увесь час ідучы вышэй і вышэй (Самуйлёнак, I, 133).

Кусок. Гэта адзінка была запісана ў прывілеях на Магдэбургскае права як асноўная ў аптовым гандлі тканінай: тежъ маютъ (купцы. — *К. С.*) продавати сукна поставомъ, китайки и тафты *кускомъ* ...(АЗР, II, 91, 1511).

Кусокъ — гэта памяншальная форма слова *кусъ*, якое ў старабеларускай мове ўжывалася са значэннем 'кавалак, частка': Жаловалъ мне подданый господарьский... Войтковичъ на ...Андрея Мицутича о томъ, штожъ дей онъ въ земли отчизной нашой мнѣ делъ третюю часть поступилъ, нижли дей наменьшого *куса* сеножати къ той третей части мнѣ поступити не хочет (АВАК, XVII, 143, 1540). Фразема «жадного *куса* нет» мела значэнне 'няма ніколькі' (Люб., V, паміж актамі 1506 г.). Гэта слова і яго памяншальныя формы ўжываліся ў польскай, чэшскай, украінскай і рускай мовах са значэннем 'кавалак, частка'. Яно ўтварылася ад дзеяслова *кусать* і першапачаткова абазначала кавалак, адкушаны зубамі. У далейшым яно пашырыла значэнне і стала абазначаць любы кавалак. Гэта значэнне стала асновай для ўтварэння адзінкі колькасці.

У сучаснай беларускай мове *кус (кусок)* — 'кавалак, частка': Дастаць бы *кусок* зямлі, пабудаваць сваю хату і жыць, нічога не баяцца, нікому не гнуцца (Колас, IV, 42); Што ж я дрэннае раблю? Люблю дзяўчыну, хачу з ёй пажаніцца, хачу зямлі *кусочак*, каб было на чым з ёю жыць спакойна і шчасліва (Крапіва, III, 99).

г) адзінкі колькасці металу

Крица: Съ путныхъ і съ тяглыхъ людей мезлевныхъ... ильну пол-осмаста, ...сохъ жолѣза *крицъ* 50 (АС, VII, 17, 1520); Железа двѣстѣ *крицъ* и 8 *крицъ* (АС, VII, 15, пасля 1520 г.).

Гэта слова бытуе ў рускай і ўкраінскай мовах. Самае ранняе яго ўжыванне, выяўленае ў помніках, датуецца XV ст. (Сразн., I, 1325). Г. Кочын зарэгістраваў яго са значэннем адзінкі колькасці металу: «штучная і вагавая адзінка лічэння жалеза паўфабрыкату; крыцамі жалеза выплочваўся натуральны аброк» (Кочын, 162). У. Даль зазначае, што на крыцу («свежая глыба вываренного из чугуна железа, идущая под огромный (кричный) молот, для отжимки, проковки и обработки в полосовое и др. железо») трэба 12 і больш пудоў металу (Даль, II, 93). Ва ўкраінскай мове слова *крыця* мае значэнне 'чыстая сталь' (Грынч., II, 308).

Пра паходжанне гэтага слова ёсць дзве думкі: першая, выказаная А. Сабалеўскім і падтрыманая А. Праабражэнскім: яно з'яўляецца аднакарэнным са словамі *кра, икра, крига* (Праабр., I, 386—387); другая, выказаная Міклашычам і Н. Гараевым, падтрыманая М. Фасмерам: яно запазычана з нямецкай мовы — ням. *Kritze, Kritzeisen* (Фасм. II, 378). Прымаючы пад увагу тое, што многа металу і вырабаў з яго прывозілася з-за мяжы, ёсць падставы падтрымаць другую думку пра паходжанне гэтага слова. У старабеларускай мове,

як паказвае матэрыял, яно мела значэнне 'кавалак металу пэўнай велічыні'.

У сучаснай беларускай мове слова *крыца* ўжываецца рэдка. У творах мастацкай літаратуры выяўлены прыклад, дзе яно мае значэнне 'кавалак металу': Два другія рагі (мапы.—*К. С.*) прыціснулі срэбнай чарніліцай і кавалкам губчатай *крыцы* (Караткевіч, 1, 353).

Свинья — адзінка колькасці свінцу і волава: свинцу десять *свиней,* а десятая не цела (Люб., VI, сярод актаў 1506 г.); ...а особливе олову *свинья* цѣлая и штукъ великихъ пять... (АС, III, 65, 1604).

Гэта слова са значэннем адзінкі колькасці ўжывалася ў рускай мове. М. Кастамараў піша: «Свинец привозился к нам свиньями, в десяти свиньях было веса 82 пуда с четвертью»[13]. У польскай мове гэта слова мае значэнне 'ком, груда волава', 'адзінка колькасці дрэва' (Карл., VI, 789).

Паходжанне слова няяснае. Магчыма, яно мае сувязь з рускім *свинка* 'форма, зробленая ў пяску для прыёму чыгуну, калі ён ідзе з домны' (Бурнашоў, II, 197) і 'злітак чыгуну, каля двух пудоў' (Даль, IV, 149).

У старажытнасці гэта слова, пэўна, мела значэнне 'кавалак свінцу ці волава пэўнай формы і велічыні', ад якога ўтварылася значэнне адзінкі колькасці. Не выключаецца магчымасць, што яно запазычана з якой-небудзь

---

[13] Н. Костомаров. Очерк торговли Московского государства, стар. 201.

суседняй мовы, з той краіны, адкуль прывозілі свінец і волава.

Штаба: железа старого одъ муру *штапъ* полътрети (АВАК, XX, 137); до того приложили *штабы* две, ...важили пудъ одинъ и безменовъ пять (ГЮМ, VIII, 53, 1691).

І. Насовіч зарэгістраваў гэта слова са значэннем 'паласа' (відаць, жалеза), а ў прыкладах, якія ён цытуе, яно мае значэнне адзінкі колькасці. Пра паходжанне слова Я. Карскі піша, што яно прыйшло з нямецкай мовы (*stab* 'жалезны прут') праз польскую [14]. У старабеларускай мове яно ўжывалася і са значэннем 'жалезная паласа': ...олову у *штабахъ* двадцать чотыри (АС, III, 65, 1604). Такое значэнне яно мае і ў сучаснай мове: Дрыжачамі ад хвалявання рукамі апоўначы пааддзіралі з гваздоў, паразгіналі іржавыя *штабы* кратаў (Брыль, II, 27). У «Беларуска-рускім слоўніку» яно зарэгістравана з такім самым значэннем з паметаю «абласное».

Шына: ...а въ свирнѣ въ Носовѣ знашолъ... 4 *шины* желѣза (Люб., VI, сярод актаў канца княжання Аляксандра); железа *шынъ* пятьдесятъ чотыры (ГЮМ, XXI, 424, 1625).

Гэта слова запазычана старабеларускай мовай з нямецкай (у сучаснай нямецкай мове *die Schiene* 'шына, рэльс'). Яно ўжывалася ў рускай мове са значэннем 'паласа шыннага жалеза, нацягнутая на вобад' (Бурнашоў, II, 352). Такое значэнне яно мае ў сучаснай беларускай мове: Заўсёды каля яго кузні многа народу: падкоўваюць коней, куюць нарогі, нацягваюць *шыны* на калёсы (Бядуля, IV, 471).

[14] Е. Карский. Белорусы. Введение..., стар. 159.

д) адзінкі колькасці розных тавараў

Са значэннем адзінкі колькасці паперы і зрэдку бляхі ўжывалася слова *аркуш*: Паперу купили на ладунки *аркушовъ* десять (ГЮМ, VIII, 139, 1691); На ветреникъ, на погоню, жести *аркуши* два (ГЮМ, IV, 186, 1686). З такім значэннем ужывалася вытворнае *поларкуша*: тот выписъ есть выданъ нам и писанъ водле потреб наших на трех *полуаркушах* паперу и на четверты *поларкуша* (ГЮМ, XXXII, 225-II, 1578). Са значэннем адзінкі колькасці паперы і бляхі гэта слова ўжывалася ў польскай (Карл., I, 58) і ўкраінскай (Грынч., I, 9) мовах. У слоўніку Я. Карловіча *arkusz* тлумачыцца так: «адзінка велічыні, абмежаваная пэўнай даўжынёй і шырынёй».

Слова *аркуш* запазычана з лацінскай мовы. Такую думку выказалі і аўтары «Słownika języka polskiego», і М. Фасмер. Але калі аўтары польскага слоўніка лічаць, што яно паходзіць ад лац. *arkus* 'лук', а развіццё значэння 'аркуш паперы' адбылося таму, што аркуш у час сушкі меў падабенства з сагнутым лукам, то М. Фасмер прытрымліваецца думкі, што лац. *arkus* 'дуга' набыло значэнне 'аркуш паперы' праз пераходнае 'сагнутая, складзеная папера' (Фасм., I, 87).

Зрэдку слова *аркуш* ужывалася са значэннем адзінкі колькасці шпілек: Шпилек купили *аркушъ* за осм[аков] шесть (ГЮМ, VIII, 83, 1691). Такое значэнне яно набыло, напэўна, таму, што шпількі для продажу прымацоўваліся на аркуш паперы, як і цяпер прадаюцца некаторыя дробныя прадметы (тыя самыя

шпількі, гузікі і інш.). Паколькі ў практыцы на аркуш прымацоўвалася пэўная колькасць шпілек, то гэта слова набыло колькаснае значэнне.

У сучаснай беларускай мове слова *аркуш* не страціла значэння адзінкі колькасці паперы. Такой адзінкай шырока карыстаюцца ў выдавецкай практыцы. У залежнасці ад шырыні паперы і спосабу ўліку адрозніваюць аўтарскі аркуш, улікова-выдавецкі, друкаваны, папяровы, умоўна-друкаваны.

Брусъ (брусокъ) — адзінка колькасці мыла: мыла барского *брусовъ* шесть... (АВАК, XX, 136, 1598); мыла работы Виленской *брусковъ* с (200)... (АВАК, XIV, 147, 1607).

Гэта слова ў помніках старабеларускага пісьменства выяўлена таксама са значэннямі 'абчасанае дрэва' і 'вастрыльны камень': *Бруски* три трисажневыхъ купили отъ пана Григория Агапоновича (ГЮМ, IV, 175, 1686); *Брусокъ* купили рыдли острить (ГЮМ, VIII, 166, 1691). Са значэннем адзінкі колькасці слова *брус* ужывалася ў рускай мове (Кочын, 38), а ў польскай *brusek* — 'трох-пяціфунтовы кружок сыру' (Карл., I, 213).

Гэта слова і аднакарэнныя з ім ужываюцца ва ўсіх славянскіх мовах, што дае права А. Брукнеру аднесці яго да праславянскіх (Брукнер, 42). А. Праабражэнскі на аснове аналізу значэнняў аднакарэнных са слова *брус* прыйшоў да вываду, што ва ўсіх іх ёсць прыкмета «шараваць, абціраць» (Праабр., I, 47). У старабеларускай мове яно, відаць, мела значэнне 'кавалак', якое набыло ад падабенства кавалка мыла з брусам (прадаўгаваты,

чатырохкантовай формы). Гэта значэнне і стала асновай для ўтварэння значэння адзінкі колькасці.

У сучаснай беларускай мове *брусок* — 'вастрыльны камень' і 'чатырохкантовы прадаўгаваты кавалак чаго-небудзь'. Са значэннем адзінкі колькасці ў дыялектнай мове выяўлены *брус*: Да папалася малайцу — неўмыванаму ліцу. Да *брус* мыла змыліла, пакуль ліцо вымыла (В. Рожын, МКДЭ МПІ).

Груда — адзінка колькасці масла (ужывалася рэдка, выяўлены толькі адзін прыклад): ...нашла купа в лазни свечъ сорокъ Оврамовыхъ, весло грыбовъ того жъ Оврама, масла тры *груде* Свиридовны (АВАК, XVIII, 252, 1620).

Як паказвае аналіз ужывання гэтага слова ў сучаснай беларускай мове, яно мае наступныя значэнні: 'сухая выспа, звычайна пасярод балота', а на Палессі — 'сена, скошанае з сухога лугу'; 'куча розных прадметаў'; 'камок, камлыга, часцей мёрзлай зямлі'. З многімі значэннямі гэта слова ўжывалася ў іншых славянскіх мовах, у тым ліку і ў рускай. Яго зарэгістраваў У. Даль: «груда, куча, ворох, кипа; ярос[лавское] насыпной курган, древняя могила, н[о]вг[о]родское, весь[егорское] бабка хлеба, сложенная кучкой в десять снопов; вят[ское] толпа скота или народа. Юж[ное] глыба, кусок, комок, более гов[орят] грудка, грудочка. Дай грудку сахару. Навалили целую груду книг... (і іншыя значэнні. — *К. С.*)». Як бачым, У. Даль прыводзіць прыклады і са значэннем адзінкі колькасці.

Як у беларускай, так і ў рускай мове слова *груда* мае значэнне 'камок', 'кавалак', якое, відаць, і стала асновай для ўтварэння значэння адзінкі колькасці.

Кружокъ — адзінка колькасці воску: мѣщанинъ Ковенский провади до Кролевца воску *кружковъ* в̃ (2) малыхъ, у нихъ важитъ каменей θ (9); Богданъ Михайловичъ... провади до Кролевца воску *кружковъ* г̃ (3), в нихъ важить каменей ч̃ (90) (АВАК, XIV, 646, 1607).

Са значэннем адзінкі колькасці І. Сразнеўскі зарэгістраваў слова *кругъ*: «*кругъ* воску» (Таможенная новгородская грамота 1571 г.) (Сразн., I, 1249).

Раней ужо прыводзіліся словы М. Доўнар-Запольскага, які пісаў, што, пераплаўляючы воск на гарадскіх васкабойнях, яго затым адлівалі ў спецыяльныя формы ў выглядзе паўкруга. Такія паўкругі мелі пэўную велічыню і называліся штукамі. Магчыма, што воск адліваўся і ў круглыя формы, таму слова *круг* і яго памяншальная форма набылі значэнне 'кавалак воску пэўнай формы і велічыні', а потым 'адзінка колькасці'.

У сучаснай беларускай літаратурнай і дыялектнай мове гэта слова з апошнім значэннем не мае пашырэння. У адной з песень, запісанай І. Насовічам, слова *круг* ужываецца са значэннем адзінкі колькасці масла: Съ суботы на недзѣлю собралася [имярекъ] родзина; знесли жъ ёны семъ ситъ муки... Знесли жъ ёны масла семъ *кругъ;* хвала богу, будзець каравай як пухъ (Зап., 191).

АДЗІНКІ ЛІЧЭННЯ

У гандлёвай практыцы, а таксама ў побыце для вызначэння колькасці тавару (рэчыва) ужываюцца адзінкі лічэння. Адзінкі лічэння — гэта словы, якія абазначаюць пэўную, замацаваную практыкай колькасць адзінкавых прадметаў. Такія словы ўжываліся ў старабеларускай мове. Паводле паходжання яны падзяляюцца на дзве групы: адзінкі лічэння нелічэбнікавага паходжання (назвы цэлых лікаў); запазычаныя адзінкі лічэння, якія ў той мове, з якой яны запазычаны, ужываліся як лічэбнікі.

АДЗІНКІ ЛІЧЭННЯ НЕЛІЧЭБНІКАВАГА ПАХОДЖАННЯ (НАЗВЫ ЦЭЛЫХ ЛІКАЎ)

Сорокъ — шырока ўжывальная адзінка лічэння футравых скурак: небожъчикъ кн[я]зь Василей Жилинский... виненъ его м[и]л[о]сти былъ два *сороки* соболей (БА, II, 79, 1532); Горностаев решту назад отдали *сороковъ* осемъ (ГЮМ, VIII, 195, 1691).

Многія даследчыкі аналізавалі гэта слова, аднак і цяпер пытанне яго паходжання не вырашана. Вылучаюцца дзве асноўныя думкі пра

яго ўзнікненне. Першая: слова запазычана з грэчаскай мовы; другая: слова *сорока* мела першапачатковае значэнне 'сарочка, кашуля', потым набыло значэнні 'мех', 'адзінка лічэння' і, нарэшце, стала абазначаць лічэбнік.

Думка пра грэчаскае паходжанне падтрымана А. Праабражэнскім і паўторана М. Фасмерам. Сутнасць яе ў тым, што *сорок* — гэта зменены грэчаскае слова τεσαρακοντα, σαρακοστι «сорокоустие, сорокодневная заупокойная служба' (такія значэнні дае І. Сразнеўскі — Сразн., III, 464). Гэту думку падтрымлівае і А. Брукнер. Ён піша: «Сорак (sorok), слова рускае (чатыры дзесяткі) з грэчаскай sarakonta, sarakosti; ужываецца ў нас (у польскай мове. — *К. С.*) часцей за ўсё ў XVI і XVII стст. Пра звязку (сорак) скурак сабаліных ці кунічных, якія цар дараваў паслам» (Брукнер, 507).

У старарускай мове слова *сорокъ* ужывалася з двума значэннямі — 'чатыры дзесяткі' і 'адзінка лічэння футравых скурак'. Калі меркаваць па прыкладах, якія прыводзіць І. Сразнеўскі, назва лічэбніка ўжывалася раней, чым адзінка лічэння. Адначасова для абазначэння чатырох дзесяткаў ужывалася *четыредесѧте*. Апошні прыклад, які дае І. Сразнеўскі з гэтым лічэбнікам, датуецца 1311 годам. Магчыма, што назва лічэбніка *сорокъ* выцесніла старое *четыредесѧте*. У старабеларускай мове яшчэ ў XVII ст. для абазначэння лічэбніка ўжывалася *четыредесять* і *сорокъ*: ...року Божия тысяча шестьсотъ *четыредесятого* четвертого (АЗР, V, 73); ...въ семъ року тысечи шестьсот *чотырдесятомъ*... (АС, I, 311); Лѣта

...тисеча шестьсотъ *сорокъ* осмого... (АВАК, XVIII, 367); ...за шесть копъ и за *сорокъ* грошей... (АВАК, XVIII, 248, 1619).

Калі лічыць, што слова *сорокъ* раней ужывалася як лічэбнік, то больш верагодна, што яно запазычана.

Другая думка грунтуецца на тым, што фігравыя скуркі прадаваліся ў мяшках. У такія мяшкі складалі па 40 скурак — столькі іх трэба было, каб пашыць футра. Такія мяшкі называлі *сорокамі*. Гэта думка не мае неаспрэчных доказаў.

Па-першае, *сорокъ* і *сорока* (дарэчы, слова *сорока* 'кашуля' ў слоўніках не выяўлена, ёсць толькі памяншальная форма *сорочка*) адрозніваюцца марфалагічным афармленнем (лічэбнік і адзінка лічэння — мужчынскага роду, 'кашуля' — жаночага). У помніках і ў гістарычных слоўніках не выяўлена ні аднаго выпадку, каб гэтыя словы мелі аднолькавае марфалагічнае афармленне.

Па-другое, у засведчаных прыкладах ні ў агульнаўсходнеславянскай, ні ў старабеларускай і рускай мовах няма выпадкаў выкарыстання слова *сорока* (*сорочка*) са значэннем 'мех'. Відаць, яно ўстанаўліваецца лагічна, паводле аддаленага знешняга падабенства кашулі і меха. Калі ж дапусціць, што развіццё значэнняў ішло такім шляхам: 'мех' → 'мех са скуркамі' → 'назва лічэбніка', то тады назва лічэбніка стаіць апошняй у радзе, хоць прыведзеныя ў «Матэрыялах...» І. Сразнеўскага прыклады сведчаць, што лічэбнік стаіць калі не раней за адзінку лічэння, то ў адным радзе з ёй. Пра даўнасць ужывання слова

сорокъ — назвы лічэбніка сведчыць і тое, што І. Сразнеўскі зарэгістраваў прыклады, у якіх пры лічэнні грошай назва грашовай адзінкі апускаецца, а ўжываецца толькі слова *сорокъ*, што магло быць пераходнай ступенню ад назвы лічэбніка да адзінкі лічэння: а ты гне Григории возми е̃ сороковъ и всего [б]удеть з̃ сороковъ (XIV ст.).

Прааналізаваны матэрыял схіляе да думкі, што *сорокъ*—зменены грэчаскае *σαρακοντα*— спачатку абазначала лічэбнік, а потым стала ўжывацца са значэннем адзінкі колькасці магчыма таму, што на футра патрэбна было 40 скурак.

У сучаснай беларускай мове слова *сорак* ужываецца як лічэбнік, поўнасцю выцесніўшы *четыредесять*.

Пара — дзве адзінкі, два аднолькавыя прадметы — ужывалася для лічэння розных прадметаў: Яникъ Довкгучонисъ зъ сынми, волока, на той воловъ *пара,* клячъ трое, коровъ двѣ (АВАК, XIV, 529, 1595); ...юхти всее *пар* ф̃ке (525)... (АВАК, XIV, 651, 1607); Кременя купили до пистолетовъ *паръ* чотыри (ГЮМ, VIII, 139, 1691).

Гэта слова ўжываецца ў іншых славянскіх мовах, яно прыйшло з нямецкай, дзе *paar* — 'два падобныя прадметы'. Нямецкая мова ў сваю чаргу запазычыла слова з лацінскай (*pār* 'роўны').

У сучаснай беларускай мове слова *пара* мае значэнне 'два падобныя прадметы' і 'раўня': *пара* ботаў; ехаць на *пары* (БРС, 621); Ён табе не *пара*; Чорт не адны лапці стаптаў, пакуль *пару* сабраў.

Соха — адзінка лічэння валоў як рабочай жывёлы, а таксама нарогаў: волов рабочих *чотыри сохи* (ДМ БССР, 22, канец XVI ст.); у другомъ дворцы Заозерью челяди невольной Хомицу поставницу узялъ, воловъ *сохъ* две, коровъ дойныхъ дванадцать (АВАК, XXII, 237, 1566); Петръ, Матьясъ, Михно, ковали, дымы 3, служба з давныхъ часовъ даютъ на замокъ и на дворцы Радошковские на Великъ день 15 *сохъ* нароговъ, а о семой суботе другую 15 *сохъ* нароговъ... (ДМАМЮ, 106, 1549).

Гэта слова з рознымі значэннямі ўжываецца ва ўсіх славянскіх мовах (Праабр., II, 353). Асновай для ўтварэння значэння 'адзінка колькасці валоў і нарогаў' стала значэнне 'земляробчая прылада'. *Соха* нарогаў — гэта колькасць, якая патрэбна на адну саху, звычайна два нарогі, а *соха* валоў — гэта колькасць валоў, якая запрагалася ў адну саху, таксама два валы. Утварэнне значэння адзінкі лічэння валоў звязана з тым, што *соха* валоў была абкладной падатковай адзінкай, пра што сведчаць дакументы: Штожъ дей его милости кажеть новину чынити и великии подачки на насъ дяку своему правити — отъ *сохи воловой и коньской* по полукопью грошей, а по бочце овса, а по возу сена (Доўн.-Зап., 1905, 28, 1536). Паколькі *соха* была абкладной адзінкай, якая сведчыла пра заможнасць гаспадаркі і яе магчымасць апрацоўваць зямлю, бо саха і валы, якія ў яе запрагаліся, былі сродкамі сельскагаспадарчай вытворчасці, то валы лічыліся на сохі, каб выявіць патэнцыяльную магчымасць гаспадаркі. У саху запрагалі двух валоў, таму *соха воловъ* — два валы.

У рускай мове была аналагічная адзінка лічэння — *плуг:* «Купить плуг волов» — значит купить 3 или 4 пары волов» (Бурнашоў, II, 77).

Значэнне адзінкі колькасці мае слова *саха* ў адной з песень, запісаных П. Шэйнам: Да бывай здароў, май сто кароў, май сто кароў, пятьдесятъ канёў, май пятьдесятъ канёў семь *сохъ* волоў, семь *сохъ* волоў, полтораста роёвъ (Зап., 385).

Пасма — адзінка лічэння прадзіва; ...всю моетность мою побрал и ничого не зоставилъ, то естъ: ...пражи простичной *пасом* шесть (АВАК, XVII, 442, 1565). Хоць у помніках старабеларускага пісьменства выяўлены толькі адзін выпадак ужывання гэтага слова, нельга сцвярджаць, што яно не мела шырокага распаўсюджання. Факты сучаснай мовы, этнаграфічныя матэрыялы паказваюць, што *пасма* з глыбокай старажытнасці была адзінкай лічэння. Рэдкае ўжыванне ў помніках можна растлумачыць тым, што гэта была спецыфічная адзінка, якой лічылі ніткі пры тканні, тады як звычайна колькасць нітак вызначалі *мотками* і *клубами.*

Слова *пасма* ўжываецца ў многіх славянскіх мовах: рускай, украінскай, славенскай, балгарскай, сербскай, чэшскай, польскай, верхне- і ніжнелужыцкай, палабскай (Махэк, 355). В. Махэк адзначае, што ва ўсіх славян *пасмо* (*pasmo*) — '20, 30, 40 нітак, сабраных у пук' і лічыць, што гэта слова было запазычана з лацінскай мовы, дзе *puosms* — 'жмуток, шматок лёну, выскубленага двума пальцамі'. А. Праабражэнскі, спасылаючыся на Мікла-

шыча, Педарсана і Вондрака, робіць вывад, што гэта слова генетычна звязана са старажытным верхненямецкім *fasa, faso,* ніжненямецкім *faser* 'нітка, валакно' (Праабр., II, 21). Нельга не прыгадаць і думку Ф. Шымкевіча, які не сумняваўся, што слова *пасмо* — аднакарэннае з *пас* [1]. Аднак канчатковага вываду пра паходжанне слова зрабіць пакуль нельга.

У сучаснай беларускай мове слова *пасма* значэння адзінкі лічэння не страціла. Ніткі на пасмы лічаць двойчы — пры перамотванні на матавіла (ведаючы даўжыню адной ніткі, якая абкручваецца вакол матавіла, можна вызначыць яе агульную даўжыню) і пры снаванні кроснаў, каб ведаць шырыню тканіны (паведаміла Н. В. Гаўрош). Як адзінка лічэння *пасма* — 30 нітак.

У літаратурнай мове гэта слова выяўлена са значэннем 'пук, жмут': *Пасма* пушыстых каштанавых валасоў выбівалася з-пад шапкі і паспела ўжо заінець, нібы юнак пасівеў (Караткевіч, 2, 9).

Копа — адзінка лічэння самых разнастайных прадметаў — збожжа ў снапах, сыроў, шапак, лыжак, дрэва (бярвення), цвікоў і інш.: А потомъ поличивши жито снопами, подалъ *копъ* двадцать осмъ малое ярицы, ...полбы *копъ* три, сноповъ десеть (АС, III, 69, 1606); *сыровъ* копъ полторы (АС, I, 203, 1597); шапокъ посполитыхъ *копъ* 10 (АС, III, 296, 1583); Бервеня доброго соснового, на будованье годного, по чотыри сажни, подалъ *копы* двѣ и

[1] Ф. Шимкевич. Корнеслов русского языка, ч. II. СПб., 1842, стар. 10.

чотыри бервены (АВАК, XIV, 77, 1563). Шырока ўжывалася гэта слова як адзінка лічэння грошай: ...взялъ есми семнадцать *копъ* грошей Литовское личбы (АС, I, 186, 1592); У Олехна Полупановича *копъ* двѣ грошей (АВАК, VI, 16, 1589).

Самае ранняе ўжыванне гэтага слова са значэннем адзінкі колькасці грошай, выяўленае ў помніках, датуецца 1351 годам: далъ имъ панъ Вятслъвъ 6 *копъ* грошъ вѣского сребра (АЗР, I, 20). Адносна пачатку яго ўжывання з метрычным значэннем А. Брукнер выказвае меркаванне, што гэта адбылося пасля таго, як пры Вацлаве чэшскім з грыўны пачалі выбіваць 60 грошаў. Калі А. Брукнер мае на ўвазе Вацлава I, чэшскага караля, які кіраваў з 1278 да 1305 г., то можна лічыць, што ў пачатку XIV ст. слова *копа* мела значэнне адзінкі лічэння.

У помніках старабеларускага пісьменства гэта слова выяўлена са значэннем 'груд сена' і 'адзінка колькасці сена': казалъ слугамъ своимъ взяти в него тридцат[ь] *копъ* сена а две четверти ѡвса... (БА, II, 21, 1530).

Як адзінка лічэння слова *копа* ўжывалася ў многіх мовах. Ва ўкраінскай, польскай, чэшскай і палабскай яно мае тыя самыя значэнні, што і ў беларускай: 'капа сена' і 'адзінка лічэння (60 прадметаў)', у балгарскай 'груд', у сербахарвацкай 'стог' і г. д. В. Махэк на аснове аналізу значэнняў гэтага слова і аднакарэнных з ім прыходзіць да вываду, што яно ўтварылася ад дзеяслова *капаць* і першапачаткова мела значэнне 'груд зямлі, пагранічны насып' (Махэк, 218—219). У далейшым

яно, відаць, набыло новыя значэнні і стала абазначаць не толькі пагранічны насып, але ўвогуле груд, насып. Гэту думку пацвярджаюць значэнні ў іншых мовах.

Значэнні гэтага слова падзяляюцца на дзве асноўныя групы — 'капа, стог, узвышша, насып' і 'адзінка лічэння, 60 штук'. Помнікі пісьменства і факты іншых моў не даюць падставы зрабіць акрэслены вывад, як развілося ў слове *копа* значэнне адзінкі лічэння. Адным з магчымых шляхоў мог быць наступны. У старабеларускай мове слова абазначала ўкладку збожжа, і не толькі таго, што было ў снапах. Так, у Статуце Вялікага княства Літоўскага 1588 г. пэўную суму грошай каштавала *жита копа, пшеницы копа, ярицы копа, овса копа, гречыхи копа, гороху копа, проса копа, бобу копа, сочевицы копа, конопель копа* (раздз. XIII, арт. 9). Калі параўноўваць з сучасным спосабам складвання збожжа, то *копа* жыта, пшаніцы, ячменю магла абазначаць і 60 адзінак (снапоў), і груд названага збожжа, у той час як *копа* грэчкі, гароху, «сочевицы» — толькі груд. Магчыма, што ў капу збожжа, якое звязвалася ў снапы, якраз і складвалі 60 снапоў, таму за гэтым словам і замацавалася пэўнае лікавае значэнне — 60 адзінак. В. Махэк бачыць у гэтым астаткі шасцідзесятковай сістэмы лічэння (Махэк, 218—219). Адзінкай лічэння грошай *копа* стала пасля таго, як за гэтым словам трывала замацавалася значэнне адзінкі лічэння. Такі шлях утварэння лікавага значэння — адзін з магчымых і найбольш верагодны, але бясспрэчных доказаў ён не мае.

У сучаснай беларускай мове слова *капа* мае значэнне 'укладка з 20—80 снапоў' (ЛП, 106), а таксама 'адзінка лічэння' і 'адзінка колькасці сена': Гуркоў насаліла цэлу *капу*. Тыя разы былі й тры *капы* (Морач, МКДЭ МПІ); *Коп* трыццаць пяць сена награблі (Бягомль).

Рѣзъ (*резъ*), *либра* — адзінкі лічэння паперы: паперу на реестры купили *либру* (ГЮМ, I, 18, 1679); паперу *рѣзъ* 2 за копу 1... (АС, III, 295, 1583): Купили паперу *резъ* одъ п. Базилевича, на расход мески (ГЮМ, XVII, 9, 1710).

М. Худаш піша, што ў стараўкраінскай мове ўжываліся такія самыя адзінкі лічэння паперы. *Либра* мела 25 аркушаў, а *риза* (фанетычны варыянт *рѣза*) была з 20 *либер* (500 аркушаў). Слова *либра* запазычана з лацінскай мовы (*liber* 'кніжка', а *риза* — з арабскай, дзе *rizme* мае значэнне 'пачак, кіпа', праз італьянскую і польскую мовы [2].

ЗАПАЗЫЧАНЫЯ АДЗІНКІ ЛІЧЭННЯ, ЯКІЯ Ў МОВЕ-КРЫНІЦЫ МЕЛІ ЗНАЧЭННЕ 'ЛІЧЭБНІК'

Тузинъ і *тахеръ*. Гэтыя словы абазначалі адну колькасць — дванаццаць і ўжываліся для лічэння розных прадметаў: ...згинуло семъ *тахеров* белки (АВАК, XXXIX, 138, 1578); ...ножовъ Угорскихъ среднихъ *тахеровъ* 10 за копъ 2 (АС, III, 297, 1583); ...въ той скрини серветъ *тузинъ* и ручниковъ штука... (АВАК, XIV, 362, 1590); ...книжекъ пергаменовыхъ

[2] М. Худаш. Метралогічна термінологія в українській мові кінця XVI — початку XVII стст. — «Доповіді та поведомлення...», стар. 33—36.

тузиновъ 14, а рукавиц замшовыхъ *тузиновъ* 20 (АС, III, 308, 1583). Абедзве гэтыя адзінкі запісаны ў прывілеях на Магдэбургскае права як асноўныя пры аптовым гандлі: ...куповати и продавати... секиры, ножы и инъшыи таковъскіе речы — *тахромъ* (РИБ, XX, 741, 1499); купцы наши не будут мети моцы инако товары свои продавати, а ни куповати... крамныи дробныи рѣчи всякого товару десяткомъ, або в *тузинъ*... (АЗР, II, 91, 1511). Першы ўрывак выпісаны з прывілеяў г. Мінску, а другі—г. Навагрудку. Спецыфічных прычын на ўжыванне таго ці іншага слова не выяўлена, таму можна лічыць, што яны ўжываліся як сінонімы. Праўда, у помніках *тузинъ* трапляецца часцей за *тахеръ*.

Абодва гэтыя словы былі запазычаны старабеларускай мовай. Слова *тахеръ* — нямецкага паходжання (Брукнер, 563), а *тузинъ* — французскага (франц. *douze* 'дванаццаць', *douzaine* 'дванаццаты", у сучаснай французскай мове *douzaine* таксама 'тузін'). Я. Карскі лічыць, што гэта слова запазычана праз польскае пасрэдніцтва [3].

У сучаснай беларускай мове *тузін* мае значэнне адзінкі лічэння: Базыль не спрачаецца. Ён нічога не мае супраць піва і адлічвае грошы на *тузін* бутэлек (Колас, IX, 205); І вось сёлета ёсць добрыя падставы яшчэ раз прабіцца ў *тузін* мацнейшых калектываў, якія разыгрываюць чэмпіёнскія медалі («Настаўніцкая газета», 1 лютага 1969 г.).

---

[3] Е. Карский. Белорусы. Введение..., стар. 137.

Захтикъ (*захцыкъ*) (ужывалася рэдка): А от каменя конопель 2 гроши, от каменя льна 3 гроши, от *захцыка* прадива 5 пенязей... (АС, III, 261, 1583); ...рыбъ ведлыхъ въ чотырехъ полкинкахъ *захтиковъ* в (АВАК, XIV, 651, 1607).

Гэта слова запазычана, відаць, з нямецкай мовы, дзе *sechzig* — 'шэсцьдзесят'. Магчыма, яно ўжывалася ў замежным гандлі як адпаведнік беларускай *копы*.

* * *

З аналізу лексічнага матэрыялу, выяўленага ў помніках старабеларускага пісьменства ў ролі назваў меры, вагі, колькасці і лічэння, можна зрабіць некаторыя вывады пра паходжанне, утварэнне і заканамернасць развіцця гэтых назваў, пра іх лексіка-семантычныя асаблівасці.

Асноўным спосабам утварэння слоў з мегрычным значэннем з'яўляецца семантычны, з дапамогай якога ўтварылася абсалютная большасць назваў. Другім спосабам з'яўляецца марфалагічны. Асноўнымі сродкамі гэтага спосабу былі скарочаная форма лічэбніка *половина* (*полу-*), пры дапамозе якой утвараліся меры розных груп — даўжыні і плошчы, сыпкія і вадкія, вагі, адзінкі колькасці і лічэння; памяншальныя суфіксы (*кватерка, лубочка, фаска, мерка, гривенка, ношка, кружокъ*); скарочаная форма лічэбніка і памяншальны суфікс (*полумерокъ*); некаторыя іншыя суфіксы (*мерник, пудовня*). Адзінкі вымярэння *полуй-*

ца, третинник, осмина таксама ўтварыліся марфалагічным спосабам.

Пры дапамозе марфалагічных сродкаў утвараліся новыя метрычныя адзінкі ад слоў з метрычным значэннем.

Выявіліся некаторыя агульныя заканамернасці ўтварэння і семантычнага развіцця назваў метрычных адзінак усіх груп.

Ва ўсіх разрадах метрычных адзінак ёсць назвы лічэбнікавага паходжання, аднак у кожным асобным раздзеле іх месца неаднолькавае. Самае большае месца яны займаюць у разрадзе сыпкіх і вадкіх мер (*полуйца, третинникъ, чверть, осмина, кварта*). Усе яны, за выключэннем *кварты*, аўтахтоннага паходжання. *Кварта* трывала ўвайшла ў лексічны склад старабеларускай мовы і стала асновай для ўтварэння новай метрычнай назвы (*квaтерка*).

Словы з першапачатковым значэннем 'рэчыва' ўжываліся як адзінкі вымярэння сыпкіх і вадкіх рэчываў (*солодъ, пиво*) і колькасці (*сало, сыръ, хлебъ, воскъ*). Набыццю метрычнага значэння спрыяла тое, што яны маглі ўжывацца са значэннем 'частка рэчыва, кавалак'.

Агульным для мер даўжыні, сыпкіх і вадкіх рэчываў з'яўляецца ўзаемапераход асноўных, найбольш ужывальных назваў ад абазначэння радавога паняцця да відавога і наадварот (*бочка, локоть* абазначалі канкрэтныя меры і мелі значэнне 'сістэма мер сыпкіх рэчываў даўжыні', слова *мера* на глебе старабеларускай мовы — спачатку 'любая мера', а потым канкрэтная метрычная адзінка).

У групах мер пэўнага прызначэння выяўляюцца некаторыя агульныя заканамернасці семантычнага развіцця. Так, адбываецца ўзаемапераход назваў адзінак вымярэння плошчы і назваў зямельных участкаў, назваў адзінак сыпкіх і вадкіх рэчываў і назваў 'пасудзіна' (*осмина, кварта* спачатку адзінкі вымярэння, а потым 'пасудзіна'). Асаблівасць слоў, якія мелі значэнне адзінак сыпкіх рэчываў, тая, што абсалютная большасць іх мела значэнне 'мерка' ('пасудзіна для вымярэння').

Ва ўсіх групах слоў — адзінак вымярэння пераважаюць словы індаеўрапейскага — агульнаславянскага — агульнаўсходнеславянскага паходжання. За кошт уласных лексічных сродкаў у асноўным ішло папаўненне слоў гэтай прадметна-тэматычнай групы. Разам з тым на ўсіх этапах існавання мовы гэта група папаўнялася за кошт запазычання, што не пярэчыць законам развіцця любой жывой мовы. Адны з запазычаных слоў трывала замацоўваліся ў мове, афармляліся паводле яе фанетычных і марфалагічных законаў, а некаторыя не атрымалі шырокага распаўсюджання і выйшлі з ужывання. Найбольшы працэнт запазычанай лексікі сярод адзінак вагі, што адлюстроўвае спецыфіку важання — аднаго са спосабаў вызначэння колькасці рэчыва.

Словы з прааналізаванай прадметна-тэматычнай групы вызначаюцца адноснай устойлівасцю да семантычных змен, некаторыя з іх захоўваюць значэнне, набытае ў агульнаславянскі перыяд, пераважная большасць слоў, што набылі метрычнае значэнне

ў старабеларускі перыяд, захоўвае такое значэнне ў сучаснай беларускай мове.

Метрычная лексіка мае невялікую словаўтваральную здольнасць — у сучаснай беларускай мове, таксама, як і ў старабеларускай, ужываецца невялікая колькасць вытворных, сярод якіх пераважаюць прыметнікі са значэннем 'велічынёй з пэўную меру'. У старабеларускай мове, апрача гэтага, ужывалася невялікая група вытворных са значэннем 'падатак', 'плата за гандаль'.

Некаторыя словы ўвайшлі ў склад фразеалагічных словазлучэнняў, якія шырока ўжываюцца ў сучаснай беларускай мове. Найбольш пашыраныя меры ў словазлучэннях ужываюцца са значэннямі 'многа', 'мала', 'далёка': *не саступіць і цалі, за вярсту* і некаторыя іншыя. Ёсць пэўная тэндэнцыя метрычных адзінак ужывацца з такімі значэннямі. Адным з узораў такой тэндэнцыі з'яўляецца слова *шмат,* якое ў сучаснай мове мае значэнне 'многа'.

Тэматычная група слоў са значэннем адзінак вымярэння, важання, колькасці і лічэння не была ізаляванай, адасобленай ад лексічнай сістэмы старабеларускай мовы. Гэта лексіка арганічна звязана са слоўнікавым складам мовы, з тым складам, з якога яна развівалася і папаўнялася, на аснове якога ўтваралася. Абсалютная большасць слоў была шырока ўжывальнай, мела агульнанароднае выкарыстанне, а па фанетычнай і марфалагічнай будове адпавядала тагачасным нормам беларускай мовы.

КРЫНІЦЫ ЛЕКСІЧНАГА МАТЭРЫЯЛУ

АВАК	Акты, издаваемые Виленскою Археографическою комиссиею, тт. I—XXXIX. Вильна, 1867—1915.
АЗР	Акты, относящиеся к истории Западной России, тт. I—V. СПб., 1846—1853.
Алекс.	Александрыя. Мінск, 1962.
АЛМ	Акты Литовской метрики, т. I, в. 1—2. Варшава, 1896—1897.
АЛРГ	Акты Литовско-русского государства, изданные М. Довнар-Запольским, в. I. М., 1897.
АС	Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси, тт. I—XII. Вильна, 1867—1900.
АЮЗР	Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, т. I. СПб., 1863.
БА	Беларускі архіў, тт. I—III. Мінск, 1927—1930.
БАДГ	Белорусский архив древних грамот, ч. I. М., 1824.
БЛ	Баркулабовская летопись. Киев, 1908.
Бяр.	Лексикон славенороський Памви Беринди. Київ, 1961.
Бярш.	Бершадский С. А. Русско-еврейский архив, т. I. СПб., 1882.
ВС	Витебская старина, т. I. Изд. А. Сапунов. Витебск, 1883.
ГБДМ	Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах, т. I. Мінск, 1936.
Груш.	Грушевский А. С. Пинское Полесье, ч. 1—(2). Киев, 1901—1903.
ГЮМ	Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витеб-

ской и Могилевской, вып. I—XXXII. Витебск, 1871—1906.

Доўн.-Зап. 1901 — Довнар-Запольский М. Государственное хозяйство Великого княжества Литовского при Ягеллонах, т. I (дадатак). Киев, 1901.

Доўн.-Зап. 1905 — Довнар-Запольский М. Очерки по организации Западно-русского крестьянства в XVI в. (дадатак). Киев, 1905.

ДМАМЮ — Документы Московского архива Министерства юстиции, т. I. М., 1897.

ДМ БССР — Дзяржаўны музей Беларускай ССР. Рукапісны фонд.

Зб. — Сборник имп. русского исторического общества, т. XXXV. СПб., 1882.

Люб. — Любавский М. Областное деление и местное самоуправление Литовско-русского государства во время издания первого литовского статута (дадатак). М., 1892.

РКЭ — Ревизия Кобринской экономии. Вильна, 1876.

РИБ — Русская историческая библиотека, тт. XX, XXVII. СПб., 1903, 1910.

РЛА — Русско-ливонские акты. СПб., 1868.

СДГА — Собрание древних грамот и актов городов Минской губернии... Минск, 1848.

Статут — Статуты Вялікага княства Літоўскага 1529, 1566, 1588 гг. (розных выданняў, таму ў кнізе паказваецца не старонка, а раздзел і артыкул статута адпаведнага года).

Устава — Устава на волоки и дополняющие ее документы из шестой книги литовских публичных дел Метрики Литовской. Юрьев, 1913.

Ясінск. — Ясинский М. Уставные земские грамоты Литовско-русского государства. Киев, 1889.

* * *

Багушэвіч — Ф. Багушэвіч. Творы. Мінск, 1967.

Бел. эпас — Беларускі эпас. Мінск, 1959.

Брыль — Я. Брыль. Збор твораў, тт. I—II. Мінск, 1960.

Бядуля	З. Бядуля. Збор твораў, тт. I—IV. Мінск, 1951—1953.
Галавач	П. Галавач. Збор твораў, тт. I—III. Мінск, 1958.
Грамовіч	І. Грамовіч. Выбранае. Мінск, 1968.
ДАБМ	Дыялекталагічны атлас беларускай мовы. Мінск, 1963.
Зап.	Записки русского географического общества по отделению этнографии, т. V. СПб., 1873.
Караткевіч	У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім, кн. 1—2. Мінск, 1968.
Колас	Я. Колас. Збор твораў, тт. IV—IX. Мінск, 1962—1963.
Крапіва	К. Крапіва. Збор твораў, тт. I—IV. Мінск, 1963.
Купала	Я. Купала. Вершы і паэмы. Мінск, 1958.
Мележ	І. Мележ. Людзі на балоце. Мінск, 1965.
МКДЭ МПІ	Матэрыялы картатэкі дыялекталагічных экспедыцый Мінскага педінстытута імя А. М. Горкага.
Мурашка	Р. Мурашка. Сын. Мінск, 1957.
ОРЯС	Сборник Отделения русского языка и словесности, т. 12, ч. II. СПб., 1874.
Палтаран	В. Палтаран. Ключы ад Сезама. Мінск, 1967.
Паслядовіч	М. Паслядовіч. Збор твораў, тт. I—II. Мінск, 1961.
Пташнікаў	І. Пташнікаў. Лонва. Мінск, 1965.
Самуйлёнак	Э. Самуйлёнак. Збор твораў, тт. I—II. Мінск, 1952.
Сачанка	Б. Сачанка. Барвы ранняй восені. Мінск, 1962.
Сержп. 1911	А. К. Сержпутовский. Сказки и рассказы белорусов-полешуков. СПб., 1911.
Сержп. 1956	Казкі і апавяданні беларускага Палесся. Са зборнікаў А. Сержпутоўскага. Мінск, 1956.
Скрыган	Я. Скрыган. Скажы адно слова. Мінск, 1961.
Чорны	К. Чорны. Збор твораў, тт. I, IV. Мінск, 1954, 1955.
Шэйн	Материалы для изучения быта и языка населения Северо-западного края, соб-

	ранные и приведенные в порядок П. В. Шейном, т. I, ч. 1. СПб., 1887; т. I, ч. 2. СПб., 1890; т. II. СПб., 1893; т. III. СПб., 1902.
Шырма	Р. Шырма. Беларускія народныя песні, тт. I—III. Мінск, 1959—1962.

Слоўнікі

БРС	Беларуска-рускі слоўнік. Мінск, 1962.
Брукнер	A. Brückner. Słownik etymologiczny języka polskiego. Warszawa, 1957.
БСЭ	Большая Советская Энциклопедия, т. 40. М., изд. 2-е.
Бурнашоў	В. Бурнашев. Опыт терминологического словаря сельского хозяйства, фабричности, промыслов и быта народного, тт. I—II. СПб., 1844.
Бяльк.	І. Бялькевіч. Краёвы слоўнік усходняй Магілёўшчыны. Мінск, 1970.
Дабр.	В. Добровольский. Смоленский областной словарь. Смоленск, 1914.
Гарб.	Н. Горбачевский. Словарь древнего актового языка Северозападного края и Царства Польского. Вильна, 1874.
Гараеў	Н. Горяев. Сравнительный этимологический словарь русского языка. Тифлис, 1896.
Грынч.	Словарь української мови. Під ред. Грінченко, тт. I—IV. Київ, 1907—1909.
Даль	В. Даль. Толковый словарь живого великорусского языка, тт. I—IV. М., 1955.
ІСУЯ	Історичний словник українського язика. Под ред. проф. Е. Тимченко, т. I. Киев, 1930.
Касп.	М. Каспяровіч. Віцебскі краёвы слоўнік. Віцебск, 1927.
Карл.	J. Karłowicz, A. Kryński, D. Niedźwiedzki. Słownik języka polskiego, tt. 1—8. Warszawa, 1900—1927.
Кочын	Г. Кочин. Материалы для терминологического словаря древней России. М.—Л., 1937.
ЛП	Лексика Полесья (материалы для полесского диалектного словаря). М., 1968.

Махэк	V. Machek. Etymologicky slownik jazyka českého a slowenskégo. Praha, 1957.
Нас. АУ	И. Носович. Алфавитный указатель старинных белорусских слов, извлеченных из Актов, относящихся к истории Западной России, изданных в 1853 г. (цытуецца па фотакопіі рукапісу, якая захоўваецца ў сектары гісторыі беларускай мовы Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа АН БССР).
Нас. СБН	И. Носович. Словарь белорусского наречия. СПб., 1870.
Праабр.	А. Преображенский. Этимологический словарь русского языка, тт. I—II. М., 1959.
РБС	Русско-белорусский словарь. Минск, 1953.
Сразн.	И. Срезневский. Материалы для словаря древнерусского языка по письменным памятникам, тт. I—III. СПб., 1893—1912.
Фасм.	М. Фасмер. Этимологический словарь русского языка, тт. 1—2. М., 1964—1967.
Шанский	М. Шанский, В. Иванова, Т. Шанская. Краткий этимологический словарь русского языка. М., 1961.
Юрч. 1966	Г. Юрчанка. Дыялектны слоўнік. Мінск, 1966.
Юрч. 1969	Г. Юрчанка. Народная сінаніміка. Мінск, 1969.
Янк. 1966	Ф. Янкоўскі. Дыялектны слоўнік, в. I. Мінск, 1966.
Янк. 1968	Ф. Янкоўскі. Беларуская фразеалогія. Мінск, 1968.

Спіс населеных пунктаў, у якіх запісана лексіка, выкарыстаная ў кнізе

Амговічы Слуцкага р-на
Бабровічы Валожынскага р-на
Бягомль Докшыцкага р-на
В. Рожын Лунінецкага р-на
Горкі Слуцкага р-на
Лукі Карэліцкага р-на
Морач Клецкага р-на
Рэдкавічы Любанскага р-на
Таль Любанскага р-на
Хідра Пухавіцкага р-на
Чудзін Ганцавіцкага р-на
Шчыткавічы Старадарожскага р-на

ІНДЭКС

Антелокгъ 45
аркуш 163
аршинъ 11
бална 134
барил[а] 46
безменъ 109
белецъ 47
берестень 48
берковецъ 106
бохъ 142
бочка 48
брусъ 164
бунтъ 121
вантухъ 84
варъ 97
ведро 53
венокъ 130
вепръ 144
верста 28
весло 130
волока 34
воскъ 139
вязка 122
гарнецъ 54
глекъ 57
голова 154
головажня 155
гоны 31
горщокъ 56
гривна 104
груда 165
гуска 156
дежа 57
дякло 98
загонъ 32
закрой 39
захтикъ 178
золотникъ 105
кадь 58
калдубъ 59
камень 101
кантаръ 119
карапманъ 60
кварта 95
кетвиртайня 94
кипа 129
клубъ 137
ковшъ 61
колода 62
копа 173
корецъ 62
коробъ 64
коровай 153
косякъ 158
кошъ 65
краковка 50
крица 160
крокъ 20
крошня 66
кружокъ 166
кубелъ 67
кузня 68

куль 85
кусокъ 159
куфа 69
лантухъ 84
ланъ 41
лаштъ 99
либра 176
липечня 70
литра 111
локоть 8
лотъ 117
лубня 70
лукно 72
лыко I 21
лыко II 132
маца 89
медница 73
мера 87
мерка 87
мерникъ 87
метка 133
мехъ 86
миля 42
моргъ 40
мотокъ 138
носатка 74
ноша 123
око 117
осмина 93
ошитокъ 75
папуша 124
пара 170
пасма 172
перстъ 15
пипа 75
плетенка 131
плечо 153
плитка 157
повесмо 125
полоть 151
полуйца 90
поставъ 134
прутъ 24
пудъ 113
пудовня 113
пундель 115
пядь 17
рѣза 37
рѣзъ 176
решето 76
руно 141
ручка 77
сажень 13
сакъ 77
сало 139
свинья 161
сѣвня 78
секъ 145
сито 76
следъ 36
снопъ 126
солодъ 96
соломяникъ 79
солянка 50
сорокъ 167
соха I 38
соха II 171
стая 27
стопа 19
стрѣленье 26
стягъ 143
сувой 136
сыръ 140
тахерь 176
третинникъ 90
толпи 156
топорище 25
троска 132
труба 136
труска 80
тузинъ 176
туша 143
фаса I 83
фаса II 127
фунтъ 115
хлебъ 140
цаля 15
цеберъ 81

цетнаръ 118
ушатокъ 80
чаша 81
чверть I 91
чверть II 152
шанокъ 82
шматъ 147
шнуръ 22
шротъ 146
штаба 162
штука 148
шына 162

ЗМЕСТ

Уступ 3
Назвы адзінак вымярэння даўжыні і плошчы . 8
Словы са значэннем адзінак вымярэння даўжыні і плошчы антрапаметрычнага паходжання 8
Прылады вымярэння — адзінкі даўжыні і плошчы 21
Адзінкі вымярэння даўжыні (адлегласці), утварэнне якіх звязана з фізічнай магчымасцю чалавека пераадолець адлегласць 26
Адзінкі вымярэння даўжыні і плошчы, утварэнне якіх звязана з асаблівасцю апрацоўкі і падзелу зямлі 28
Прылады працы — адзінкі вымярэння . . 38
Запазычаныя адзінкі вымярэння даўжыні і плошчы 40
Назвы адзінак вымярэння сыпкіх і вадкіх рэчываў 45
Словы з першапачатковым значэннем 'пасудзіна', 'ёмістасць' 45
Слова *мера*, яго вытворныя і іншамоўны адпаведнік *маца* 87
Меры лічэбнікавага паходжання 90
Назвы адзінак вагі 101
Адзінкі вагі агульнаўсходнеславянскага (беларускага) паходжання 101
Запазычаныя адзінкі вагі 108
Адзінкі колькасці 120
Адзінкі колькасці з першапачатковым значэннем 'звязка', 'вязанка' 121
Адзінкі колькасці з першапачатковым значэннем 'нізка' 130

Адзінкі колькасці з першапачатковым значэннем 'скрутак' 134
Адзінкі колькасці з першапачатковым значэннем 'рэчыва' 139
Адзінкі колькасці з першапачатковым значэннем 'цэлае' ('туша') і 'частка цэлага' . . . 142
а) Адзінкі колькасці мяса 145
б) Адзінкі колькасці солі і цукру . . 154
в) Адзінкі колькасці тканіны 158
г) Адзінкі колькасці металу 160
д) Адзінкі колькасці розных тавараў . . 163
Адзінкі лічэння 167
Адзінкі лічэння нелічэбнікавага паходжання (назвы цэлых лікаў) 167
Запазычаныя адзінкі лічэння, якія ў мове-крыніцы мелі значэнне 'лічэбнік' 176
Крыніцы лексічнага матэрыялу 182
Слоўнікі 185
Спіс населеных пунктаў, у якіх запісана лексіка, выкарыстаная ў кнізе 186
Індэкс 187

На белорусском языке

Ким Владимирович Скурат

Давние белорусские меры (лексический анализ)

Издательство «Наука и техника»
Минск, Ленинский проспект, 68

Рэдактар Г. Ф. Юрчанка
Вокладка А. Ф. Карчагіна
Мастацкі рэдактар В. В. Саўчанка
Тэхнічны рэдактар А. М. Атлас
Карэктар М. А. Вячорка

Друкуецца па пастанове РВС АН БССР
АТ 10076. Здана ў набор 4.I-74 г. Падпісана да друку 13.III-74 г. Фармат 70×90¹/₃₂. Папера друк. № 2. Друк. арк. 6,0. Ум. друк. арк. 7,02. Уч.-выд. арк. 7,0. Выд. зак. 101. Друк. зак. 9. Тыраж 1000 экз. Цана 70 кап.

Друкарня імя Францыска (Георгія) Скарыны выдавецтва «Навука і тэхніка» АН БССР і Дзяржкамітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Мінск, Ленінскі праспект, 68.

70 к.